WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

8 ЛІПЕНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 131
(26739)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

УБОРКА ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР ПАЧАЛАСЯ Ў БЕЛАРУСІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора заслухаў даклады губернатараў Брэсцкай і Гомельскай абласцей, якія далажылі аб бягучай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў сваіх рэгіёнах і аб пачатку ўборкі ўраджаю збожжавых культур.

Было адзначана, што ў гэтым годзе ёсць усе перадумовы для збору добрага ўраджаю збожжавых і нарыхтоўкі кармоў у поўным аб'ёме. Кіраўнік дзяржавы паставіў задачу правесці ўборку ў максімальна сціслыя тэрміны. Важна, адзначыў Аляксандр Лукашэнка, каб да 20 ліпеня ўсе рэгіёны краіны поўнасцю ўключыліся ва ўборку ўраджаю. Прэзідэнт падкрэсліў, што, пачынаючы з гэтай даты, ён будзе асабіста інспектаваць ход уборачнай кампаніі ў абласцях. «Важна не ўпусціць момант і пачаць уборку адразу, як толькі гэта стане магчыма. Гэта абумоўлена ў першую чаргу ўмовамі надвор'я, якія не даюць магчымасці губляць час. Збожжа добрае, і яго трэба ўбраць своечасова і без страт», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама звярнуў увагу на неабходнасць стварэння максімальна камфортных умоў працы і быту для працаўнікоў вёскі, якія заняты ў полі на ўборцы.

Губернатар Брэсцкай вобласці Канстанцін Сумар далажыў кіраўніку дзяржавы аб тым, што да пачатку масавай уборкі збожжавых уся ўборачная тэхніка і зернесушыльныя комплексы сельгаспрадпрыемстваў Брэстчыны будуць поўнасцю гатовы. Пакуль вобласць толькі пачынае ўборачную кампанію. Як падкрэсліў кіраўнік рэгіёну, увесь сутачны намалот збожжа (а ён можа скласці ў вобласці да 70 тыс.т) будзе без затрымкі прапускацца праз зернесушыльныя комплексы, магутнасці якіх даюць магчымасць гэта рабіць.

Асобнай тэмай у размове было ўзнята пытанне аб культываванні ў рэгіёне кукурузы. Як адзначыў губернатар, у гэтым годзе рэгіён поўнасцю забяспечаны насеннем, атрыманым на кукурузакалібровачным заводзе ў Івацэвічах. Бягучы стан спраў на палях паказвае, што ўраджайнасць гэтага насення можа быць вышэйшая, чым таго, што раней закуплялася за мяжой, у прыватнасці ў Францыі.

Канстанцін Сумар таксама далажыў аб выкананні вобласцю прагнозных паказчыкаў і будаўніцтве сацыяльных аб'ектаў. Асабліва быў адзначаны прырост вытворчасці прамысловай прадукцыі, які па выніках паўгоддзя склаў 113,4 працэнта да аналагічнага перыяду мінулага года.

Губернатар Гомельскай вобласці далажыў Прэзідэнту аб ходзе ўборкі збожжавых культур і кармоў. Аграрыі Гомельшчыны ў гэтым годзе таксама чакаюць вялікі ўраджай кукурузы.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ДЗЯРЖКАНТРОЛЬ ПРАВЕРЫЦЬ УВЕСЬ БУЙНЫ ОПТ У КРАІНЕ

КАМІТЭТ дзяржаўнага кантролю правёў праверку некаторых суб'ектаў аптовага гандлю краіны, вынікі якой абмяркоўваліся на калегіі КДК. Улічваючы сітуацыю на аптовым рынку, Зянон Ломаць, старшыня КДК, даў каманду сваім падначаленым за трэці квартал гэтага года праверыць усе буйныя суб'екты гаспадарчай дзейнасці, што займаюцца аптовым гандлем, і ў верасні на калегіі падвесці вынікі і прыняць адпаведныя рашэнні.

Усяго ў нашай краіне на сёння налічваецца 11,3 тысячы арганізацый, што ажыццяўляюць аптовы гандаль, прычым 92,5 % — гэта прыватныя арганізацыі. Доля суб'ектаў камунальнай формы ўласнасці — 4,2 %, Белкаапсаюза — 1,8 %, Мінгандлю — 1,7 %, аб'яднанне «Белрэсурсы» — 1,1 %. Як паведаміў у сваім дакладзе **Уладзімір КАЛЕНІК, начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю спажывецкага рынку і сферы паслуг КДК,** за 2009 год аб'ём аптовага тавараабароту склаў 67,1 трыльёна рублёў, у тым ліку ўнутрырэспубліканскі абарот — 47,5. Аптовы тавараабарот спажывецкіх тавараў склаў 17 трыльёнаў рублёў (25 %), з іх айчынных тавараў — 5,8 трыльёна рублёў.

Прааналізаваўшы стан аптовага рынку краіны, Дзяржкантроль прыйшоў да высновы, што шэраг дзяржаўных прадпрыемстваў у гэтай галіне працуюць вельмі неэфектыўна.

— Дзяржаўны опт з моманту распаду СССР поўнасцю законсерваваў сябе і ў адсутнасць таварнага дэфіцыту не знайшоў для сябе адэкватнага прымянення ва ўмовах рынку, — лічыць Уладзімір Каленік. — Праграмай развіцця ўнутранага гандлю на 2006—2010 гады вызначана, што ў выніку буйныя аптовыя суб'екты рэспубліканскага маштабу павінны стаць стрыжнем усёй структуры аптовага гандлю і гарантаваць стратэгічную стабільнасць спажывецкага рынку ў цэлым.

СТАР. 2

ПРАКАВЕТНАЕ

КУПАЛЛЕ НА СВЯТЫМ ВОЗЕРЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як вядома, старажытны Лепель раскінуты абапал азёр Проша і Лепельскае і рэк Эса і Ула. Але па даўняй традыцыі жыхары Лепеля і суседняй вёскі Стаі ў купальскі вечар ідуць на бераг Святога возера. Адразу некалькі вогнішчаў, у тым ліку і на вадзе, асвятляюць гэтую адну з кароткіх летніх ночак. Песні, карагоды, вяночкі, выступленні самадзейных артыстаў, атракцыёны, смачныя буфеты (дарэчы, без алкаголю) былі даспадобы не толькі моладзі, але і старэйшым, для якіх Купалле — сапраўднае ўпрыгажэнне кульмінацыі летняй пары.

«Прамая лінія»

ШТО ЎВАХОДЗІЦЬ У ТЭХНІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ДОМА? ХТО ПАВІНЕН РАМАНТАВАЦЬ ДАХ? КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА, КАЛІ ЖЭУ НЕ РЭАГУЕ НА СКАРГІ?

На ўсе вашы пытанні па працы жыллёва-эксплуатацыйных управаленняў нашай краіны адкажуць спецыялісты Міністэрства ЖКГ: **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Эдмунд Іосіфавіч ГРЫШКЕВІЧ і начальнік упраўлення эканомікі Алена Іванаўна ДУДЗІНСКАЯ.**

12 ліпеня з 16.00 да 17.30 задавайце пытанні па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 8 (017) 287 18 29. Пытанні можна пакінуць і загадзя па тэлефоне 8 (017) 287 18 64.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПЕРШАЯ ТЫСЯЧА ТОН ЗБОЖЖА НОВАГА ЎРАДЖАЮ

намалочана на Гомельшчыне. Жніво пачалося ў палове раёнаў вобласці.

Пакуль што вядзецца выбарачны абмалот збожжа — камбайны накіроўваюцца на тыя ўчасткі, дзе вырошчваюцца культуры ранняга тэрміну выспявання. Сярэдняя ўраджайнасць на сёння 30,5 цэнтнера з гектара. Адначасова на палетках працягваецца ўборка рапсу, якога скошана прыкладна пятая частка. Лепшая ўраджайнасць гэтай каштоўнай алейнай культуры — 19,3 цэнтнера з гектара — сёлета ў Рагачоўскім раёне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ФАНТАН НАФТЫ «ЗАТКНУЛІ» АПЕРАТЫЎНА

Выпадковы аўтааматар, які ехаў пад вечар па дарозе паміж вёскамі Слабада і Раманаўка ў Мазырскім раёне, стаў сведкам нафтавага фантану, які біў з-пад зямлі.

Як расказалі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, на ўчастку трубаправода лінейнай вытворчай дыспетчарскай станцыі «Дружба» адбылася кароткачасовая разгерметызацыя тэхналагічнай адтуліны для выпуску паветра. Аварыю ліквідавалі на працягу трох гадзін супрацоўнікі прадпрыемства з прыцягненнем спецыялістаў аператыўных службаў і экалагаў. Па папярэдніх звестках, з трубы выйшла каля 400 л нафтапрадуктаў, якія аселі на невялікай плошчы ў так званым тэхналагічным калідоры. Зараз нафтаправод працуе ў штатным рэжыме. Забруджвання водных аб'ектаў не адбылося. Праводзяцца аналізы глебы для вызначэння ступені іх забруджвання.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, ШАГАЛ!

У Віцебску традыцыйна адсвяткавалі дзень нараджэння славутага сына Прыдзвінскага краю, вядомага на ўвесь свет мастака Марка Шагала. Бадай нават малыя дзеці ў горадзе на Заходняй Дзвіне ведаюць, хто такі дзядзька Шагал. Марк Шагал нарадзіўся ў 1887 годзе.

Як паведаміла «Звяздзе» **дырэктар віцебскага музея Марка Шагала Людміла ХМЯЛЬНІЦКАЯ,** адрозненне чарговага святкавання ад ранейшых у тым, што госці акцыі ўпершыню ўбачылі сучасны «цуд» мастацтва: лічбавыя рэпрадукцыі карцін на сапраўдным палатне. Такім чынам паказалі выставу твораў ізраільскай мастачкі Малкі Ценцыпер «Вясновыя мелодыі».

Вядомы паэт Давід Сімановіч, які жыве ў Віцебску, прэзентаваў сваю кнігу «Скрыпка Шагала, або Тут засталася яго душа». На падворку дома-музея Шагала на вуліцы Пакроўская адбылося тэатралізаванае дзейства «У гасцях у Марка і Бэлы». Дэгустацыя нацыянальных страў традыцыйнай яўрэйскай кухні, выступленні музычных нацыянальных калектываў — усё было на свяце.

Між іншым, у найбліжэйшым перспектыве задумана аднавіць на Пакроўскай дух шагалаўскіх часоў. Тут пастараюцца максімальна аднавіць выгляд вуліцы, каб зрабіць яе такой, якой яна была ў гады, калі тут жыў Майстра. Правядзенне шагалаўскай акцыі падтрымаў культурна-інфармацыйны цэнтр пры пасольстве Ізраіля ў Беларусі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«ПАЎДНЁВЫХ» ЦЯГНІКОЎ ПАБОЛЕЛА

У спіс праходзячых цягнікоў, на якія можна папярэдне набыць білеты, дабавілася яшчэ каля 20 саставаў. Такая дамоўленасць у рамках новага графіка руху пасажырскіх цягнікоў дасягнутая з чыгункамі Расіі, Украіны і Літвы, паведамі ў Міністэрстве транспарту і камунікацый.

Большасць з прадстаўленых саставаў — гэта «паўднёвыя» цягнікі, што курсіруюць у кірунку Адлера, Анапы, Сімферопаля, Адэсы і Еўпаторыі. Традыцыйна гэтыя маршруты карыстаюцца ў суайчыннікаў вялікім попытам. Чакаецца, што ўвосень да спіса далучацца цягнікі Львоў — Санкт-Пецярбург і Санкт-Пецярбург — Адэса.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЭКСКАВАТАРШЧЫК ПЕРАКВАЛІФІКАВАЎСЯ Ў ХІМІКА

26-гадовы машыніст экскаватара са Жлобіна ў вольны ад працы час нядрэнна асвоіў іншую спецыяльнасць. У нежылым доме ў вёсцы Побалава Рагачоўскага раёна ён стварыў прыватную хімічную лабараторыю.

У яе з Расіі «хімік» завёз абсталяванне, неабходныя кампаненты і прэкурсоры, і заняўся вырабам асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва jwh-018. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, грамадзяніна затрымалі ў Гомелі пры спробе прадаць больш за кілаграм самаробнага наркотыка, канцэнтрацыя дзейнага рэчыва ў якім складала 80 %. Цана гэтага наркотыка на чорным рынку — $7 тыс. за кілаграм. Між іншым, новы «Мендзялееў» быў гатовы вырабіць на заказ адразу да трох-чатырох кілаграмаў сінтэтычнай атруты.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ТРАГЕДЫЯ ПАД ІВАНКАМІ

З Камарынскай раённай бальніцы ўначы ў Брагінскі РАУС паведамілі, што сюды з дыягназам «агнястрэльнае раненне пахавай вобласці карцеччу» дастаўлены грамадзянін.

Падчас папярэдняй праверкі міліцыянерамі было ўстаноўлена, што гэтае агнястрэльнае раненне ён нанёс сам сабе па неасцярожнасці падчас незаконнага паляванне на сельскагаспадарчым полі КСУП «Саўгас «Камарынскі» паблізу вёскі Іванкі Брагінскага раёна. Стрэл адбыўся пры разраджэнні незарэгістраванай паляўнічай стрэльбы. Грамадзянін, не прыходзячы ў прытомнасць, сканаў у рэанімацыйным аддзяленні Брагінскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НУ І НУ!

«ЯГАДНІК» ПАГРАЖАЎ ІНСПЕКТАРУ НАЖОМ

Грамадзяніна, які збіраў чарніцы з выкарыстаннем забароненага сродку («грабянца»), заспелі за гэтым заняткам работнікі Глыбоцкай міжрайінспекцыі.

Пры затрыманні парушальнік спрабаваў уцячы з месца збору, адмаўляўся прайсці да аўтамабіля для разбору, спрабаваў ударыць начальніка міжрайінспекцыі, выказваў пагрозы нанясення цялесных пашкоджанняў, пагражаў нажом. Пасля чаго збег, але быў затрыманы выкліканым нарадам Глыбоцкага РАУС на шляху дадому. У дачыненні да затрыманага складзены адміністрацыйны пратакол за выкарыстанне забароненых сродкаў ці метадаў збору і нарыхтоўкі грыбоў, іншых дзікарослых раслін ці іх частак. Нож, што быў у грамадзяніна, канфіскаваны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТЕНДЕРА

Поставский районный исполнительный комитет

ПОВТОРНО ОБЪЯВЛЯЕТ ТЕНДЕР

на выполнение оценочных работ
по корректировке кадастровой оценки земель
города Поставы, городских поселков Воропаево и Лынтупы
Поставского района Витебской области.

Тендерные предложения принимаются в течение 10 календарных дней со дня опубликования настоящего извещения по адресу: 211875, Витебская обл., г. Поставы, пл. Ленина, 25.

УНП 300078600.

Контактные телефоны (8 02155) 43180, 41242, факс 41132.

Жыццялюбы

«ДЗЕЦІ НЕ ДАЮЦЬ МНЕ СТАРЭЦЬ ДУШОЙ»

Надзея ДРЫЛА

НЕКАЛІ, пакрыўдзіўшыся на сына ад першага шлюбу з-за таго, што ён на лецішчы мала дапамагаў, Аркадзь Новік, мастак па шкле з Барысава, злосна выпаліў: «Ды калі б я мог пачаць усё спачатку, то абавязкова дванаццаць дзяцей меў бы! Няхай бы яны былі рознымі — хлопчыкамі, дзяўчаткамі, касманаўтамі, калгаснікамі — сярод іх абавязкова знайшліся б ахвотнікі бацьку дапамагчы!..» І вось Аркадзю Патапавічу — 76. Ажаніўшыся другі раз, паспеў яшчэ двума памочнікамі абзавесціся — сыну Дзянісу цяпер 16 гадоў, дачцэ Крысціне — 10.

«Хто на танцулькі, а я па музеях»

— Як добра, што вы па-беларуску размаўляеце, — з такімі словамі сустрэў мяне ў сваёй барысаўскай кватэры спадар Новік. — Хачу, каб дзеці чулі родную мову. Праходзьце, калі ласка, пап'ем зараз з вамі гарбаты з мядком і гайда ў Навасады да пчолак-карміцелак.

Пакуль грэлася вада, Крысціна паставіла на стол талерку з мёдам, белы хлеб. А гаспадар дома моўчкі сеў за свой дзіва-апарат, які займае ледзь не палову кухні, уключыў газавую гарэлку і... На маіх вачах звычайныя шкляныя трубачкі пад уздзеяннем агню і пласкагубцаў ва ўмелых руках пачалі ператварацца ў «цвяток радзімы васілька».

— За сваё жыццё я столькі букетаў нарабіў, — усміхаецца шкляных спраў майстар. — Не толькі валошак, але і цюльпанаў, і насцурак, і рамонкаў...

Гаварыў і ў пацвярджэнне сваіх слоў вымаў рознакаляровыя шкляныя кветкі з кардоннага пачка. За імі на стале з'явіліся смешныя бегемоцікі з летуценнымі вочкамі-гузікамі, бусел з чырвонай дзюбай на адной назе, рознакаляровыя папугайчыкі і куркі-нясушкі...

— Аркадзь Патапавіч, падчас вырабу сваіх шкляных шэдэўраў вам даводзіцца дыхаць газам, што не надта карысна для здароўя. Чаму аддалі прыярытэт менавіта шклу?

— Яно само мяне выбрала *(усміхаецца)*. Колькі сябе памятаю, увесь час хацеў быць мастаком. Маляваць пачаў з 7 гадоў. Перад вайной да нас у Вялікія Літвінавічы, я родам з Палесся, прыехаў з сям'ёй у водпуск зямляк. Яго жонка цудоўна малявала і вучыла гэтаму сваіх дзяцей — Люду і Валодзю. Менавіта ў іх дома я ўпершыню і ўбачыў каляровыя алоўкі і акварэльныя фарбы. Пасля прыйшлі немцы. З іх прыходам скончылася і папера, і алоўкі, і фарбы. Але гэта нас не спыніла: працягвалі маляваць вуглямі на кардонках, на ўпаковачнай паперы ад боепрыпасаў, на сценах, веснічках, дошках, бярвёнах. Прайшоў час. Пасля вызвалення вёскі ад фашыстаў з арміі дэмабілізаваўся бацька маіх сяброў. І амаль адразу ж разам з сям'ёй з'ехаў на Далёкі Усход. Не ведаю, сталі сябры дзяцінства мастакамі ці не, але я дагэтуль удзячны, што яны са сваёй маці далі мне штуршок да малявання.

СТАР. 4

Мікалай ФЯСЬКОЎ:

Прыёмная кампанія-2010

«ЗРУЧНАСЦЬ ТЭСТАВАЙ ФОРМЫ ЭКЗАМЕНАЎ ПРЫЦЯГВАЕ ШМАТ ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ...»

173,5 тысячы абітурыентаў, якія прайшлі рэгістрацыю на ЦТ, 84 стабальныя вынікі, 581 нулявы вынік, 55 выдаленых з аўдыторый — вось толькі некаторыя лічбы, якія характарызуюць цэнтралізаванае тэсціраванне, якое днямі завяршылася ў Беларусі.

У адрозненне ад Расіі, дзе правядзенне адзінага дзяржаўнага экзамену штогод суправаджаюць гучныя скандалы, звязаныя з махлярствам (не стаў выключэннем і гэты год), у нашай краіне на хвалі інтарэсу аказваюцца, як правіла, зусім іншыя пытанні. Напрыклад, многіх хвалююць дастаткова нізкія балы ўдзельнікаў тэсціравання па матэматыцы і фізіцы. Нагадаем, што сярэдні бал удзельнікаў ЦТ па матэматыцы склаў сёлета 21,76, а па фізіцы — 18,1 бала. 20 балаў і менш атрымалі 72,96 працэнта ўдзельнікаў ЦТ па фізіцы, а па матэматыцы на 20 балаў і ніжэй напісалі тэставую работу 62,45 працэнта абітурыентаў. Максімальная колькасць нулявых вынікаў таксама зарэгістравана на гэтых дысцыплінах: 450 нулявых вынікаў па матэматыцы і 104 — па фізіцы. З аднаго боку, тыя, хто аказаўся ў ніжняй частцы 100-бальнай тэставай шкалы, могуць цешыць сябе думкай, што такіх як яны — большасць. Але з іншага боку, самалюбства ўладальнікаў школьных «васьмёрак» і «дзявятак» пры гэтым моцна церпіць. У такім выпадку некаторыя спрабуюць абвінаваціць тэсты ў празмернай складанасці, другія лаяць усю сістэму цэнтралізаванага тэсціравання, трэція — падазраюць арганізатараў у тэхнічных збоях пры праверцы работ удзельнікаў ЦТ. Напрыклад, у Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў паступіла скарга ад абітурыента, у якога ў школьным атэстаце была «васьмёрка» па матэматыцы, але на тэсціраванні ён здолеў набраць толькі 11 балаў па стабальнай шкале.

— Мы паднялі работу гэтага маладога чалавека, не паленаваліся зазірнуць і ў яго чарнавікі, і пераканаліся, што абітурыент выканаў толькі 5 заданняў з 18 часткі А — там, дзе прапануюцца варыянты адказаў, — паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ.** — А за частку В ён і ўвогуле не браўся. Але паколькі заданні, з якім ён справіўся, былі дастаткова лёгкімі, то і «вага» іх была зусім невялікая. Як вядома, каэфіцыент складанасці любога задання залежыць ад колькасці абітурыентаў, якія далі правільны адказ. Дарэчы, чарнавікі часта служаць для нас дадатковай крыніцай інфармацыі, з якой мы можам скласці ўражанне пра чалавека, які прыходзіў да нас на тэсціраванне.

СТАР. 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

DIE WELT: НА СЕЛІГЕРЫ ШЛІФУЕЦЦА МОЛАДЗЕВЫ БАЯВЫ РЭЗЕРВ КРАМЛЯ ДА ВЫБАРАЎ-2011

На возеры Селігер за 250 км ад Масквы, дзе праходзіць чарговы форум пракрамлёўскай моладзі, ствараюцца новыя маладыя кадры, якія закліканы стаць першакласнымі выканаўцамі заданняў зверху на кіраўнічым узроўні, піша нямецкая газета Die Welt.

Арганізацыя «Нашы», якая з'яўляецца арганізатарам летняга лагера, спрабуе стварыць сабе рэпутацыю незаменнай апоры для Крамля. Створаныя імі ў свой час атрады, гатовыя ўдзельнічаць у вулічных сутыкненнях, цяпер нярэдка выкарыстоўваюцца, каб замінаць мітынгам апазіцыянераў, калі ў іх атрымліваецца дамагчыся дазволу на іх ад уладаў, піша аўтар артыкула.

«У больш доўгатэрміновай перспектыве «Нашы» застануцца баявым рэзервам на выпадак узнікнення канфліктных сітуацый перад парламенцкімі выбарамі ў снежні 2011 года і прэзідэнцкімі выбарамі ў сакавіку 2012 года, а таксама пастаўшчыком галасоў для партыі «Адзіная Расія» на чале з прэм'ер-міністрам Уладзімірам Пуціным», — мяркуе выданне.

УКРАІНА ПРАДСТАВІЛА ЕС І РАСІІ АЛЬТЭРНАТЫВУ «ПАЎДНЁВАМУ СТРУМЕНЮ»

Урад Украіны прадставіў Расіі і Еўрасаюзу праект, які можа стаць альтэрнатывай газаправоду «Паўднёвы струмень». Пра гэта піша ўкраінская газета «Справа» са спасылкай на прапанову, накіраваную бакам міністрам паліва і энергетыкі Украіны Юрыем Бойкам.

Паводле праекта, два ўкраінскія газаправоды — «Саюз» і «Ананьеў-Ізмаіл», мяркуецца працягнуць да Турцыі і затым злучыць з газатранспартнай сістэмай ЕС. Рэалізаваць праект могуць Украіна, Расія і ЕС на парытэтных пачатках.

Як лічаць украінскія ўлады, дзякуючы новаму газаправоду Расія можа адмовіцца ад будаўніцтва «Паўднёвага струменя» па дне Чорнага мора на Балканы. Акрамя таго, як піша газета, за перадачу расійскаму боку долі ў сваіх газаправодах Украіна разлічвае атрымаць адно з газавых радовішчаў у Расіі, як мяркуецца, адзін з участкаў у Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе.

Нагадаем, асноўная мэта будаўніцтва «Паўднёвага струменя» — забяспечыць пастаўкі расійскага газу ў Еўропу без удзелу пасрэднікаў, у тым ліку Украіны, праз якую транзітам у ЕС ідзе 80 % газавага экспарту з Расіі.

У ЛАГЕРЫ НА КУБАНІ МАСКОЎСКІХ ДЗЯЦЕЙ З ВЫХАВАЛЬНІКАМ ПАНЕСЛА Ў МОРА: 6 ЗАГІНУЛЫХ

Надзвычайнае здарэнне здарылася 7 ліпеня ў дзіцячым лагеры «Азоў» у Краснадарскім краі: падчас купання на Ейскай касе групу дзяцей з Масквы панесла плынню ў Азоўскае мора.

Па апошніх удакладненых звестках МНС, знойдзены целы 5 дзяцей і выхавальніка, які кінуўся ім на дапамогу. Дваіх дзяцей атрымалася выратаваць, яшчэ адну дзяўчынку шукаюць. Вядома, што загінулыя і зніклыя пры купанні на Ейскай касе дзеці — вучні маскоўскай школы № 1065, адна з выхавальніц — таксама масквічка. Паводле папярэдніх звестак, чыннікам здарэння сталі моцныя падводныя плыні.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 8.07.2010 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	3 014,00	1 чэшская крона	148,60
▼ 1 еўра	3 788,30	1 польскі злоты	920,12
1 латвійскі лат	5 350,61	▲ 1 расійскі рубель	96,94
1 літоўскі літ	1 098,60	1 украінская грыўня	381,28

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

USD	31,0922
10 UAH	39,3224
1000 BYR	10,3125
EUR	39,1326

Агенцтва Уладзіміра Грайцова

ДЗЯРЖКАНТРОЛЬ ПРАВЕРЫЦЬ УВЕСЬ БУЙНЫ ОПТ У КРАІНЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А нашы кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы паказалі, што рэспубліканскі опт, маючы на старце яўныя перавагі, матэрыяльна-тэхнічную базу (абсталяванне, транспарт, атрыманыя на баланс бязвыплатна), кадравы патэнцыял, саступіў прыярытэтныя пазіцыі створаным на пустым месцы прыватным арганізацыям аптовага гандлю.

У падмацаванне гэтых слоў былі прыведзеныя некалькі фактаў, калі дзяржаўныя аптовыя арганізацыі ад непасрэднай сваёй гандлёвай дзейнасці церпяць страты, а прыбытак атрымліваюць ад здачы ў арэнду складскіх плошчаў. Так, напрыклад, РУГП «Белімпартгандаль» у 2009 годзе з 66 тысяч квадратных метраў сваіх плошчаў 23 % здавала ў арэнду, 46 % працэнтаў плошчаў выкарыстоўвала для аказання паслуг па захоўванні чужых тавараў. У выніку тавараабарот па асноўным прызначэнні гэтага прадпрыемства быў атрыманы ад продажу 400 халадзільнікаў, 88 газавых плітаў і вагона цукру-пяску за ўвесь 2009 год, а астатняя выручка (84 %) сфарміраваная якраз за кошт здачы плошчаў у арэнду і аказання паслуг па захоўванні тавараў.

— За кошт чаго жывуць дзяржаўныя аптовыя базы? За кошт здачы памяшканняў у арэнду, і за гэта маюць прыбытак, а што датычыцца непасрэдна сваіх прамых абавязкаў, — то церпяць страты. У нас ёсць Мінгандаль, Мінэканомікі, Саўмін, спецыяльныя ўпраўленні, якія займаюцца гандлем. Узнікае пытанне: а чым займаюцца дзяржструктуры? — спытаў Зянон Ломаць, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю.

Разам з тым праясніць сітуацыю наконт такой не вельмі добрай сітуацыі з дзяржаўнымі аптовымі базамі паспрабаваў **Уладзімір КАЛТОВІЧ, першы намеснік міністра гандлю:**

— Калі праца прыватных аптовых структур накіраваная перш за ўсё на атрыманне прыбытку, то праца дзяржаўных, я іх так умоўна назаву, — перш за ўсё на гарантаванае забеспячэнне сацыяльна значнымі таварамі. Акрамя таго, нашы аптовыя арганізацыі, падпарадкаваныя Мінгандлю і з доляй дзяржаўнай уласнасці, штогод ствараюць стабілізацыйныя фонды мяса, сыру, тварагу, плодаагародніннай прадукцыі, сезонныя назапашванні кандытарскіх вырабаў, шампанскіх вінаў, цукру, солі і іншых тавараў. Для забеспячэння сезоннага гандлю нашы прадпрыемствы вымушаныя назапашваць да 60 % аб'ёму гэтых тавараў. А ніводная прыватная арганізацыя, напрыклад, якая прадае садавіну, не займаецца назапашваннем бульбы, агародніны, не стварае стабілізацыйныя фонды. Сакрэт вельмі просты — няма выгады, — сказаў Уладзімір Калтовіч і дадаў, што каб трохі выправіць сітуацыю з рэнтабельнасцю працы дзяржаўных аптовых баз, у Саўмін былі накіраваныя прапановы аб адмене лімітнай рэнтабельнасці, аб адмене парадку ўсталявання закупачных цэнаў.

Пры гэтым першы намеснік міністра гандлю прызнаў, што пры адсутнасці ліцэнзавання на аптовы гандаль Міністэрства гандлю не мае ўплыву на прыватныя структуры, якія цяпер дамінуюць на аптовым рынку краіны. Дарэчы, што датычыцца прыватных аптовых гандлёвых прадпрыемстваў, то да іх у Дзяржканторлю свае прэтэнзіі. Як сказаў Уладзімір Каленік, было праверана 20 прыватных структур і ва ўсіх былі знойдзеныя парушэнні заканадаўства: санітарных нормаў, правілаў гандлю, метралагічных правілаў, заканадаўства аб цэнаўтварэнні, вядзенні статыстыкі і бухгалтарскага ўліку. Таксама Дзяржканторль выявіў факты, калі гандлёвыя прадпрыемствы, што ажыццяўляюць і аптовы, і рознічны гандаль, спаганялі з пастаўшчыкоў грошы за рэкламныя і надуманыя інфармацыйныя паслугі, хоць гэта і забаронена пастановай Мінгандлю ад 20 чэрвеня 2008 года № 24.

— Ёсць адпаведная пастанова, дзе напісана, што пры ажыццяўленні «рознічнага гандлю выкладка тавараў, а таксама іншыя аперацыі ў рамках гандлёва-тэхналагічнага працэсу не могуць разглядацца ў якасці паслугі пастаўшчыкам тавараў і (або) трэцім асобам». Рашэнне ёсць, пастанова ёсць, але яна скрозь і ўсюды не выконваецца. Не буду называць фірму, але за апошні год такіх паслуг яна аказала на 8,2 мільярда рублёў. А хто плаціць за гэта? Пакупнік! — сказаў Зянон Ломаць.

Зянон Кузьміч выказаў таксама сваё абурэнне тым, што прыватныя аптовыя арганізацыі слаба працуюць з прадукцыяй айчыннай вытворчасці і вельмі шмат імпартуюць, чым павялічваюць адмоўнае знешнегандлёвае сальда краіны.

— Тыя 132 мільярды рублёў, якія адна з прыватных структур выдаткавала на набыццё валюты для аплаты за імпартную прадукцыю, зарабілялі МАЗ, БелАЗ, калійны камбінат, — сказаў Зянон Ломаць. — Сальда знешняга гандлю сёння дасягнула межаў, калі пад пагрозу пастаўлена эканамічная бяспека дзяржавы. Мы для таго і пастаўленыя, каб за гэтым назіраць і калі трэба — прымаць меры.

Такім чынам, старшыня Дзяржканторлю даў даручэнне арганізаваць маштабную праверку аптовых гандлёвых арганізацый і пры гэтым вельмі жорстка рэагаваць на выяўленыя парушэнні.

На гэтай жа калегіі КДК было разгледжана пытанне наконт вынікаў праверкі канцэрна «Белдзяржхарчпрам». Праверка дзейнасці прадпрыемстваў гэтага канцэрну паказала, што ў 2009 годзе «Белдзяржхарчпрам» не забяспечыў выкананне 5 з 15 паказчыкаў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, а за перыяд з 2008 года па першы квартал 2010 года з 58 даручэнняў кіраўніка дзяржавы канцэрн не выканаў 21, а 9 з іх не выкананыя ў поўным аб'ёме. КДК мае прэтэнзіі таксама да кандытарскай, лікёра-гарэлачнай і піўной галінаў канцэрна, дзе вельмі слаба ідзе праца па імпартазамяшчэнні і экспарце сваёй прадукцыі.

Павел БЕРАСНЕЎ.

БУДЗЕ ЧАС — БУДЗЕ І КВАС... І СЫР, І МАЛАКО

Пасол Чэхіі Йіржы Карас аддае перавагу беларускаму малаку і перакананы, што нашаму квасу — месца на еўрапейскім рынку, гэтак жа, як і сырам, а нам няблага прыгледзецца да чэшскага піва, віна, кансерваў, прыпраў і соусаў

Адносіны Беларусі з заходнеславянскімі сяброўкамі надзвычай актыўнымі не назавеш. На ўзроўні пасла Чэхія прадстаўленая ў нашай краіне ўсяго толькі год. Аднак імпэт, з якім **кіраўнік дыпмісіі Йіржы КАРАС** кажа пра перспектывы двухбаковых адносінаў, захапляе: «Я вам абяцаю, чэхі будуць усюды — і ў эканоміцы, і ў культурнай сферы». Дарэчы, міжкультурныя стасункі дыпламат лічыць найважнейшымі, бо менавіта яны дазваляюць народам лепш пазнаць адзін аднаго, зблізіцца. І найбольш паспяховымі на гэтай ніве сталіся сувязі паміж майстрамі пэндзля — на ўзроўні музеяў і акадэмій мастацтва. Беларускія студэнты, напрыклад, змогуць павучыцца ў Празе. Асаблівы інтарэс — да падрыхтоўкі рэстаўратараў.

— Мяркую, што ў нас адны з самых лепшых у свеце атэлье па рэстаўраванні, а ў Беларусі якраз недахоп спецыялістаў у гэтай галіне, — адзначае пасол.

Натхніць на ўзаемадзеянне і іншых творцаў дзвюх славянскіх дзяржаў, натуральна, дапаможа дамова аб культурным супрацоўніцтве. Работа над гэтым дакументам, паводле слоў спадара Караса, ужо вядзецца.

Ажыццяўляецца і палітычны дыялог. Увосень, напрыклад, у Празе чакаюць кіраўніка нашага знешнепалітычнага ведамства Сяргея Мартынава. Запрашэнне ён ужо атрымаў. Дарэчы, з прыходам да ўлады новага чэшскага ўрада, на думку пасла, кардынальных зменаў у стаўленні да Беларусі не адбудзецца:

— Думаю, мы будзем працягваць рухацца ў абраным кірунку. Тым больш што ў нас застаецца ранейшы міністр замежных спраў Карэл Шварцэнберг. Таму наўрад ці многае зменіцца. Наша зацікаўленасць у добрых адносінах з Беларуссю застаецца.

Дыпламат не ўтрымаўся, каб не заўважыць, што ў Чэхіі «ёсць сваё ўяўленне пра тое, якім павінна быць развіццё Беларусі», аднак адразу ж запэўніў: «у вашы ўнутраныя справы мы ўмешвацца не можам і не будзем».

І хоць эканамічнае ўзаемадзеянне дзвюх славянскіх краін — яшчэ амаль неўзараная ціліна, глеба тут спрыяльная.

— Некаторыя вашы малочныя прадукты карысталіся б вялікім попытам у нас, — лічыць пасол Чэхіі ў Беларусі. — Перакананы, што гэта прадукцыя адпавядае нормам ЕС.

Асабліва паспяховую будучыню ён прадракае сырам, якія вырабляюцца ў нашай краіне. А вось пастаўкі беларускага малака ў Чэхію ўяўляюцца дыпламату праблематычнымі:

— У нас ёсць шмат вытворцаў малочнай прадукцыі, і калі мы пачнём вазіць ваша малако, нашы сельскагаспадарчыя працаўнікі пачнуць пратэставаць ды і працаўнікі іншых краін ЕС таксама.

Аднак горкую пілюлю спадар Карас дыпламатычна падсаладзіў:

— Шчыра скажу, што **беларускае малако мне падабаецца больш, чым чэшскае.** Ведаю, што дрэнна, калі так кажа чэшскі пасол, аднак, на жаль, гэта так. У вас добрае, чыстае малако!

Так і карціць сказаць, павярнуўшыся да ўсходу: ну і хто там яшчэ нос адварочваў ад нашага малака?!

Малако, між іншым, — не адзіны ўпадабаны чэшскім паслом беларускі напой. Пасля яго камплімэнтаў у адрас нашага квасу ўвогуле застаецца толькі горда расправіць плечы.

— Не разумею, чаму ў нас, напрыклад, нельга купіць ваш квас, — абураецца заходні дыпламат. — Ведаю, што гэта была б канкурэнцыя для кока-колы і некаторых іншых напояў. Не хачу нікога пакрыўдзіць, аднак перакананы, што гэты напой (беларускі квас. — **Аўт.**) быў бы больш здаровым.

Ну, як кажуць, будзе час — будзе і квас, не ўсё за раз... У чэхаў таксама ёсць што прапанаваць Беларусі: «Натуральна, гэта не толькі піва і віно, але і разнастайная кансерваваная прадукцыя, прыправы, соусы». Увогуле кіраўнік дыпмісіі высока ацэньвае патэнцыял узаемнага гандлю харчовай прадукцыяй. «Нам ёсць да чаго імкнуцца ў гэтых адносінах». Пасол спадзяецца, што налета нам ужо будзе што абмеркаваць у гэтым кірунку — канкрэтныя зрухі. Пакуль жа з чэшскай прадукцыяй у беларускіх пакупнікоў таксама напружанасць. Пасла ў Беларусі «непрыемна здзіўляе», што пры скупым выбары чэшскага піва яно вельмі дарагое. Прыкмячае ён і хібы з віном:

— Пакольскі я сам родам з Маравіі, то аддаю перавагу добраму віну. Шкада, што ў Беларусі няма мараўскіх вінаў.

Дыпламат бачыць у вінна-піўным недаглядзе «віну беларускага боку», аднак абнадзейвае: «мы паспрабуем гэты бар'ер пераадолець». Пэўныя спадзяванні ёсць у яго і наконт Мытнага саюза.

— Пабачым, што будзе. Нам гэта вельмі цікава.

Чэшскі бок спадзяецца, што прадукцыі будзе лягчэй трапляць на рынкі Казахстана і Расіі,ды і на тавараабмене з нашай краінай гэта адмоўна не адаб'ецца:

— Нам не хацелася б, каб тавараразварот з Беларуссю, які добра развіваецца, спыніўся.

Чэшскія прадпрымальнікі праяўляюць цікавасць да Беларусі, і ўзаемны тавараварот, паводле вызначэння Й. Караса, сёлета якраз атрымаў новае дыханне. Вось бы яшчэ і ў палітычных адносінах другое дыханне адкрылася. Застаецца спадзявацца, што будзе час — будзе і... усё астатняе!

Ала МАЧАЛАВА.

Школа падаткаплацельшчыка

НЕКАЛЬКІ КВАТЭР, ДАМОЎ ЦІ ГАРАЖОЎ...

Сёлета ў нашай краіне карэктуецца алгарытм вылічэння зямельнага падатку, удасканальваюцца механізмы спагнання падаткаў на нерухомасць. Сёння чарговую кансультацыю на гэтую тэму даюць спецыялісты галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асобаў Міністэрства па падатках і зборах.

Год таму я набыла другую кватэру за апошнія 5 гадоў. Аб падатку на нерухомасць пачула зусім нядаўна. Цяпер мне яго налічаць з улікам прапушчанага года? Цікава, у якім памеры?

— З моманту набыцця другой кватэры вы з'яўляецеся плацельшчыкам падатку на нерухомасць па адной з гэтых кватэр па вашым выбары. Напрыклад, калі кватэру купілі ў маі, тады з чэрвеня вы сталі плацельшчыкам гэтага падатку. Выплата падатку ажыццяўляецца па стаўцы 0,1 працэнта ад ацэначнага кошту выбранай вамі кватэры. Для вылічэння падатку на нерухомасць да ўвагі прымаецца ацэначны кошт, які вызначаецца ўпаўнаважаным органам па стане на 1 студзеня года, за які ажыццяўляецца плата падатку.

Ці існуюць нейкія льготы па падатках, калі ў мяне ёсць дзве кватэры ў Мінску і Стоўбцах, аднак я студэнт ВНУ дзённага аддзялення?

— У гэтым выпадку вы з'яўляецеся плацельшчыкам падатку на нерухомасць. Ва ўласнасці ў вас дзве ці больш кватэр. Ільгота па падатку на нерухомасць даецца па адной з іх па вашым выбары на падставе заявы, якая накіроўваецца ў падатковы орган па месцы жыхарства.

Пенсіянер па ўзросце пастаянна жыве адзін у сваёй кватэры ў Полацку. Часова, з красавіка па лістапад, ён жыве ва ўласным жылым доме, які знаходзіцца таксама ў Полацку. Ці неабходна яму плаціць падатак на нерухомасць?

— Нягледзячы на тое, што жылы дом знаходзіцца ў населеным пункце па месцы пастаяннага пражывання пенсіянера, у адносінах да гэтага аб'екта ён не з'яўляецца плацельшчыкам падатку на нерухомасць, бо з ім не жывуць працаздольныя асобы. Акрамя гэтага, ён не з'яўляецца плацельшчыкам падатку на нерухомасць і ў дачыненні да кватэры, нягледзячы на тое, што кватэра часова не выкарыстоўваецца ім для жыцця ў перыяд з красавіка па лістапад.

Інвалід другой групы пастаянна жыве адзін ва ўласнай кватэры ў Гомелі. Гэтаму чалавеку па праве ўласнасці належыць яшчэ і жылы дом у Дзяржынску. Ён з'яўляецца плацельшчыкам падатку на нерухомасць?

— У гэтай сітуацыі фізічная асоба не павінна плаціць падатак на нерухомасць ні за кватэру, ні за жылы дом.

Пенсіянер па ўзросце пастаянна жыве ва ўласным жылым доме (№ 1) у Вілейцы, дзе сумесна з ім жыве яго працаздольны сын. Акрамя гэтага, пенсіянеру па праве ўласнасці належыць яшчэ адзін жылы дом (№ 2), які знаходзіцца таксама ў Вілейцы. Якія маёмасныя падаткі трэба плаціць?

— У гэтым выпадку пенсіянер з'яўляецца плацельшчыкам падатку па двух аб'ектах нерухомасці: па жылым доме № 1, бо з пенсіянерам сумесна жыве працаздольны сын; па жылым доме № 2, бо гэты дом размешчаны ў населеным пункце па месцы пастаяннага пражывання гэтага пенсіянера, і з ім сумесна жыве працаздольны сын.

Маю ва ўласнасці ў сталіцы два гаражы, з'яўляюся пенсіянеркай па ўзросце. Ці трэба мне плаціць падаткі за зямлю і нерухомасць?

— Вы маеце льготу па падатку на нерухомасць у дачыненні да двух гаражоў і зямельнаму падатку, бо вы пенсіянерка па ўзросце.

Я на 2010 год заключыў дагавор арэнды з арганізацыяй і здаў ёй у арэнду гараж. Ці трэба мне плаціць за гэтую нерухомасць маёмасны падатак?

— У гэтым выпадку плацельшчыкам падатку на нерухомасць у дачыненні да гаража прызнаецца арганізацыя-арандатар, пачынаючы з месяца, які ідзе за месяцам, у якім гараж быў перададзены ў арэнду.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

ЛЯСЫ — ПАД ВІДЭАНАЗІРАННЕ АД ПАЖАРАЎ

Зараз у папярэджанні і тушэнні пажараў у лясах Мінлясгаса задзейнічаная ўся Дзяржаўная лясная ахова. Агульная колькасць службы — больш за 14 тысяч чалавек.

Для тушэння пажараў у лясгасах створана 238 пажарна-хімічных станцый. У распараджэнні Дзяржаўнай лясной аховы 470 пажарных аўтамашын, 931 мотапомпа. Па ўсёй тэрыторыі ляснога фонду ўстаноўленыя больш за 480 пажарна-назіральных вышак і 66 пажарна-назіральных мачтаў. Амаль у 30 лясгасах пачалі ўкараняць сістэму відэаназірання за лесам.

Усяго з пачатку года, як паведамілі ў Мінлясгасе, на тэрыторыі лясного фонду адбылося 230 лясных пажараў на агульнай плошчы 109,9 гектара. Найбольшая колькасць узгараняў зафіксаваная ў Гомельскай (86), Брэсцкай (54) і Магілёўскай абласцях (40). У сталічным рэгіёне было адзначана 17 выпадкаў лясных пажараў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

«ЗРУЧНАСЦЬ ТЭСТАВАЙ ФОРМЫ ЭКЗАМЕНАЎ ПРЫЦЯГВАЕ ШМАТ ВЫПАДКОВЫХ ЛЮДЗЕЙ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Дастаткова вялікая колькасць выпадковых людзей на тэсціраванні з'яўляецца вынікам даступнасці і зручнасці здачы экзаменаў у тэставай форме, калі абітурыент пазбаўлены асабістага кантакту з экзаменатарамі.

Калі нам здаюць абсалютна чысты бланк адказаў і на чарнавіку не назіраецца «слядоў» інтэлектуальнай работы, значыць, гэта быў выпадковы чалавек, які напэўна, спадзяваўся на цуд, або здаўся пад націскам бацькоў, прыйшоўшы на экзамен, тым не менш і яго вынік уплывае на агульную статыстыку. Увогуле мы заўважылі, што прыкладна 20 працэнтаў маладых людзей пакідаюць экзаменацыйныя аўдыторыі на працягу першых 30 хвілін. І якія ў іх могуць быць балы? Я ні ў якім разе не хачу кідаць камень у бок школы, маўляў, як вы дзяцей рыхтуеце, так яны тэсты і здаюць. Аднак і мы вымушаны абараняцца, калі нас спрабуюць абвінаваціць у тым, што справіцца з тэстамі школьніку без дапамогі рэпетытараў немагчыма. Напрыклад, на тэсце па фізіцы было прапанавана заданне першага ўзроўню складанасці наступнага зместу: «Назавіце адзінку электрычнага напружання ў міжнароднай сістэме СІ» з варыянтамі адказаў: ампер, ом, вольт, ньютон і джоуль. 68,28 працэнта абітурыентаў далі правільны адказ. Але 31,72 працэнта не ведаюць, што электрычнае напружанне вымяраецца ў вольтах. Няўжо яны ніколі не бачылі, што напісана на разетках? Пры гэтым фізіка і матэматыка з'яўляюцца, як правіла, профільнымі дысцыплінамі пры паступленні на тэхнічныя і прыродазнаўча-матэматычныя спецыяльнасці.

Мікалай Фяськоў выказаў меркаванне, што дастаткова вялікая колькасць выпадковых людзей на тэсціраванні з'яўляецца вынікам даступнасці і зручнасці здачы экзаменаў у тэставай форме, калі абітурыент пазбаўлены асабістага кантакту з экзаменатарамі. Адна рэч — паставіць на ўдачу адказы ў тэстах, і зусім іншая — знясловіць сябе перад экзаменацыйнай камісіяй. Калі яшчэ 20 гадоў таму на вышэйшую адукацыю адважваліся замахнуцца толькі 20—30 працэнтаў выпускнікоў агульнаадукацыйных школ, то цяпер усе масава ідуць удзельнічаць у тэсціраванні. У 2009 годзе, напрыклад, удзел у ЦТ узялі 92 працэнты выпускнікоў школ. Сёлета іх колькасць, праўда, зменшылася да 82 працэнтаў. Аднак агульная колькасць абітурыентаў істотна не мяняецца ў Беларусі чатыры апошнія гады. Да выпускнікоў бягучага года далучаюцца выпускнікі папярэдніх гадоў, выпускнікі прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, а таксама прэтэндэнты на атрыманне другой вышэйшай адукацыі. Такім чынам, чакаць змяншэння агульнага конкурсу сёлета не варта нават з улікам змяншэння выпуску з 11-х класаў.

На думку Мікалая Фяськова, падрыхтаваць стабальніка — неактуальная задача ў дачыненні да цэнтралізаванага тэсціравання, паколькі галоўным з'яўляецца не абсалютны вынік, а перавага ў параўнанні з іншымі абітурыентамі. Балы на ЦТ не могуць дубляваць школьную адзнаку. Балы — гэта рэйтынгавае месца канкрэтнага чалавека ў агульным патоку абітурыентаў. Аднак наяўнасць стабальных вынікаў пацвярджае, што нерашальных заданняў на ЦТ няма і з усімі заданнямі можна справіцца за адведзены час. Немалаважна і тое, што «геаграфія» стабальных вынікаў ахоплівае ўсю краіну. Дарэчы, два юнакі, якія могуць пахваліцца сёлета двума стабальнымі сертыфікатамі (па матэматыцы і фізіцы) з'яўляюцца выхаванцамі Ліцэя БДУ. Дзелавая рэпутацыя гэтай навучальнай установы — самая высокая. Яшчэ адзін уладальнік двух стабальных сертыфікатаў — выпускнік мінскай гімназіі. Выпускнікі гімназій і ліцэяў, як правіла, дэманструюць на ЦТ больш высокія вынікі, і гэта для арганізатараў тэсціравання не з'яўляецца нечаканасцю.

Станоўчай тэндэнцыяй, па меркаванні Мікалая Фяськова, з'яўляецца і тая акалічнасць, што сума балаў у выпускнікоў гарадскіх і сельскіх навучальных устаноў практычна зраўнялася, таму на многіх спецыяльнасцях ужо не праводзіцца асобны конкурс для гарадскіх і сельскіх выпускнікоў. А па шэрагу прадметаў, такіх, як геаграфія, гісторыя, беларуская і іспанская мовы, сельскія выпускнікі звычайна паказваюць нават лепшыя вынікі, чым гараджане. І гэта пры тым, што ў вёсцы практычна няма рэпетытарства...

Напрыканцы Мікалай Фяськоў з сумам канстатаваў, што кожны год у патоку абітурыентаў былі маладыя людзі, якія пакідалі ў бланках адказаў на ЦТ нецэнзурныя словы. Але цярпенне, нарэшце, лопнула, таму Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў вырашыў прыцягнуць гэтых «абітурыентаў» да адміністрацыйнай адказнасці.

— Такое хамства павінна быць пакарана, каб не дапусціць у будучыні непаважлівага стаўлення да прыёмнай кампаніі і да арганізатараў цэнтралізаванага тэсціравання, — канстатаваў Мікалай Фяськоў. — Мы накіравалі копіі гэтых бланкаў і звесткі пра іх аўтараў у праваахоўныя органы краіны.

Мікалай Фяськоў расказаў таксама, што знайсці тлумачэнне адной тэндэнцыі, якая паўтараецца з году ў год, яны не могуць. Чаму маладыя людзі, якім даводзіцца даказваць свае правы на ўдзел у тэсціраванні ў рэзервовы дзень з дакументамі ў руках, прапускаюць і рэзервовае тэсціраванне? Прычым такіх «прагульшчыкаў» сёлета набралася 135 чалавек, а зарэгістраваліся на рэзервовы дзень 1 тыс. 268 маладых людзей. Гэта значыць, што амаль 10 працэнтаў зноў не з'явіліся. Трэба дадаць, што тэставыя іспыты ў дні правядзення ЦТ па асноўным графіку прапускалі толькі ад 2 да 3 працэнтаў маладых людзей (у залежнасці ад дысцыпліны). Незразумела таксама, чаму абітурыенты ігнаруюць правілы ўдзелу ў ЦТ і прыносяць у экзаменацыйныя аўдыторыі мабільныя тэлефоны...

— У нашай сітуацыі званок сябру цалкам выключаны, бо прадыктаваць умовы задачы і дачакацца правільнага адказу ніхто не дасць. Цэнтралізаванае тэсціраванне — не тэлевізійная перадача і не латарэя, — дадаў Мікалай Фяськоў. — Таму чым тлумачыцца такое ўпартае нежаданне маладых людзей развітацца са сваім мабільным тэлефонам мы, прызнаюся, зразумець не можам. Аднак выяўленне мабільнага тэлефона ў экзаменацыйнай аўдыторыі азначае толькі адно — адхіленне ад далейшага ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні і выдаленне з аўдыторыі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Абзац

◢ У 128-ы дзень нараджэння вялікага беларускага паэта Янкі Купалы 7 ліпеня літаратары ўсклалі кветкі да яго помніка на Вайсковых могілках у Мінску. Акцыя прайшла падчас Купалаўскіх дзён, якія праводзяцца Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел дырэктар музея Янкі Купалы Алена Мацевасян, літаратуразнаўца Вячаслаў Рагойша, перакладчык і публіцыст Генадзь Пашкоў, рэдактар часопіса «Маладосць» паэтэса Раіса Баравікова і іншыя.

◢ **Буйны хімкамбінат плануецца пабудаваць у Салігорскім раёне. Пра гэта паведаміў учора старшыня Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч. На будаўніцтва прадпрыемства будзе накіравана каля $600 млн. «Гэты камбінат разам з АЭС — самыя буйныя будоўлі, запланаваныя ў Беларусі на наступную пяцігодку», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. На хімкамбінаце прадугледжваецца выпускаць каўстычную соду, прамысловы хлор, полівінілхларыд. На апошнім этапе будзе асвоена вытворчасць полікрышталічнага крэмнію для мікраэлектроннай прамысловасці.**

◢ У Смаргонскім раёне адзін чалавек загінуў і 8 параненых пры выбуху ў бліндажы часоў Першай сусветнай вайны. 6 чэрвеня ўвечары каля вёскі Крэва 18-гадовы хлопец загінуў з-за таго, што ў вогнішчы, якое ён развёў з сябрамі ў бліндажы, узарваўся снарад. Былі параненыя і дастаўленыя ў бальніцу яшчэ 8 чалавек, двое з іх пакінутыя на лячэнне. Цяпер пракуратура высвятляе, хто і навошта падклаў снарад у вогнішча.

◢ **Пажар на камбайне КЗР-10 ліквідавалі 6 ліпеня супрацоўнікі Пастаўскага райаддзела МНС. Здарэнне адбылося на полі каля вёскі Чорнае. Сельгасагрэгат, што належыць ААТ «Пастаўскі райаграсэрвіс», працаваў на нарыхтоўцы кармоў, калі ў яго маторным адсеку загарэлася. Камбайнер спрабаваў патушыць агонь з дапамогай вогнетушыцеля, аднак не атрымалася, давялося звяртацца да выратавальнікаў. Прычынай пажарэдне лічыцца кароткае замыканне ў электраабсталяванні, страты падлічваюцца.**

◢ Прафесійны кіроўца з Мінска разбіўся на легкавой машыне ў Нясвіжскім раёне. Мужчына з'ехаў у кювет, дзе перакуліўся. Сам ён загінуў на месцы, а пасажыр быў шпіталізаваны. Прычыны аварыі высвятляюцца.

Поўны абзац

◢ **Галоўны санітарны ўрач Расіі, кіраўнік Федэральнай службы па наглядзе ў сферы абароны правоў спажыўцоў і дабрабыту чалавека (Расспажыўнагляд) Генадзь Анішчанка заявіў, што ў 18 партыях малдаўскага віна, затрыманага ў падмаскоўным г. Сонцава, знойдзены небяспечныя для здароўя інгрэдыенты і хімічныя рэчывы. Ён сказаў, што забракаваныя партыі віна будуць вернутыя ў Малдову. «Як тавар яно ўжо не ўяўляе інтарэсу і, відаць, можа быць выкарыстанае толькі для іншых мэтаў, магчыма, для афарбоўкі парканаў, паколькі гэта не віно, а спіртазмяшчальны раствор», — заявіў Анішчанка. Ён не выключае поўнай забароны на ўвоз малдаўскага віна.**

◢ Шварцэнегер падпісаў закон «Аб яйцах». Губернатар Каліфорніі падпісаў закон, згодна з якім, з 1 студзеня 2015 года на тэрыторыі штата крамы могуць прадаваць толькі яйкі «шчаслівых курыц». У тэксце закона сказана, што курыца павінна знаходзіцца ў камфортных умовах: не закранаць крыламі клетку і мець магчымасць ляжаць.

◢ **У Маскве ўстанавілі помнік п'яным кіроўцам. За аснову помніка ўзялі бітыя аўтамабілі, за рулём якіх падчас аварыі былі п'яныя. Мяркуючы па тым, што засталося ад машын, аварыі былі вельмі сур'ёзныя і, хутчэй за ўсё, закончыліся сумна. Помнік уяўляе сабой вялікую бутэльку з сеткі, унутры якой — рэшткі аўтамабіляў, што трапілі ў ДТЗ. Мэта ўстаноўкі помніка — будзіць у кіроўцах адказнасць за сябе і тых, хто побач, напамінаць, што п'яны за рулём — вялікая небяспека.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Минский городской центр недвижимости

УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»
18 августа 2010 г.

ПОВТОРНО ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства изолированного помещения (гаража), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Олешева, 18, пом. 95 (гаражный массив № 1). Общая площадь гаража 34,2 кв.м. Инвентарный номер 500/D-63016. Начальная цена – 17 298 360 рублей.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы: заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения, о внесении задатка; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток в размере 1 700 000 рублей перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, бульвар им. В. Мулявина, 6, код 153001331; УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект. Процедура проведения торгов установлена порядком проведения аукциона. Оплата объекта осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

Аукцион состоится **18 августа 2010 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляется с **08 июля 2010 г. по 16 августа 2010 г.** в рабочие дни с 9.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6.

Телефон для справок: (017) 227 40 22. www.mgcn.by.

Антикризисный управляющий ОАО «Гомельчанка» объявляет о проведении торгов по продаже имущества

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий и состоятся 10 августа 2010 года в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 286.

На торги выставляется:

Номер лота	Наименование имущества	Начальная стоимость без учета НДС, руб.
1	Здание швейного цеха № 6 – двухэтажное здание, площадью 1 021,5 м² (г.п. Уваровичи, Гомельской области)	100 000 000
2	Промерочная машина БПМ-3 инв. № 1783	591 000
3	Пуговичная машина 827 кл. инв. № 2953	230 878
4	Пуговичная машина 827 кл. инв. № 2974	230 878
5	Универсально-стачивающая машина «ПФАФФ» 9732 кл. инв. № 3555	778 756
6	Универсально-стачивающая машина «ПФАФФ» 9732 кл. инв. № 3558	778 756
7	Универсально-стачивающая машина «Алтин» 8334 кл. инв. № 3771	356 688
8	Универсально-стачивающая машина «Алтин» 8334 кл. инв. № 3770	356 688
9	Универсально-стачивающая машина «Алтин» 8334 кл. инв. № 3768	356 688
10	Универсально-стачивающая машина 97 кл. инв. № 2883	94 081
11	Универсально-стачивающая машина 97 кл. инв. № 2884	94 081
12	Универсально-стачивающая машина 97 кл. инв. № 3236	149 325
13	Универсально-стачивающая машина 97 кл. инв. № 3547	94 081
14	Универсально-стачивающая машина 97 кл. инв. № 3758	68 986
15	Универсально-стачивающая машина 97 кл. инв. № 3759	68 986
16	Нож ручной закройный электр. 4С-537 инв. № 3819	530 325
17	Стол гладильный Anghietti инв. № 4032	1 200 000
18	Станок сверлильный инв. № 1958	372 946
19	Универсально-стачивающая машина 1022 кл. инв. № 3281	173 760
20	Универсально-стачивающая машина 1022 кл. инв. № 3283	109 459
21	Линейка КЛ-2 инв. № 3179	341 000

Шаг аукциона по каждому лоту 5 % от начальной цены лота.

Задаток в размере 10 % от начальной цены лота перечисляется на расчетный счет ОАО «Гомельчанка» – 3012201010012 в ГФ по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», МФО 151501768, г. Гомель, ул. Советская, 7, УНН 400021644.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Заявки на участие в аукционе принимаются **до 15.00 9 августа 2010 г.**

Дополнительную информацию можно получить по тел.: 37 78 10, 39 06 24 (ф).

Падпіска-2010

ЗВЯЗДОЎСКІЯ ПРЫЗЫ — ПАДПІСЧЫКАМ

УСЁННЯШНІМ нумары, паважаныя чытачы, мы, як і абяцалі, друкуем спісы пераможцаў звяздоўскай латарэі па выніках падпіскі на другое паўгоддзе і 3-ці квартал 2010 года.

Адразу хацелася б

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

8 ліпеня 2010 г. № 25 (219)

Не застацца ў баку...

Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь — парламент двухпалатны. Па такой схеме, як у нас, сёння функцыянуюць парламенты 77 дзяржаў свету. З гэтага пачала сваё выступленне на сустрэчы са старшынямі сельскіх і пасялковых Саветаў дэпутатаў, слухачамі Інстытута дзяржаўнай службы старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Ніна МАЗАЙ.

Яна расказала прысутным, што ўяўляе сабой Савет Рэспублікі IV склікання, чым займаецца камісія, якую яна ўзначальвае, падрабязна спынілася на знешнепалітычных кантактах, якія сёння мае Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, і на тых праблемах, над якімі ён працуе ў межах сваіх паўнамоцтваў.

Важны аспект дзейнасці Савета Рэспублікі — гэта работа з мясцовымі органамі ўлады.

Выступоўца нагадала, што пры Савеце Рэспублікі створаны і дзейнічае Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, у межах якога абмяркоўваюцца як пытанні заканадаўства, так і непасрэдна дзейнасць органаў мясцовага самакіравання.

— У цяперашні час вядзецца работа па стварэнні Асацыяцыі органаў мясцовага самакіравання. Гэта пачатак вельмі сур'ёзнай работы па павышэнні ролі мясцовага самакіравання як у эканамічным, так і ў сацыяльным жыцці рэспублікі. Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання ў 2007 годзе атрымаў статус пастаяннага назіральніка ў Кангрэсе мясцовых і рэгіянальных уладаў Савета Еўропы, і з таго часу бярэ актыўны ўдзел у працы гэтай арганізацыі. Цяпер вядзецца работа па вывучэнні Еўрапейскай хартыі мясцовага самакіравання — для таго, каб зразумець, які яшчэ шлях нам неабходна прайсці, каб максімальна ўдасканаліць і нашы падыходы да работы органаў мясцовага самакіравання, і тую прававую базу, на аснове якой яны дзейнічаюць. Савет ужо мае цэлы шэраг партнёрскіх арганізацый у іншых краінах, у прыватнасці, актыўна кантактуе з такімі ж органамі, якія займаюцца праблемамі мясцовага самакіравання ў Германіі, Швецыі, Нарвегіі, Расійскай Федэрацыі, Літве.

Паводле слоў Ніны Мазай, дастаткова хутка завяршыўся этап прызнання Беларусі як суверэннай незалежнай дзяржавы. Ён прайшоў на працягу першых двух гадоў пасля абвяшчэння незалежнасці — 1991—1992 гады. Да канца 1992 года практычна ўсе буйныя дзяржавы свету прызналі Беларусь і ўстанавілі з намі дыпламатычныя стасункі. На сёння 167 краін маюць з нашай рэспублікай дыпламатычныя адносіны.

Але цяпер мы падышлі да больш адказнага і больш сур'ёзнага этапу: даказаць, «што мы здольныя займаць сваё важнае месца ў сістэме міжнародных адносінаў, што ў нас ёсць свае нацыянальныя інтарэсы, што мы ў стане іх абараняць, што мы павінны раскрываць свой патэнцыяльны рэсурс як партнёра і навучыцца выкарыстоўваць магчымасці і рэсурсы нашых партнёраў у нашых інтарэсах. Гэта больш складаная і больш доўгатэрміновая задача, і ў гэтым кірунку ўсе галіны ўлады ў цесным кантакце «цэнтр—мясцовыя органы» павінны працаваць штодзённа і пастаянна».

Н. Мазай адзначыла, што ў апошнія гады вельмі актыўна структуравалася парламенцкая дыпламатыя. І мы павінны зрабіць усё, каб не застацца на абочыне гэтага актыўнага працэсу. Зроблена многае. У прыватнасці, забяспечана заканадаўчая база для таго, каб Нацыянальны сход мог выконваць сваю функцыю на знешнепалітычнай арэне. Акрамя таго, мы імкнёмся праз удзел у рабоце міжнародных арганізацый адстойваць свае інтарэсы, даносіць да нашых партнёраў нашу пазіцыю, разам з імі фармуляваць магчымыя шляхі вырашэння тых ці іншых задач. У Нацыянальным сходзе для гэтых мэтаў сфарміравана 13 нацыянальных дэлегацый. Яны працуюць у многіх міжнародных арганізацыях, у тым ліку і Міжпарламенцкім Саюзе (найстарэйшай міжнароднай парламенцкай арганізацыі)...

Ва ўсіх міжнародных структурах фарміруецца вельмі дакладная сістэма парламенцкага вымярэння, патлумачыла Ніна Мазай. Гаворачы пра арганізацыі на тэрыторыі СНД, яна ўзгадала Міжпарламенцкую асамблею СНД, якая павінна выконваць задачу збліжэння і гарманізацыі законаў, што дзейнічаюць на тэрыторыі дзяржаў—удзельніц Садружнасці, спрыяць шматузроўневай інтэграцыі, у тым ліку і эканамічнай, ствараць спецыяльныя мадэльныя законы, якія дазвалялі б максімальна ўніфікаваць там, дзе гэта магчыма, заканадаўчую базу і аблягчаць узаемадзеянне на ўзроўні дзяржаў.

Паводле слоў выступоўцы, Міжпарламенцкая Асамблея ЕўрАзЭС з усіх іншых утварэнняў на постсавецкай прасторы найбольш прасунулася ў стварэнні канкрэтнай базы для выканання эканамічнай інтэграцыі. Невыпадкова, што менавіта ў межах ЕўрАзЭС была народжана сама структура Мытнага саюза.

Мы актыўна працуем і з еўрапейскімі арганізацыямі, каб вывесці на поўнамаштабны фармат дыялог Беларусі з Еўрапейскім саюзам.

— Наша пазіцыя — і Еўрасаюз гэта разумее — заключаецца ў наступным: поўнамаштабнае аднаўленне адносінаў магчымае толькі на падставе павагі да нашых інтарэсаў, да нашага права будаваць наша ўнутранае жыццё без умяшальніцтва збоку. Выходзячы з гэтага, Еўрапейскім саюзам была прапанавана ініцыятыва «Усходняга партнёрства».

Напрыканцы свайго выступлення Ніна Мазай заклікала старшынь сельскіх Саветаў не разглядаць міжнародную дзейнасць як нешта, што іх не датычыцца, «бо ў законе аб мясцовым самакіраванні, у іншых нарматыўных дакументах запісана ваша права ўстанаўліваць у тым ліку і міжнародныя кантакты. Сёння вы з'яўляецеся актыўнымі ўдзельнікамі працэсу пабудовы міжнародных адносінаў Рэспублікі Беларусь (на ўзроўні вашых прадпрыемстваў, на ўзроўні пабудаваных 13 нацыянальных дэлегацый. Яны працуюць у многіх міжнародных арганізацыях, у тым ліку і Міжпарламенцкім Саюзе (найстарэйшай міжнароднай парламенцкай арганізацыі)...

Ва ўсіх міжнародных структурах фарміруецца вельмі дакладная сістэма парламенцкага вымярэння, патлумачыла Ніна Мазай. Гаворачы пра арганізацыі на тэрыторыі СНД, яна ўзгадала Міжпарламенцкую асамблею СНД, якая павінна выконваць задачу збліжэння і гарманізацыі законаў, што дзейнічаюць на тэрыторыі дзяржаў—удзельніц Садружнасці, спрыяць шматузроўневай інтэграцыі, у тым ліку і эканамічнай, ствараць спецыяльныя мадэльныя законы, якія дазваляліб максімальна ўніфікаваць там, дзе гэта магчыма, заканадаўчую базу і аблягчаць узаемадзеянне на ўзроўні дзяржаў.

Паводле слоў выступоўцы, Міжпарламенцкая Асамблея ЕўрАзЭС з усіх іншых утварэнняў на постсавецкай прасторы найбольш прасунулася ў стварэнні канкрэтнай базы для выканання эканамічнай інтэграцыі. Невыпадкова, што менавіта ў межах ЕўрАзЭС была народжана сама структура Мытнага саюза.

Мы актыўна працуем і з еўрапейскімі арганізацыямі, каб вывесці на поўнамаштабны фармат дыялог Беларусі з Еўрапейскім саюзам.

— Наша пазіцыя — і Еўрасаюз гэта разумее — заключаецца ў наступным: поўнамаштабнае аднаўленне адносінаў магчымае толькі на падставе павагі да нашых інтарэсаў, да нашага права будаваць наша ўнутранае жыццё без умяшальніцтва збоку. Выходзячы з гэтага, Еўрапейскім саюзам была прапанавана ініцыятыва «Усходняга партнёрства».

Напрыканцы свайго выступлення Ніна Мазай заклікала старшынь сельскіх Саветаў не разглядаць міжнародную дзейнасць як нешта, што іх не датычыцца, «бо ў законе аб мясцовым самакіраванні, у іншых нарматыўных дакументах запісана ваша права ўстанаўліваць у тым ліку і міжнародныя кантакты. Сёння вы з'яўляецеся актыўнымі ўдзельнікамі працэсу пабудовы міжнародных адносінаў Рэспублікі Беларусь (на ўзроўні вашых прадпрыемстваў, на ўзроўні пабраціскіх сувязяў, на ўзроўні спажыўцоў імпарту). Сёння гэты фармат ужо ў дзеянні. Вы кіруецеся тымі законамі, якія мы прымаем, і я спадзяюся, што мы і надалей будзем гэтыя законы ўдасканальваць, імкнуцца прымаць іх своечасова і клапаціцца пра тое, каб у заканадаўстве ініцыятыва і магчымасці праявіць гэтую ініцыятыву на ўзроўні мясцовага самакіравання былі дакладна прапісаныя і, самае галоўнае, каб яны былі рэалізаваныя на практыцы».

Інга МІНДАЛЁВА.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў 26-га склікання Марына БОНДАР:

Людзі нас падтрымалі.

А «ДЗЯКУЙ» МЫ ПАВІННЫ СКАЗАЦЬ СПРАВАМІ

Старшынёй Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў сёлета стала адна з васьмі жанчын, абраных у яго склад — Марыя Бондар. Яна ж абраная членам рэспубліканскага Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. Да гэтага Марыя Андрэеўна ўзначальвала ўпраўленне адукацыі Гомельскай вобласці, але ж справы дэпутацкія ёй таксама даўно знаёмыя і стаж у якасці радавога абранніка народа ёсць. Цяпер планка пастаўлена куды вышэй, і адказнасць куды большая. Пад пяшчотным жаночым крылом старшыні аблсавета — большасць мужчын. Праўда, і яны ведаюць, што Марыя Андрэеўна з тых жанчын, якія каня на скаку спыняць. Тым не менш, першае пытанне — ці не страшна кіраваць, у тым ліку 52 мужчынамі?

— Я да гэтага стаўлюся нармальна. Мне падабаецца, што новы дэпутацкі корпус высокапрафесійны. Я так думаю, што на іх амбіцыях можна сыграць — калі пасада дастаткова высокая, чалавек шмат чаго можа зрабіць для іншых. Людзі нас падтрымалі, а свой «дзякуй» ім мы павінны сказаць справамі. Афіцыйна прыём у дэпутата толькі раз у месяц і два разы на год — справаздача. Да сустрэч з людзьмі мы будзем дэпутата рыхтаваць у дарогу — збіраць для яго пэўны пакет дакументаў: па выніках працы эканомікі вобласці, па ідэалагічным суправаджэнні, па пытаннях са зваротамі грамадзян і гэтак далей.

— Марыя Андрэеўна, вы ж не раскідваліся асабліва абяцаннямі, калі ішлі на гэтыя выбары?

— Усе кандыдаты ў дэпутаты актыўна праводзілі перадвыбарчую кампанію, у тым ліку і я. Хоць для мяне гэта была не першая кампанія, я другі раз балаціравалася. Я ўжо ведала людзей. Гэта калі першы раз ідзеш на выбары, можна проста пабаяцаць, калі другі — пачынаеш з таго, што ўжо выканаў ці не выканаў. І таму першая задача, якая будзе стаяць для кожнага з тых, хто прайшоў у аблсавет, — выканаць, што паабяцалі.

— Палова з тых, хто абраны сёлета ў Гомельскі аблсавет — дэпутаты з вялікім стажам...

— Так. Таму і трэба адказна выконваць свае абяцанні перад людзьмі. Акрамя таго, безумоўна, сёння дэпутацкі корпус увогуле і кожны асабіста, дзякуючы сваёй актыўнасці, можа павысіць статус дэпутата. Да народнага абранніка павінны ісці людзі са сваімі праблемамі. Навошта ехаць у Гомель — можна прыйсці да свайго дэпутата на прыём, ён пастараецца вырашыць пытанне і праінфармаваць аб гэтым іншых людзей. Мне б хацелася, каб насельніцтва часцей звярталася да сваіх дэпутатаў як да людзей, якія сапраўды могуць дапамагчы. Яны павінны трымаць сваё слова.

— Гэта ж нармальная чалавечая адказнасць...

— А дэпутацкая павінна быць яшчэ вышэй. Нават калі дэпутат не можа па нейкіх прычынах вырашыць праблему, трэба дакладна растлумачыць, чаму. Магчыма, гэта цяпер нельга зрабіць, а праз пэўны час атрымаецца. Мне б і хацелася, каб роля дэпутата была важнай ва ўсіх напрамках жыццядзейнасці таго рэгіёна, дзе яго абралі. Я лічу, што 4 гады не так многа, але і нямала. Таму спадзяюся, што мы правядзём такую работу, каб кожны дэпутат пасля сябе пакінуў знакавае рашэнне праблемы для свайго рэгіёна. Няхай гэта будзе яго імянная справа. У кожным рэгіёне ёсць свае сур'ёзныя праблемы — няхай, умоўна кажучы, іх пяць. Зразумела, што няма грошай, каб усе адразу вырашыць. Але ж дэпутат можа лабіраваць інтарэсы сваіх выбаршчыкаў праз нейкія структуры — гэта і будзе яго актыўная дэпутацкая дзейнасць. І ў выніку сваіх актыўных дзеянняў ён зробіць канкрэтную справу і пакіне добрае імя.

— А калі яшчэ і ў раёнах адгукнуцца на вашу ініцыятыву...

— А я і хачу, каб у нас так і ў раёнах дэпутаты працавалі. Вось адзін з нашых дэпутатаў падзяліўся ўжо са мной ідэяй, як можна добраўпарадкоўваць дваровыя пляцоўкі. І няхай ён не зробіць гэта ў кожным дварэ, але калі на пяць двароў з'явіцца хаця б адна, гэта будзе перамога і асабіста гэтага дэпутата, і ўсіх нас разам. А калі мы возьмем яшчэ і ўсе раёны, у нас па заканчэнні працы дэпутатаў аблсавета 26 склікання атрымаецца тысяча такіх імянных напрамкаў дзейнасці. У кожнага з дэпутатаў павінна быць «праграма-мінімум» — на год і «праграма-максімум» — на чатыры гады. Цяпер мы распрацоўваем напрамкі. Пры гэтым будзем сачыць, у тым ліку праз СМІ, за дзейнасцю дэпутатаў. Па так званай пакрокавай стратэгіі — што хто паспеў зрабіць. Мы вас запрашаем пабыць у якасці дэпутата — выехаць разам з любым дэпутатам аблсавета і пасядзець на прыёме разам. І напішыце — як вы працавалі дэпутатам.

— Дзякуй за прапанову, скарыстаюся. А ці актыўна людзі ідуць сёння да дэпутата на прыём?

— На прыёме не заўсёды натоўп, прыходзяць 1-2 чалавекі. Лічу, не трэба сядзець і чакаць — трэба самому ісці на ферму, у краму, у школу... Сустракайся з людзьмі — няхай людзі там табе раскажуць, што іх хвалюе. А потым ты павінен ці на месцы вырашаць іх праблемы, ці, калі пытанне сур'ёзнае, агучваць на абласным узроўні. І будзем думаць, што рабіць, разам. Вядома, ёсць праблемы, вырашэнне якіх каштуе вялікіх грошай і немагчыма іх адразу вырашыць. Але ж вызначыць напрамкі мы можам — хоць бы на перспектыву.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

ЯК СПЫНІЦЬ МАЛОЧНЫЯ РЭКІ ВЯРТАННЯЎ?

Вясной гэтага года ў Бабруйскім раёне адбыўся непрыемны інцыдэнт — грамадзянін К. з вёскі Мікулічы Кавалёўскага сельсавета звярнуўся ў Камітэт дзяржкантролю са скаргай на тое, што ў яго перасталі прымаць малако. Сітуацыя недапушчальная, асабліва ў свеце агульнадзяржаўнай палітыкі, скіраванай на падтрымку асабістых падсобных гаспадарак. Прадстаўнікі КДК выехалі на «месца здарэння», каб дэталёва разабрацца ў сітуацыі. Высветлілася, што рашэнне аб прыпыненні закупкі малака ў грамадзяніна К. сельвыканкам прыняў, маючы на тое важкія прычыны, — малако не адпавядала ўстаноўленым нормам.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Усе мы змагаемся за павышэнне якасці сельгаспрадукцыі, — патлумачыў **старшыня Бабруйскага раённага Савета дэпутатаў Леанід БАРКОЎСКІ**, — і не апошнюю ролю ва ўзмацненні кантролю за якасцю малака адыграў леташні «малочны» канфлікт з Расіяй. Менавіта з гэтай прычыны (для вывядзення айчыннага «белага золата» на еўрапейскія стандарты) была перагледжана базісная тлустасць закупляемага малака: з 3,4 яе павысілі да 3,6. Прыняцце гэтай непапулярнай, але абгрунтаванай меры прывяло да таго, што жыхары нашага раёна, якія трымалі кароў і здавалі малако, толькі на розніцы ў 0,2 пункта базіснай тлустасці летась «страцілі» 237 тон малака. Гэта вялікая лічба.

І ў такіх умовах адзін канкрэтны грамадзянін здае малако з тлустасцю 2,2. Вы ж разумееце, яго прадукцыя трапляе ў агульны аб'ём і паніжае тлустасць усяго астатняга малака. У выніку церпяць усе сумленныя малаказдатчыкі, уся вёска.

Мы вырашылі разабрацца, чаму ў гэтага чалавека такая нізкая тлустасць малака. Высветлілі, што ён здымаў вяршкі, прадаваў іх дачнікам, а тое, што заставалася, здаваў нам. Калі пра гэта стала вядома, сельвыканкам напісаў распараджэнне аб прыпыненні закупу ў гэтага грамадзяніна малака ў сувязі з тым, што яно не адпавядала ўстаноўленым стандартам. Грамадзяніна з ім азнаёмілі, а ён, замест таго, каб зрабіць высновы і праявіць сумленне, звярнуўся ў Камітэт дзяржкантролю.

Леанід Баркоўскі перакананы, што падтрымку асабістым падсобным гаспадаркам трэба аказваць з розумам і пры гэтым у першую чаргу абараняць інтарэсы сумленных, руплівых гаспадароў, якія здаюць дзяржаве якасную прадукцыю.

Бабруйскі раён не адзін год трымае пальму першынства ў вобласці па валу закупляемага ў насельніцтва малака. Летась гэтая лічба склала 4560 тон. Аднак вялікія аб'ёмы часам «спараджаюць» і вялікія праблемы. У Бабруйскім рэгіёне іх дзве — высокая кіслотнасць малака і ўтрыманне інгібіруючых рэчываў.

Цалкам пытанне няякаснага малака пакуль вырашыць не атрымліваецца. Асабліва вострым яно стала з надыходам спякотных дзён.

— У нас не адзін раз здаралася, што сабранае малако не даязджае да малказавода, скісае ў дарозе, — дзяліўся набалелым дэпутат. — Забіраем у 7.30 раніцы, да 9.30 —11.00 яно ўжо ўсё кіслае. Вось, скажам, вёска Плёсы — адно вяртанне, другое. У чым справа? Бяром лабаранта з малаказавода, выязджаем з ім на месца, ідзём па дварах. У двух з іх знаходзім прычыну! Адна гаспадыня здавала цёплае малако. Яшчэ раз тлумачым, што прымаецца толькі астуджанае малако, учарашняе вячэрняе ці з абедзенняй дойкі. Цёплае, ранішняе, якое яшчэ не паспела астудзіцца, здаваць не трэба. Увогуле, мы пад роспіс папярэдзілі кожнага малаказдатчыка, што здаваць можна толькі астуджанае малако. Усім малаказборшчыкам набылі тэрмометры, каб яны маглі на месцы рабіць замеры. Але, верагодна, дзесьці малаказборшчыца не праявіла прынцыповасці, прыняла малако, якое не трэба было браць, у выніку — тры дні ўсёй вёскі вярталі малако. У другім двары здавалі малако, якое перастаяла, а каб яно не пахла кіслым — сыпалі ў яго соду. Вынік той жа — вяртанні. Мы гаспадыню папярэдзілі: яшчэ адзін такі выпадак — не будзем прымаць ваша малако.

Не лепшая сітуацыя і з інгібіруючымі рэчывамі, з-за якіх таксама здараюцца вяртанні. Увогуле, адсутнасць інгібітараў — новы паказчык якасці малака, які з'явіўся ў нас у сувязі з леташнімі патрабаваннямі Расіі.

Як патлумачыў Леанід Баркоўскі, прычыны з'яўлення інгібітараў могуць быць розныя, але самая распаўсюджаная — антыбіётыкі, якімі пралячылі карову (лекі трапляюць у малако). Згодна са стандартам, малако ад пралечанай каровы нельга здаваць 27 дзён, але мала хто з малаказдатчыкаў вытрымлівае ўвесь тэрмін. Асабліва ў «сезон вялікага малака». Вось і ўзнікаюць праблемы.

— З ветэрынарамі мы пастаянна праводзім размовы, просім іх сігналізаваць нам, калі некаму з жыхароў яны выпісваюць лекі для каровы. Але гэтая мера рэдка спрацоўвае, бо, як правіла, ветэрынар дае толькі кансультацыю; што робіць гаспадар жывёлы далей, урач не ведае. А гаспадар набыў лекі, шпрыцы і зрабіў уколы сам. Потым здаў малако з антыбіётыкамі і сапсаваў цэлую машыну агульнага малака.

Дзеля справядлівасці трэба дадаць, што прычынамі з'яўлення інгібітараў могуць стаць прэлае сена, цвіль на муцэ, сенажы ці сіласе (няякасны корм адбіваецца на малацэ). Асабліва часта такое здараецца ўвесну. Аднак летам, у сезон зялёнага корму і чыстай пашы з'яўленне ў малацэ інгібітараў можа мець толькі адно тлумачэнне — антыбіётыкі. Менавіта яны сталі прычынай двух вяртанняў малака — у Кавалёўскім і Бартнікоўскім сельсаветах. «У Кавалях знайшлі прычыну — чалавек калоў карове антыбіётыкі. У Бартнікоўскім так і не знайшлі...»

У адрозненне ад тлустасці інгібітары выявіць значна цяжэй. Для гэтага неабходны спецыяльны прыбор, які каштуе 7-8 мільёнаў рублёў. У сельвыканкамах іх няма, але імі ўжо абзавяліся некаторыя сельскагаспадарчыя арганізацыі раёна, якія прыходзяць на дапамогу ў выпадку спрэчных сітуацый. На месцы зборшчыкі малака правяраюць толькі тлустасць, кіслотнасць, шчыльнасць і тэмпературу. Аналіз на інгібіруючыя рэчывы робіць сам малаказавод (філіял Асіповіцкага гармалаказавода), размешчаны ў Бабруйску.

— Мы добра разумеем пазіцыю гармалзавода: ён не можа прыняць няякаснае малако, бо яго прадукцыю потым адмовіцца набываць Расія, і тады пацерпіць увесь рэгіён. Прынцыповасць гармалзавода ў плане патрабаванняў да якасці сыравіны абсалютна абгрунтаваная. А мы, улада, са свайго боку павінны працаваць у гэтым кірунку з насельніцтвам, каб ліквідаваць практыку вяртанняў. **Безадказных малаказдатчыкаў значна меней, чым сумленных, але ў выніку неахайнасці асобных гаспадароў церпяць цэлыя вёскі.** Мы рэгулярна сустракаемся з людзьмі, праводзім гутаркі, самі грамадзяне тэлефануюць нам і просяць прыняць меры да несумленных малаказдатчыкаў. Адзіная мера ўздзеяння — часова прыпыніць у іх закуп малака. Іншага выйсця няма. Мы павінны абараняць інтарэсы адказных гаспадароў.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПАДСОБНАЯ ГАСПАДАРКА

ЗЭКАНОМІШ СРОДКІ — СТРАЦІШ ІМІДЖ

У Марыі Кірылюк з вёскі Камень у гаспадарцы дзве каровы, свінні, куры, нават чатыры каты. Сваю жыўнасць яна вельмі любіць, таму і выглядаюць усе гадаванцы дагледжанымі і задаволенымі... Марыя Рыгораўна шмат гадоў працавала жывёлаводам, а цяпер на пенсіі, поўнасцю занялася ўласнай гаспадаркай. У яе не толькі жывёла прыгожая. Агарод нібы падрыхтаваны да паказальнага семінара па культуры земляробства — ні травіначкі, — хоць зазірнулі мы са старшынёй раённага Савета Таццянай Місюк сюды выпадкова, па дарозе, каб пацікавіцца, хто і як спрыяе вяскоўцу ў яго падсобнай гаспадарцы.

Гаспадыня ўтульнага падворка сказала, што заўсёды ў гэтай справе спадзяваліся з мужам найперш на сябе. Але не варта грашыць і на сельгаспрадпрыемства, дзе ўсё жыццё адпрацавалі. Сенакос выдзяляюць і косяць, бульбу пасадзіць дапамагаюць. «А з пашай для кароў, — заўважыла Марыя Кірылюк, — сёлета, як ніколі: і падкасілі траву, і падкармілі, пасём кароў на белай канюшынцы».

Гэтым летам Брэсцкі абласны Савет плануе правесці выязную сесію па пытаннях развіцця падсобных гаспадарак вяскоўцаў у Пружанскім раёне. Падумалася, што можна было б зрабіць гэта мерапрыемства і тут, у Гарадцы Кобрынскага раёна, знайшлося б што паказаць.

Дырэктар ААТ «Гарадзец-Агра» Іван Цецярук даўно прыйшоў да высновы, што дапамагаць работнікам ва ўладкаванні падсобнай гаспадаркі выгадна. «Калі механізатар — кіроўца сучаснай высокапрадукцыйнай машыны — будзе ўвесь час адлучацца, каб пакасіць сена, дагледзець бульбу ці іншыя пасевы, вытворчасць ад гэтага пацерпіць, — кажа Іван Сяргеевіч. — А так наладжана сістэма, якая сябе апраўдвае».

50 сотак сенакосу выдзяляюць усім, нават косяць траву па жаданні. Гэта значыць, асобныя гаспадары самі скошваюць траву альбо, наадварот, пасуць кароў на сваім надзеле. Пашы для статка вяскоўцаў падкошваюцца, падкормліваюцца з дапамогай тэхнікі сельгаспрадпрыемства. Грошы за гэта вяскоўцы не плацяць. І яшчэ цікавая акалічнасць: плату на паслугі па апрацоўцы, скажам, бульбы, агародаў бяруць аднолькавую ва ўсіх незалежна ад таго, працуеш ты ў гаспадарцы, пенсіянер ці работнік сацыяльнай сферы вёскі. Колькі з гэтай нагоды даводзілася чуць скаргаў ад вяскоўцаў за гады работы аўтару гэтых радкоў! Пенсіянеры, асабліва былыя настаўнікі, медыкі, работнікі чыгункі, лясной гаспадаркі, культуры, сувязі, якія ўсё жыццё працавалі ў вёсцы, лічаць такую сістэму несправядлівай. Хоць фармальна тое ці іншае сельгаспрадпрыемства можа ўсталёўваць ільготы менавіта для сваіх работнікаў. І з пункту гледжання закона, усё будзе правільна. А вось дырэктар Іван Цецярук лічыць для сябе такую сістэму непрымальнай: «Ну колькі той эканоміі? Больш страціш іміджам, чым атрымаеш сродкамі. Тым больш, што па-чалавечы такое стаўленне да тых, хто не працаваў у калгасе, а вучыў, лячыў, абслугоўваў калгаснікаў, проста несправядлівае».

Названая сістэма падтрымкі ўласнай гаспадаркі ўключае ў сябе шэраг пунктаў. Так, вяскоўцы, якія за сезон здалі больш за дзве з паловай тоны малака і прадалі гаспадарцы цяля, маюць права атрымаць 150 кілаграмаў збожжа бясплатна. Яшчэ паўтоны яго можна выпісаць за плату. Для шматдзетных сем'яў прадугледжана льгота. Ім на развіццё асабістай гаспадаркі штогод выдаецца па 150 кілаграмаў збожжа і болей (залежыць ад колькасці дзяцей у сям'і) у якасці дапамогі.

Паводле слоў старшыні Гарадоцкага сельскага Савета Марыі Зданові, апошнім часам не здаюць кароў нават некаторыя адзінокія пенсіянеркі. У справе ўтрымання каровы галоўнай праблемай заўсёды была нарыхтоўка кармоў. А калі праблема вырашаецца, то можна не спяшацца расставацца з рагатай карміліцай, асабліва тым, у каго ёсць сілы на штодзённы догляд.

Марыя Рыгораўна КІРЫЛЮК са старшынёй сельскага Савета Марыяй ЗДАНОВІЧ (справа).

Старшыня сельскага Савета сказала, што зараз у вёсках на ўласных падворках утрымліваецца 256 кароў. Пагалоўе год ад году паступова зніжаецца. І гэта аб'ектыўны працэс. Калі на Грушаўскім рамонтна-механічным заводзе, які знаходзіцца на тэрыторыі сельсавета, сярэдняя зарплата працаўнікоў набліжаецца да паўтара мільёна рублёў, і на прадпрыемстве працуюць двое, у такой сям'і звычайна карову не трымаюць. Карова «прывязвае» гаспадароў да дому на ўвесь год. А маладзейшыя аграгараджане сёння хочуць быць больш вольнымі, скажам, у планаванні адпачынку. Не вельмі ахвотна заводзяць кароў і тыя з маладых, у каго зарплата крыху меншая за названую. Жывёла ў асабістай гаспадарцы патрабуе клопату з цямна да цямна. Так жыць прывыкла старэйшае пакаленне. Таму асабліва актуальнай выглядае сёння падтрымка тых, хто не лянуецца паляпшаць свой дабрабыт вядзеннем уласнай гаспадаркі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Кобрынскі раён.

Людзі нас падтрымалі.

А «дзякуй» мы павінны сказаць справамі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Праблемы дастаткова тыповыя і вядомыя ў людзей сёння — тая ж сфера ЖКГ, дарогі...

— Што тычыцца ЖКГ — так, у нас састарэлы жылфонд. Летась на яго аднаўленне па вобласці быў выдаткаваны мільярд рублёў, і сёлета мы актыўна працуем у гэтым накірунку, таму ў нас прадугледжаны грошы на гэтыя мерапрыемствы. Першы транш пойдзе ў раёны з трэцяга квартала. Гэтая тэма паступова зрушыцца, і ў разы будзе зроблена болей, чым раней. Што тычыцца дарог, дык каб іх утрымліваць у ідэальным стане, патрэбны сродкі. Але ж, калі размова ідзе пра элементарнае — на месцы, разам з кіраўніком мясцовай гаспадаркі сельсавет можа знайсці магчымасці, каб прагрэйдзіраваць тую ж дарогу.

— Што тычыцца вады — на Гомельшчыне амаль паўсюдна яна з вялікім утрыманнем жалеза...

— Безумоўна, мы не пабудуем адначасова паўсюль станцыі абезжалезвання. Гэта вельмі дорага. Зыходзячы з таго, што ёсць, санслужбы павінны даць рэкамендацыі, як сёння карыстацца гэтай вадой. Што тычыцца дахаў, вывучаць сітуацыю трэба індывідуальна ў кожным асабістым выпадку. Калі чалавек адзінокі і ў яго цячэ са столі — справа гонару для дэпутата знайсці магчымасць яму дапамагчы. Зразумела, што адным разам мы асфальтам дарогі не закрыем, дахі ўсім не адрамантуем. Трэба падыходзіць выбарачна, зыходзячы з тых сродкаў, якія ёсць. Людзі, калі ім тлумачыць, усё цудоўна разумеюць. Калі ў населеным пункце тры праблемы, а сродкі ёсць на вырашэнне адной, давайце разам і вырашым: што для нас найбольш важна сёлета, а што — у наступным годзе.

— Марыя Андрэеўна, якой можа быць роля мясцовых Саветаў у падтрыманні і развіцці асабістых падсобных гаспадарак грамадзян?

— Каб развіваць сёння сельскую гаспадарку, чалавек павінен быць у гэтым зацікаўлены. Умовы павінны быць адпаведныя, каб не думаць, дзе купіць парсючка, курэй і гэтак далей... Ці корм для іх. І потым, вясковец павінен бачыць перад сабой пэўныя эканамічныя выгады. Гандаль у гэтым напрамку яшчэ павінен сябе знайсці. Гэта задача для гандляроў: каб у краме быў і патрэбны інвентар, і ўгнаенні ў асартыменце і гэтак далей. Вось тут і роля сельскага Савета — адстойваць інтарэс простага чалавека на нізавым узроўні. Павінен быць сумленны і адкрыты дыялог уладаў з людзьмі. Інтарэс дэпутацкай працы заключаецца і ў тым, што ў дэпутата бязмежныя магчымасці для самаразвіцця і рэалізацыі ў рабоце. Як час змяняецца хутка, у такім жа тэмпе павінна рабіцца і дэпутацкая праца. І яшчэ абавязкова павінна быць штосьці для душы. Ёсць у мяне такая задумка, каб у кожным сельскім Савеце старшыня арганізаваў нейкі цікавы пачын — тое, што бліжэй яго аднавяскоўцам. Напрыклад, у Веткаўскім раёне адрадзілі абрад «Пахаванне стралы». У кожнага населенага пункта — свая гісторыя, якая мае глыбокія беларускія карані... У сельскім Савеце ёсць клуб, ФАП, школа — вось група інтэлігентных людзей, якія так ці інакш павінны падключацца да вырашэння праблем. Акумуляваць іх вакол сябе павінен старшыня сельскага Савета. На тое ён і кіраўнік, каб шукаць нестандартныя падыходы ў арганізацыі працы з насельніцтвам. Усё гэта ў выніку і дазволіць нам разам вырашаць праблемы людзей. Да часу, калі мы завершым свой дэпутацкі тэрмін, мне б хацелася, каб кожнаму было што сказаць не толькі на паперы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.

ЯК СПЫНІЦЬ МАЛОЧНЫЯ РЭКІ ВЯРТАННЯЎ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Кіслотнасць і інгібіруючыя рэчывы — дзве праблемы, якія вельмі моцна ўплываць на маральна-псіхалагічны стан вяскоўцаў. **Калі чалавек здае 40 літраў выдатнага малака, а яму вяртаюць назад — выбачайце — нейкія памыі, у яго знікае жаданне трымаць кароў і здаваць малако,** бо гэта цяжкая штодзённая праца. У нас ёсць сем'і, у якіх па 5, па 7 кароў. У пераможцы рэспубліканскага конкурсу сярод малаказдатчыкаў Аляксандра Хурсанава з вёскі Міхалёва (Бартнікоўскі сельсавет) увогуле 16 кароў. Ён жыве менавіта за кошт даходаў ад здачы малака. Летась здаў 57 тон. Гаспадароў, у якіх шмат кароў, мы абавязалі набыць халадзільнае абсталяванне. Вы ж разумееце, калі чалавек за раз здае 300 літраў, натуральна, у звычайным бытавым халадзільніку столькі малака ён не размесціць. Хурсанаў набыў сабе вялікі халадзільнік на 400 літраў. Да яго малака ніколі не ўзнікае пытанняў.

Гадавое заданне па закупе малака ў насельніцтва Бабруйскаму раёну пакінулі на леташнім узроўні — 4560 тон. Пры тым, што пагалоўе кароў у асабістых падсобных гаспадарках штогод скарачаецца дзесьці на 250 галоў. Сёння ў раёне вясковцы трымаюць 2056 рагуль. Выканаць запланаваныя паказчыкі атрымаецца толькі за кошт павышэння якасці (у тым ліку тлустасці малака), скарачэння колькасці вяртанняў з-за неадпаведнасці нормам і павелічэння аб'ёмаў здачы малака ад адной каровы. Апошняе магчыма пры забеспячэнні жывёл паўнавартаснымі кармамі, пашай. А пашу трэба яшчэ ж падкасіць, падкарміць угнаеннямі, гаспадарам кароў выдаткаваць сена, салому для жывёлы.

Сістэма работы ў гэтым плане ў нас у раёне даўно адпрацаваная. Мы выйшлі на паказчык выдзялення насельніцтву 2-2,3 тоны сена на карову, 2 тоны саломы. Тут праблем не будзе. Пашы ў нас дастаткова (у сярэднім 1,05 га на карову). Пашы замацаваны за СВК, але падкосы робяць сельвыканкамы.

У Бабруйскім раёне закупам малака ў насельніцтва па-ранейшаму займаюцца сельвыканкамы. І, як пацвердзіў Леанід Баркоўскі, гэтая форма работы сябе апраўдвае. Разлікі за малако праводзяцца своечасова, два разы на месяц. Прычым варыянтаў аплаты ажно тры. Першы — бухгалтар сельвыканкама выязджае на месца разам з ведамасцю і выдае грошы. Другі — праз пошту. Сельвыканкам заключае з поштай дагавор, і паштальёны прыносяць грошы проста дамоў. Трэці — праз ашчадную касу, калі грошы паступаюць на асабісты рахунак малаказдатчыка.


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Малочных» грошай хапае сельвыканкамам не толькі на падкос тэрыторыі, але яшчэ на выплату заробку малаказборшчыкам, бухгалтарам, лабарантам, на набыццё неабходнага інвентару (колаў, бідонаў, коней, спецвопраткі і г.д.).

Станоўчым наступствам таго, што закупам малака ў насельніцтва займаюцца сельвыканкамы, з'яўляецца яго размежаванасць з малаком сельгасарганізацый. У іншых раёнах льюць разам і вясковае малако, і «калгаснае», а потым не могуць разабрацца з яго якасцю. У нас для малака насельніцтва выдзяляецца асобны транспарт, а калі малако СВК і грамадзян едзе ў адной машыне, то абавязкова — у розных секцыях.

...Мы ніколі не забываемся на тое, што сельгаспрадукцыя, вырашчаная на прысядзібным участку, — гэта рэальныя даходы насельніцтва. Жыхары нашага раёна летась толькі за здадзенае дзяржаве малако з улікам датацый атрымалі амаль 3 мільярды рублёў. Гэта прыстойная сума, якая папоўніла бюджэты вяскоўцаў.

Наша задача — забраць усе лішкі малака, якія застаюцца ў людзей. У перспектыве плануем падключыць да справы індывідуальных прадпрымальнікаў. Лічым, што гэта правільны кірунак: чалавек збірае малако, вязе ў Бабруйск, а з Бабруйска можа прывезці пад заказ нейкія тавары, выканаць просьбы вяскоўцаў. Мы па гэтым шляху абавязкова пойдзем. У нас ужо ёсць людзі, якія гэтым зацікавіліся.

Інга МІНДАЛЁВА.
Бабруйскі раён.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Прыёмная серада, і не толькі

На пасадзе старшыні Стадоліцкага выканаўчага камітэта Лельчыцкага раёна працуе Ганна Маркевіч. Кола яе штодзённых клопатаў — гэта жыццёвыя пытанні 855 жыхароў трох вёсак.

— Хоць менавіта серада з'яўляецца днём прыёму грамадзян, дзверы нашай установы адчыненыя для ўсіх кожны дзень, бо часам жыццё патрабуе неадкладных рашэнняў, — кажа Ганна Паўлаўна.

Старэйшы жыхар вёскі Стадолічы 82-гадовы Міхаіл Абрамчук (на фотаздымку) прыйшоў (хоць дастаткова было патэлефанаваць) з пытаннем па пераафармленні дома.

— Мне прыемна наведваць наш Савет, хоць турбую яго нячаста, — кажа Міхаіл Сямёнавіч, колішні калгасны палявод. — Ведаю, што тут заўсёды і выслухаюць, і дапамогуць.

Так, напэўна, сказалі б многія жыхары Стадолічаў і іншых населеных пунктаў сельсавета. Нездарма другі раз запар Ганна Маркевіч абіраецца на нялёгкую ролю кіраўніка мясцовай улады.

РАГАЧОЎ МЯНЯЕЦЦА

Рэстаран у Рагачове — пакуль не прадмет гонару для жыхароў раёна. Але ж, спадзяюцца яны, хутка сітуацыя памяняецца. На II рэгіянальным эканамічным форуме, які прайшоў у горадзе, заключаны пратакол намераў з ААТ «Табаквинторг» аб набыцці гэтага састарэлага гандлёвага аб'екта і перайтварэнні яго ў новы, сучасны. Як расказала начальнік аддзела эканомікі Рагачоўскага райвыканкама Таццяна Бандарэнка, гэта толькі адзін з праектаў, які плануюць ажыццявіць з дапамогай грошай інвестараў:

— Сёлета прысутнічалі прадстаўнікі Балгарыі, Польшчы, В'етнама, ганаровы пасол Кіпра ў Рэспубліцы Беларусь. Было шмат прадстаўнікоў з гарадоў і раёнаў-пабрацімаў: Кацельнікі (Маскоўская вобласць), Адміралцейскі раён Санкт-Пецярбурга. Што тычыцца асобных праектаў, плануем адкрыць у пасёлку Беліцк швейную вытворчасць на 15 працоўных месцаў. Падпісалі мы і пагадненне з Тосненскім раёнам Ленінградскай вобласці. На працягу трох гадоў працуем з інвестарамі з падмаскоўнага горада Кацельнікі. З прадстаўнікамі ЗАТ «НТПЦ «Тале» летась быў заключаны дагавор. І ўжо зараз у вёсцы Кісцяні Рагачоўскага раёна ствараецца турыстычна-аздараўляльны комплекс.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДАВЕДКА НА ВЫРАШЧАНУЮ СЕЛЬГАСПРАДУКЦЫЮ САПРАЎДНАЯ ЎВЕСЬ СЕЗОН

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Георгій Васільевіч Дубінка жыве ў вёсцы Маяк Слуцкага раёна і, натуральна, мае агарод, вырошчвае нешта сваімі рукамі. Лішкі сельскагаспадарчай прадукцыі, бывае, здае нарыхтоўшчыкам. Сёлета, напрыклад, вырашыў самастойна завезці і здаць на Слуцкі кансервавы завод 10 кілаграмаў чорных парэчак. Магчыма, і ў далейшым нешта яшчэ будзе здаваць. Што прымусіла патэлефанаваць на «гарачую лінію» газеты? Неабходнасць браць даведку з сельскага Савета.

— Гэтую паперу могуць запатрабаваць і пры здачы тых жа ягад праз краму. А толькі ў нас у вёсцы недзе сто падворкаў, і кожнаму трэба выдаць такую даведку. Навошта такая бюракратыя, калі ў кожнага гаспадара, напрыклад, толькі 10 кустоў, колькі ён можа здаць ягад? — пытаўся Георгій Васільевіч.

— Даведка вяскоўцам выдаецца найперш для таго, каб здадзеная імі прадукцыя не абкладалася падаткам, папера сведчыць, што яна вырашчаная сваімі рукамі, значыць, такі грамадзянін мае права на названую льготу, — адказаў на гэтае пытанне **старшыня Маяцкага сельскага Савета Леанід РУСАКОВІЧ**. — Даведка выдаецца адзін раз на цэлы сезон, атрымаць яе можна хоць у самым пачатку года. Працэдура выдачы (ёсць камп'ютарная база) бясплатная — па прынцыпе «аднаго акна»: у дзень звароту грамадзяніна, які дзеля гэтага піша заяву. У ёй ён указвае ўсё, што, магчыма, вырабіць на працягу сезона, і прыкладныя аб'ёмы, скажам, 200 кілаграмаў аднаго віду сельскагаспадарчай прадукцыі і 400 кілаграмаў — другога. Даведка, як сказаў, застаецца ўвесь час на руках у здатчыка. Нарыхтоўшчык толькі перапісвае яе нумар, дату выдачы і колькі і якой прадукцыі здаў канкрэтны чалавек. Бывае, нарыхтоўшчыкі патрабуюць копію даведкі. Тут таксама няма ніякіх праблем: бясплатныя копіі або адразу можна ўзяць у сельскім Савеце, або, пры неабходнасці, у любы момант зрабіць іх з арыгінала на ксераксе. Іх, дарэчы, завяраць не трэба — яны і так будуць сапраўднымі.

Як распавёў далей Леанід Мікалаевіч, усяго на тэрыторыі сельскага Савета маецца 597 падворкаў вяскоўцаў і 200 — дачнікаў, якія ўтрымліваюцца ў асобным спісе (што, пры неабходнасці, не перашкаджае апошнім атрымаць на такіх жа ўмовах аналагічную даведку). З гэтай агульнай колькасці гаспадары толькі прыкладна паловы падворкаў звяртаюцца па даведкі. Чэргаў з гэтай нагоды ніколі не бывае.

Даведка, на неабходнасць атрымання якой наракаў заяўнік, патрэбная яшчэ і для таго, каб весці справаздачнасць адносна здадзенай сельскагаспадарчай прадукцыі, вырашчанай і нарыхтаванай на тэрыторыі канкрэтнага сельскага Савета. Ёсць тут і такі нюанс. Штогод работнікі сельскага Савета робяць абход падворкаў вяскоўцаў і з іх слоў запісваюць: колькі ў каго тых жа кустоў, дрэў і інш. Каб не атрымалася так, што чалавек, які ўвогуле не мае зямельнага ўчастка, раптам заявіў на продаж тону бульбы. Натуральна, ён не недзе набыў для перапродажу. Таму праз даведку, можна сказаць, вядзецца прафілактыка незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. Зноў жа, тут закранаюцца пытанні бяспекі вырабленай прадукцыі. Паводле слоў Леаніда Русаковіча, насельніцтва пераважна здае ягады, бульбу і збожжавыя.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Разбірацца з патравамі будзе спецыяльная камісія»

19 мая ў газеце пад рубрыкай «Гарачы тэлефон» была змешчана скарга жыхара вёскі Бобрык Пінскага раёна Уладзіміра Цімафеевіча Кахновіча, які наракаў, што няма паратунку ад патраў сотак дзікамі. Па словах чытача, яны гойсалі па палетках цэлымі выводкамі. Летась жывёлы «перааралі» 30 сотак азімага трыцікале, а сёлета дабраліся да бульбы і цукровых буракоў. Прычым праблема датычылася не толькі асабіста Уладзіміра Цімафеевіча, але і іншых вяскоўцаў.

Як і належыць, тады мы далі заяўніку дастаткова падрабязны адказ — як дзейнічаць. Параілі звярнуцца ў камісію пры сельскім Савеце, каб тая праверыла факты і склала акт адносна нанесенай шкоды. Праінфармавалі Пінскую міжрайінспекцыю адносна бяды жыхароў вёскі (хоць гэтае пытанне і не зусім у яе кампетэнцыі, але мы разлічвалі, што звесткі дойдуць да каго трэба, у прыватнасці, да паляўнічых, якія зоймуцца адстрэлам дзікоў), патэлефанавалі ў райвыканкам.

І вось днямі Уладзімір Цімафеевіч зноў набраў нумар рэдакцыйнай «гарачай лініі». Размаўляў даволі эмацыйна. Па сутнасці зварот зводзіўся да аднаго: ніхто нічога так і не зрабіў. Не было ніякага адстрэлу, пэўныя праблемы ўзніклі і з атрыманнем акта адносна патраў. А дзікі тым часам, як сказаў чытач, карыстаючыся такой сітуацыяй, «знеслі ўжо ўсё».

Мы зноў мусілі звярнуцца да спецыяліста аддзела па працы са зваротамі грамадзян Пінскага райвыканкама Уладзіміра Цыбулькі. Апошні праінфармаваў кіраўніцтва выканаўчага камітэта адносна ўзніклай праблемы, вынікам чаго стала прыняцце рашэння аб выездзе ў вёску Бобрык спецыяльнай прадстаўнічай камісіі (з удзелам прадстаўнікоў райвыканкама і прыродаахоўнай інспекцыі, дырэктара Целяханскага лясгаса суседняга Івацэвіцкага раёна, якому і належаць угоддзі каля вёскі і іншых). Быць на месцы камісія плануе літаральна ў панядзелак. Пра гэта праінфармаваны і наш заяўнік.

— Тады і будзе складзены акт аб патравах. Далей вясковец зможа прад'явіць яго Целяханскаму лясгасу з мэтай атрымання кампенсацыі — або ў добраахвотным парадку, або, калі не будзе такога паразумення, праз суд, — сказаў Уладзімір Цыбулька. — Таксама будзе вырашацца пытанне наконт саміх дзікоў. Як гаварыў і ў мінулы раз, і як пацверджу зараз, праблема з гэтай жывёлай сапраўды існуе. Патравы закранулі не толькі агароды грамадзян, але і палеткі калгасаў. Жанчыны, якія цяпер ходзяць у лес па ягады, таксама, здараецца, сутыкаюцца з жывёлай. Трэба сказаць, што ёсць пытанні і з адстрэлам дзікоў. За дазвол на адстрэл паляўнічы мусіць плаціць няхай і невялікія, але грошы. Здабытага дзіка ён таксама мусіць забіраць, заплаціўшы ў залежнасці ад яго вагі ад 70 да 300 тысяч. А не кожнаму паляўнічаму гэта патрэбна...

Сяргей РАСОЛЬКА.

ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

11 августа 2010 г. проводит открытый аукцион на право заключения договоров аренды земельных участков в г. Гомеле

№ лота	Адрес земельного участка: г. Гомель	Кадастровый номер участка	Площадь, га	Целевое назначение – строительство	Качество земли	Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий. Инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ	Срок аренды, (лет)	Затраты на подготовку документации, бел. рублей	Начальная стоимость, бел. рублей	Сумма задатка, бел. рублей
1	ул. Мазурова	340100000001003288	2,7581	Культурно-развлекательного оздоровительного центра «Аквапарк»	к землям сельскохозяйственного назначения не относятся	Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона газопровода и водоохранная зона оз. Бурое Болото – 0,0811 га; водоохранная зона оз. Бурое Болото – 1,7335 га; прибрежная полоса оз. Бурое Болото – 0,9435 га	99	2 441 250	1 311 733 290	130 000 000
2	ул. Добрушская	340100000008001613	0,4505	Станции техобслуживания		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничение в использовании: охранная зона кабеля связи – 0,0168 га; водопровода – 0,0163 га. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории.	50	2 532 588	29 361 690	2 900 000
3	пр-зд Орудийный (участок № 1)	340100000007004921	0,5381	Объектов экологически чистого производства		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,0128 га	99	587 480	43 321 770	4 300 000
4	пр-зд Орудийный (участок № 2)	340100000007004920	0,8016	Объектов экологически чистого производства		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничение в использовании: охранная зона водопровода – 0,006 га	99	377 654	64 534 460	6 400 000
5	ул. Текстильная	340100000003001800	0,6789	Здания многофункционального назначения (станция техобслуживания, салон автомобилей, офисный центр, торговый центр с промышленной группой товаров)		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона подземной кабельной линии электропередачи – 0,1460 га; охранная зона водовода – 0,0310 га. Выполнить технические условия по выноске КЛ и водовода. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории	99	581 818	349 589 290	34 900 000
6	ул. Мазурова (участок № 1 и участок № 2)	340100000001004200 340100000001004201	0,1189 0,0377	Оздоровительного центра (медицинские услуги, парикмахерская, фотоуслуги, ателье, цветочный магазин)		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: участок № 1 – охранная зона канализации – 0,0038 га, охранная зона подземной кабельной линии связи, подземной кабельной линии электропередачи – 0,0196; участок № 2 – охранная зона канализации – 0,0042 га	99	624 661	89 923 009	8 990 000
7	ул. Дорожная (в районе пешеходного моста)	340100000008001760	0,0790	Павильона по оказанию услуг населению (резка стекла)		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона кабеля связи и водопровода – 0,0227 га.	5	923 705	2 523 750	250 000
8	ул. Чечерская	340100000002004625	0,0305	Здания специализированного здравоохранения и предоставления социальных услуг (аптека)		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона теплотрассы – 0,0040 га	50	1 020 365	4 445 550	440 000
9	ул. Чечерская	340100000001004505	0,0498	Здания специализированного для обслуживания населения (парикмахерская, мастерская)		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Земель с ограничением в использовании нет	50	1 113 210	9 329 320	930 000
10	ул. Речицкое шоссе, в районе котельной и жилого дома № 27	340100000006004172	0,0137	Павильона по оказанию услуг населению		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона канализации, теплотрассы, электрокабеля – 0,0048 га	10	1 545 604	1 523 830	150 000
11	ул. Лепешинского – проезд Инженерный	340100000002002626	0,1639	Производственной базы		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. Ограничения в использовании: охранная зона линии электропередачи напряжением 10 кВ – 0,097 га	50	1 194 160	34 296 050	3 400 000
12	8-й пер. Ильича	340100000007005669	0,2804	Зданий складского и административно-бытового назначения		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории	50	3 806 826	25 257 664	2 525 000
13	ул. Войсковая (бывшая территория воинской части)	340100000006004287	0,3330	Здания специализированного складов		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. На земельном участке произрастает древесно-кустарниковая растительность с отдельно стоящими деревьями	50	2 448 341	29 370 169	2 937 000
14	ул. Войсковая (бывшая территория воинской части)	340100000006004286	0,1980	Станции по ремонту и обслуживанию автомобилей		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Плодородный слой почвы снять, сохранить и использовать на благоустройство прилегающей территории. На земельном участке произрастает древесно-кустарниковая растительность с отдельно стоящими деревьями	50	2 266 610	17 463 344	1 746 000
15	ул. Головацкого, конечная остановка «Мельников луг»	340100000001004437	0,0065	Размещение остановочного павильона общественного транспорта (с установкой торгового павильона в составе остановочного комплекса)		Участок свободен от застройки. Подъезд будет осуществляться по существующей дорожной сети. Ограничения в использовании: охранная зона ливневой канализации 0,0001 га	5	863 461	482 380	48 000

1. Организатор аукционных торгов – управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома.

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами по каждому объекту в натуре.

3. **Аукцион состоится 11 августа 2010 г. в 15.00** в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию следующие документы: заявление по установленной форме; заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка в размере, указанном в извещении, на р/с 3642402000239 в филиале 300 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, МФО 151501661; УНП 400251518 управление коммунальной собственности и приватизации горисполкома. Кроме того представляют:

4.1 Представители или уполномоченные должностные лица юридических лиц Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

4.2 Индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о государственной регистрации без нотариального засвидетельствования.

4.3 Представители гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность.

4.4 Представители или уполномоченные должностные лица иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители иностранного юридического лица или гражданина – легализованную в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или другой кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык.

4.5 При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители юридических лиц и граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

5. Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору торгов затраты на подготовку и проведение аукциона. Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня принятия Гомельским горисполкомом решения о предоставлении победителю земельного участка.

6. Горисполкомом может предоставляться рассрочка на срок не более 3 лет, в случаях когда размер платы за право заключения договора аренды земельного участка превышает 2 000 базовых величин для граждан и индивидуальных предпринимателей и 10 000 базовых величин для юридических лиц. Плательщик, претендующий на получение рассрочки, до принятия горисполкомом решения о предоставлении земельного участка в аренду должен обратиться в горисполком о предоставлении ему рассрочки.

7. Документы для участия в торгах принимаются по рабочим дням **с 9.00 до 17.00 по 5 августа 2010 г. включительно** в управлении коммунальной собственности и приватизации горисполкома по адресу: ул. Советская, 21а (каб. № 4).

Заключительная регистрация участников аукциона с 14.00 до 14.45 в день аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 21а, каб. № 4.

Контактные телефоны: 77 69 35, 77 67 27, факс: 77 48 85.

Наш сайт – www. gorod.gomel.by.

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.

Адказная за выпуск Наталля КАРПЕНКА.

Грамадскі савет: **НАВІЦКІ Г.В.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **БАЙКОЎ В.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **ПРЭДКА С.У.**, старшыня Ваўкавыскага раённага Савета дэпутатаў Гродзенскай вобласці; **МАКСІМЕНКА С.А.**, дэпутат Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Мінскай вобласці

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 21 03;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 33.310. Нумар падпісаны ў 19.30.

Краіна здароўя
Выпуск № 32 (201)

Прамая лінія

ЛЕПШ ПАДРЫХТУЕШСЯ — ДАЎЖЭЙ ПАЖЫВЕШ

Святлана БАРЫСЕНКА, Вольга ШАЎКО.

На вашы пытанні адказала дацэнт кафедры гераналогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі кандыдат медыцынскіх навук Любоў ВАРОНІНА.

(Працяг. Пачатак у нумарах за 6, 7 ліпеня.)

☎ — Крупскі раён, Алена. Бацьку 69 гадоў. Пакутуе ад болю ў каленях. Купляе нейкія мазі. Крыху дапамагае. Але мазі для суставаў не танныя. Можа, вы падкажаце, якія з тых, што ёсць на рынку найбольш эфектыўныя?

— Можна набываць мазі з шабельнікам. Яшчэ траву шабельніку настойваюць на гарэлцы і п'юць па 20—30 мл у дзень. У такіх выпадках добра падыходзіць фізіятэрапія — напрыклад, электрафарэз з гідракартызонам. Добра падыходзіць і грязелячэнне, якое праводзіцца ў шэрагу беларускіх санаторыяў, а ў Мінску — у Рэспубліканскім цэнтры медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння на вул. Макаёнка.

— Бацька лічыць, што боль — ад адкладання соляў. А як падобны боль называецца правільна?

— Гэты стан называецца астэаартрытам або астэаартрозам. Скаргі могуць быць падобнымі пры такіх болях, пра якія вы кажаце. Але ў вашага бацькі можа быць і кіста, таму каб выключыць гэта, трэба рабіць ультрагук сустава. Што да артрыту, то гэта — запаленне з ацёкам, артроз — дэструктыўныя змяненні храстка. Пры артрыце прапісваюць хондрапратэктары. У вострай стадыі гэтага захворвання ні фізіяпрацэдуры, ні грязелячэнне не прызначаюцца, каб не актывізаваць працэс. Для таго, каб высветліць прычыну болю ў каленях у вашага бацькі, трэба паказацца хоць бы тэрапеўту па месцы жыхарства.

Артрозы цяпер моцна памаладзелі. Выказваюцца толькі меркаванні адносна таго, чаму гэта адбываецца. Можа, людзі сталі менш рухацца, можа, паўплываў лад харчавання.

☎ — Ваўкавыск, Тамара Іосіфаўна. Раніцай немагчыма расплюшчыць вочы, яны запаляюцца, гнояцца. Ці можна купіць якія-небудзь кроплі, каб пазбавіцца гэтага стану?

— Што да запалення, то трэба паказацца афтальмолагу, які прызначыць лячэнне. Што да кроплей, то ў аптэках іх вялікі выбар. Самастойна падбіраць не варта.

— Ашмяны, Вольга Валер'еўна. Маёй маці 71 год. Скардзіцца на шум у галаве. Дзе лепш абследавацца?

— У даволі вялікай колькасці людзей з узростам з'яўляецца адчуванне шуму ў галаве. Гэта сведчыць пра атэрасклератычныя змены сасудаў галаўнога мозга. Вам трэба звярнуцца да тэрапеўта, каб той прызначыў прэпараты для паляпшэння мікрацыркуляцыі крыві. Гэта прэпараты кшталту эмаксіпіну, актавегіну, пентаксіфіліну. Лепш за ўсё пракапаць іх у стацыянары.

— Яшчэ ў маці варыкоз. Яна прыкладае нейкія травы, але сур'ёзнага нічога не робіць. Да якога спецыяліста трэба звярнуцца? Ці трэба ёй купляць кампрэсійныя панчохі?

— Калі варыкоз умераны, то насіць кампрэсійныя панчохі можна. Адначасова можна карыстацца такой маззю, як траксевазін, гепарынавай маззю, якія прадухіляюць згусанне крыві. А калі ўжо з'явіліся вялікія тромбы, і яны пацвярджаны на ўльтрагукавым апараце, то тут патрабуецца хірургічнае лячэнне. У любым выпадку праблемай трэба займацца. Дарэчы, пры такіх паталогіях, якія ёсць у вашай маці, — шуме ў галаве, варыкозе — вельмі добра падыходзіць лячэнне п'яўкамі, гірудатэрапія. Яна спрыяе разбаўленню крыві.

☎ — Гродзенская вобласць, Аксана Міхайлаўна. Унуку 15 гадоў. На працягу года ў яго былі тры пераломы — ключыцы, рукі і нагі. Захапляецца футболам. Ці можа гэта з цягам часу пагражаць нейкімі праблемамі?

— З улікам захалення вашага ўнука можна сказаць, што ў яго — высокі ўзровень траўмаў. Наогул, можна меркаваць, што ваш унук вельмі хутка расце...

— Так і ёсць.

— Ідзе фарміраванне коснай тканкі, а кальцыю не хапае. Пік фарміравання коснай масы будзе дасягнуты толькі да 20—25 гадоў. Да таго часу вельмі важна, каб унук еў паболей тварагу, цвёрдыя сыры. Важна і тое, наколькі добра працуе ў яго кішэчнік, ці няма запораў, паколькі кальцый засвойваецца ў кішэчніку. У ідэале засвойваецца толькі працэнтаў трыццаць ад таго, што мы атрымліваем з ежай, а калі яшчэ кішэчнік дрэнна працуе... Можна двойчы ў год прапіваць курс прэпаратаў з утрыманнем кальцыю. Не думаю, што пераломы, пра якія вы кажаце, праявяцца нейкімі праблемамі ў будучыні.

— Яшчэ я недзе чытала, што паміж запорамі і высокім халестэрынам можа быць сувязь...

— Можа быць. У людзей з рэгулярным стулам, у тых, хто ўжывае шмат клятчаткі, узровень халестэрыну, як правіла, нармальны, калі, вядома, няма нейкіх жудасных стрэсавых сітуацый. Чым больш мы ўжываем клятчаткі, тым больш халестэрыну звязваецца і выводзіцца з арганізма.

— Год таму ў мяне халестэрын быў 6,0 ммоль/л. Урач кажа, што гэта само па сабе не паказальна... А якая лічба будзе паказальнай?

— Сапраўды, гэта лічба сама па сабе ні пра што не сведчыць. Трэба ведаць вашы ліпапратэіды высокай і нізкай шчыльнасці, якіх з іх больш. Халестэрын жа ў нашым арганізме ўсё адно ўтвараецца, паколькі без яго не ўтвараюцца гармоны і не можа адбывацца яшчэ шэраг важных працэсаў. Важна, колькі шкодных, таксічных тлустых кіслот выводзіцца з арганізма. Таму мы і кажам, што важны не халестэрын сам па сабе, а ці займаецеся вы спортам, ці ўжываеце шмат клятчаткі, садавіны і агародніны.

— Ці патрэбна пры гастраэзафагеальным рэфлюксе строгая дыета?

— Калі ў вас ёсць ГЭРХ, то вядома, што з узростам павышаецца рызыка развіцця раку скуры і раку кішэчніка. Таму рэкамендуецца засцерагацца ад празмернай інсаляцыі. Загараць трэба раніцай і вечарам. Акрамя таго, варта як мага больш піць вады, пазбягаць у харчаванні мяса і рыбы, бо бялковая ежа дае дадатковую нагрузку на кішэчнік, паболей ужываць садавіны і агародніны. Адпачываць лепш восенню і зімой, калі паўднёвы клімат больш мяккі.

☎ — Гомель, Мікалай. Мне 62 гады. Апошнім часам пачаў рэзка зніжацца слых. Магчыма, гэта ўзроставае? Што зрабіць, каб прыпыніць гэты працэс?

— Зніжэнне слыху далёка не заўсёды звязана з узростам. Прычыны могуць быць розныя. Напрыклад, прафесійная шкоднасць, нейкія сасудзістыя змены, цукровы дыябет. У любым выпадку вам трэба абследавацца. А для гэтага звярніцеся да свайго лор-урача па месцы жыхарства.

☎ — Чэрыкаў, Іна. Скажыце, ці існуюць супрацьпаказанні для лячэння з дапамогай іголкатэрапіі?

— Так, такія супрацьпаказанні існуюць. Да іх адносяцца пухлінныя працэсы і вострае парушэнне псіхікі.

☎ — Мінск, Іван Пятровіч. Мне 32 гады. Дзесяць гадоў пакутую ад псарыязу. Чуў, што гэты дыягназ — на ўсё жыццё. Ці можна паменшыць наступствы хваробы з дапамогай траў?

— Псарыяз — вельмі сур'ёзнае захворванне. І сапраўды, у вельмі многіх пацыентаў ён застаецца на ўсё жыццё. Своеасаблівасць гэтай хваробы заключаецца ў тым, што ў яе могуць быць спантанныя рэмісіі. І незразумела, з чым гэта звязана.

Часам пры псарыязе могуць дапамагчы адмысловыя зборы з траў. Бывае, наступствы хваробы памяншае іголкатэрапія. А некаму дапамагае псіхатэрапія і гіпноз. Трэба падбіраць лячэнне з дапамогай спецыялістаў.

☎ — Маладзечна, Галіна, 35 гадоў. У мяне пастаянны боль у каленях пры хадзе. З чым гэта можа быць звязана і да якога спецыяліста трэба звяртацца?

— Спачатку трэба звярнуцца да тэрапеўта для таго, каб выключыць нейкую рэўмапаталогію. А потым зрабіць ультрагукавое даследаванне каленных суставаў.

☎ — Ашмяны, Іван Пятровіч. Нядаўна ўрачы ў мяне знайшлі камяні ў жоўцевым пузыры. Прапануюць шпіталізацыю і нават аперацыю. А ці можна пазбегнуць гэтага? Магчыма, дапамогуць нейкія народныя сродкі?

— Усё залежыць ад памеру камянёў, іх колькасці. Калі камяні вялікія, іх будзе складана растварыць, практычна немагчыма. Дробныя ж камяні — 3—7 мм — растварыць можна з дапамогай працяглага прыёму урсадэзаксіолевай кіслаты. Але ёсць рызыка, што яны заб'юць жоўцевы праток, і гэта прывядзе да вострай хірургічнай сітуацыі. Народныя ж сродкі, розныя травяныя настоі могуць змяніць склад жоўці, але зноў-такі, усё тут залежыць ад тыпу камянёў. У любым выпадку з кожным пацыентам трэба разбірацца індывідуальна. Паколькі ў вашым выпадку прапанавана аперацыя, значыць, да яе ёсць паказанні.

(Заканчэнне будзе.)

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Эпіднагляд

СВЕРБ КУПАЛЬШЧЫКА МОЖНА ПАПЯРЭДЗІЦЬ

Як правіла, летам да некалькі соцень чалавек звяртаюцца ў медыцынскія ўстановы са скаргамі на чырвоныя пухіры, якія з'явіліся пасля купання ў вадаёме і свярбяць. Так праяўляе сябе паразітарнае захворванне цыркарыёз. Хвароба выклікаецца лічынкамі некаторых відаў глістоў (цыркарыяў) вадаплаўных птушак. Крыніцай іх могуць быць і малюскі.

Праявы цыркарыёзу наступаюць на працягу першай паўгадзіны. Там, куды трапілі цыркарыі, скура чырванее, адчуваецца паколванне, сверб. Праз некалькі гадзін з'яўляецца высыпка, пухіры памерам з гарошыну, можа таксама ўзнікнуць слабасць, галавакружэнне, парушэнне сну, павышаецца тэмпература, часам бывае сухі кашаль. Праз 7—10 сутак клінічныя праявы аслабнуць, а пігментацыя на месцы высыпкі і лёгкі сверб застаюцца яшчэ два—тры тыдні. Абвастрэнні ці ўскладненні могуць наступіць у сувязі з паўторнымі заражэннямі. Пры наяўнасці лёгачнага сіндрому захворванне працякае больш цяжка і патрабуе ўрачэбнага ўмяшання.

Зоны павышанай рызыкі — стаячыя вадаёмы, забруджаныя арганічнымі і бытавымі адходамі, з вялікай воднай расліннасцю, дзе водзяцца рачныя смаўжы і па паверхні якіх плаваюць птушкі.

Некалькі гадоў таму неспрыяльным па гэтым захворванні з'яўлялася возера Нарач. Тады была прынятая дзяржаўная праграма «Экалагічнае аздараўленне возера Нарач на 2005—2008 гады». Як адзначыў **урач-паразітолаг Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Андрэй ВЕДЗЯНЬКОЎ**, выкананне праграмы і комплексная барацьба з цыркарыёзам на Нарачы далі свой плён: колькасць людзей, якія звярнуліся да медыкаў з алергіяй пасля купання, скарацілася ў 7 разоў.

Аднак гаварыць пра тое, што цыркарыёзу на Нарачы і ў іншых вадаёмах рэспублікі ўвогуле не будзе, нельга. Справа ў тым, што ад кожнага заражанага малюска на працягу яго жыцця на свет з'яўляюцца тысячы лічынак. А гэта вялікая верагоднасць таго, што купальшчык зможа сустрэцца ў вадзе з новымі носьбітамі цыркарыяў. Таму не варта грэбаваць пэўнымі мерамі перасцярогі.

==> Пры купанні, мыцці бялізны, гульнях у вадзе, рыбнай лоўлі трэба пазбягаць зарослых, мелкаводных участкаў.

==> Купацца трэба толькі на спецыяльна абсталяваных пляжах, рыбу лавіць больш бяспечна з берага, лодкі, моста.

==> Не варта рабіць заплывы ў месцах, дзе водзяцца рачныя смаўжы, і там, дзе адпачывальнікі падкормліваюць вадаплаўных птушак.

==> У вадзе трэба знаходзіцца не больш за 5-10 хвілін.

==> Пасля купання ў падазроным вадаёме неабходна старанна выцерці скуру ручніком і хутка змяніць адзенне, якое прамокла.

==> Калі вы пахадзілі басанож па мелкаводдзі ці па мокрай траве ля рэчкі, варта інтэнсіўна выціраць ногі праз кожныя 2-3 хвіліны: цыркарыі пранікаюць у эпідэрміс на працягу 3-4 хвілін, і іх можна паспрабаваць выдаліць механічна.

==> Пры неабходнасці працяглага знаходжання ў вадзе (напрыклад, работа ў сажалкавых гаспадарках і інш.) абавязкова прымяняць ахоўнае адзенне і абутак.

==> Варта выкарыстоўваць рэпеленты (дыметылфталат, дыэтылталуамід і інш.) або прыгатаваныя на іх аснове крэмы і мазі. Гэтыя сродкі, нанесеныя на скуру, прыкладна на працягу 1,5-2 гадзін засцерагаюць ад лічынак цыркарыяў.

Тым жа, каму не ўдалося пазбегнуць цыркарыёзнага дэрматыту, пазбавіцца ад свербу дапамогуць ментоловыя і дымедроловыя мазі, в'етнамскі бальзам, прамыванне содавым растворам. У цяжкіх выпадках трэба абавязкова звяртацца да ўрача.

Вольга ШАЎКО.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
г. п. Парычы.

МАЛАКО ДЛЯ ДЗІЦЯЧАГА ХАРЧАВАННЯ — ТОЛЬКІ СА СПЕЦЫЯЛЬНЫХ ФЕРМАЎ

Новыя дзяржаўныя стандарты на дзіцячы кефір і дзіцячае стэрылізаванае малако ўведзены ў дзеянне з 1 ліпеня. Яны распаўсюджваюцца на прадукты, прызначаныя для харчавання дзяцей першага года жыцця ў якасці прыкорму, пачынаючы з васьмі-, дзевяцімесячнага ўзросту, а таксама для непасрэднага выкарыстання ў ежу для дзяцей ва ўзросце ад 1 да 3 гадоў.

Для вырабу дзіцячых кефіру і стэрылізаванага малака, згодна з новымі стандартамі, павінна выкарыстоўвацца малако толькі гатунку «экстра» і вышэйшага гатунку. Пры гэтым малако адбіраецца на спецыяльных фермах, да якіх прад'яўляюцца павышаныя патрабаванні па санітарным стане, здароўю кароў, якасці іх кармлення, якасці атрыманага ад іх малака. Важна адзначыць, што стандарты не прадугледжваюць выкарыстання любога віду прадуктаў расліннага паходжання.

Разам з патрабаваннямі да якасці сыравіны дапоўнены пералік паказчыкаў бяспекі, што нарміруюцца. Установленыя патрабаванні мэтанакіравана адаптаваныя для дзіцячага харчавання ў залежнасці ад узроставай групы. Напрыклад, для прадуктаў харчавання для дзяцей ранняга ўзросту строга абмежавана ўтрыманне бялку і кальцыю, паколькі павышанае ўтрыманне гэтых элементаў у прадукцыі можа аказаць адмоўны ўплыў на арганізм дзіцяці.

Стандартамі прадугледжаны выраб прадуктаў наступных відаў тлустасці: 2,8, 3,2 і 3,5 працэнта. Акрамя таго, у стандартах пашыраны асартымент дзіцячага кефіру і дзіцячага стэрылізаванага малака. Так, кефір можа выпрацоўвацца двух відаў: дзіцячы кефір і дзіцячы ўзбагачаны кефір, які, у сваю чаргу, можа вырабляцца з вітамінамі С, В1, РР. Дзіцячы кефір можа быць узбагачаны чыстымі жывымі культурамі біфідабактэрый. У гэтым выпадку прадукт будзе мець найменне біякефіру дзіцячага. Такі прадукт таксама можа ўтрымліваць вітаміны С, В1, РР. Асартымент дзіцячага стэрылізаванага малака ўключае: малако дзіцячае стэрылізаванае; з вітамінам С; з вітамінам А; з вітамінамі А, С, D; з вітамінамі С, В1, РР; з лактулозай.

Прадукты ўпакоўваюцца ў спажывецкую тару з аплікатарам «саломка» ці без яго намінальным аб'ёмам не больш за 250 мл. Памер фасаванай прадукцыі звязаны з тым, што для дзіцяці дастаткова такой колькасці прадукту для разавага ўжывання ў ежу, тым больш што пасля ўскрыцця ўпакоўкі прадукт захоўванню не падлягае. Для прадукцыі ўстаноўлены наступныя тэрміны прыдатнасці: дзіцячы кефір — 72 гадзіны, дзіцячае стэрылізаванае малако — 20 сутак.

Рэкамендавана таксама ўказваць утрыманне вітамінаў у прадукце, узбагачаным вітамінамі, не толькі ў абсалютных велічынях мг, але і ў працэнтах ад іх рэкамендаванага сутачнага спажывання для дзяцей ва ўзросце ад 1 да 3 гадоў.

Зараз у РУП «Інстытут мяса-малочнай прамысловасці» знаходзяцца ў распрацоўцы стандарты на такія прадукты дзіцячага харчавання як мясныя паўфабрыкаты і мясараслінныя пасечаныя, каўбасныя вараныя вырабы і іншыя. Упершыню распрацоўваецца стандарт, які ўстанаўлівае спецыяльныя патрабаванні да ялавічыны і цяляціны для вытворчасці прадуктаў для дзяцей.

Сяргей РАСОЛЬКА.

8 ліпеня — Дзень прафілактыкі алкагалізму

СУШЫЦЕ ЧАРКІ, або Каму не варта лезці ў бутэльку?

Гадоў сто таму ў Беларусі не было наркалагічнай службы, не вялася статыстыка ўжывання алкаголю. Таму немагчыма дакладна сказаць, як менавіта ўзаемадзейнічалі са спіртным нашы продкі. Тым не менш, знаўцы мяркуюць, што лепш, чым цяпер. Сёння мы разлічваем гадавую колькасць алкаголю, што прыпадае на аднаго жыхара. Паказчык гэты роўны 12 літрам. Або 14 — на кожнага дарослага. Чаму спецыялісты называюць гэту лічбу страшнай? Вось што думае пра гэта загадчык кафедры псіхіятрыі і наркалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Раман ЕЎСЯГНЕЕЎ.

— Колькасць алкаголю, які прыпадае на душу насельніцтва ў год — паказчык аб'ектыўны. Яго можна дакладна пралічыць. Прычым як у дачыненні да алкаголю, які прадаецца легальна, так і ў дачыненні да алкагольных напояў, прыгатаваных у хатніх умовах. 12 літраў на душу насельніцтва — гэта насамрэч дрэнна і страшна. Замежныя даследчыкі ўстанавілі, што крытычнымі з'яўляюцца 8 літраў алкаголю на душу насельніцтва ў год.

— Гэта лічба з'яўляецца крытычнай для канкрэтнага чалавека, для нацыі?

— І для чалавека, і для нацыі. Пакуль норма не перавышаецца, не наступаюць шкодныя наступствы, звязаныя ў першую чаргу з псіхічным, фізічным і сацыяльным здароўем людзей.

— Алкаголь можна ўжываць без шкодных наступстваў?

— Дастаткова не выходзіць за пэўныя межы. Вызначаюцца яны адной дозай, роўнай 10 мл 100-працэнтнага алкаголю. Гэта 25 г — адна чарка гарэлкі, або кан'яку, або віскі, 150-200 г (у залежнасці ад крэпасці) віна, 300 г піва. Бяспечнае ўжыванне алкаголю абмежаванае 20 дозамі на тыдні для мужчын і 12 дозамі для жанчын. Пры гэтым за адну выпіўку нельга ўжываць звыш 5 доз. Два дні на тыдні павінны быць поўнасцю свабоднымі ад алкаголю. Нельга дапускаць цяжкіх ап'яненняў. Такія нормы павінны мець на ўвазе здароўя, уладкаваныя людзі. Аднак існуе катэгорыя людзей, для якіх усё вышэйсказанае не актуальна — ім проста наогул нельга ўжываць алкаголь.

— Сотні тысяч людзей у нашай краіне ні ў якія нормы не ўкладваюцца і ніякіх правілаў піцця не прытрымліваюцца. Чым гэта пагражае не толькі ім самім, але і нацыі ў цэлым?

— Нават тыя страты, што можна падлічыць, нашмат перавышаюць любы даход ад продажу алкаголю па любым кошце. Гэта аксіёма для любой краіны. Іншая рэч, даход атрымліваецца адразу, а расходы размяркоўваюцца паступова і па многіх ведамствах... Тым не менш, для грамадства адназначна ў разы больш выгадна, калі людзі не п'юць алкаголь наогул. Пра гэта сведчаць нават прыблізныя падлікі страт. Узяць хоць бы той жа траўматызм. 23 працэнты жыхароў сталіцы з траўмамі атрымалі іх у стане алкагольнага ап'янення. Пераломы рукі, галёнкі, сцягна і г.д. — гэта некалькі месяцаў бальнічнага. Вось і лічыце... А ёсць жа яшчэ злачынствы, учыненыя ў алкагольным стане. Вядома, што да 70 працэнтаў самазабойстваў здзяйсняюцца ў гэтым жа стане. 70 працэнтаў тых, хто патануў, таксама былі «пад градусам». Злоўжыванне алкаголем хаваецца і ў падмурку шэрагу хранічных хвароб — такіх, як гіпертанія, язвавая хвароба страўніка, гепатыт і г.д. Пералік шкодных аспектаў, з якімі ў рэшце рэшт вымушана змагацца грамадства, можна працягваць...

— Алкагольная залежнасць адбіваецца і на нашчадках...

— Ужо не адно стагоддзе вядома, што ў жанчын, якія выпіваюць падчас цяжарнасці і грудного кармлення, значна радзей дзеці бываюць здаровымі, без фізічных і псіхічных дэфектаў. Вылучаюць нават асобную паталогію — алкагольны сіндром плода, або прыроджаную выродлівасць, звязаную са злоўжываннем алкаголем цяжарнай жанчынай.

Стэрылізаваць хворых на алкагалізм — не выйсце. Па-першае, гэта немагчыма па агульначалавечых, маральных паняццях. Па-другое, бессэнсоўна, паколькі няма аднаго канкрэтнага гена, які адказваў бы за развіццё алкагалізму... Пытанне абмежавання нараджальнасці сярод пітушчых людзей узнікае ў грамадстве з-за іх менш адказных сэксуальных паводзінаў. Людзі разумныя, з добрай генетыкай больш сур'ёзна ставяцца да сваіх рэпрадуктыўных паводзінаў і таму ступень пладавітасці ў іх больш нізкая. Выйсце тут адно: зніжаць узровень спажывання спіртнога. І адначасова прывіваць людзям пачуццё адказнасці за свае ўчынкі, у тым ліку за народжаных дзяцей.

— Алкагольнага гена няма, але ж схільнасць да алкагольнай залежнасці перадаецца ў спадчыну?

— Сапраўды, перадавацца можа толькі схільнасць, а не сама хвароба. Тут як і з шэрагам іншых захворванняў — той жа гіпертаніяй, цукровым дыябетам... Яны не перадаюцца адным канкрэтным генам, толькі спалучэнне шэрагу генаў робіць чалавека схільным да развіцця паталогіі. Рэалізацыя любой схільнасці залежыць у першую чаргу ад ладу жыцця чалавека. Генетычная схільнасць — не фатальная.

— Вы сказалі, што ёсць людзі, якім нельга ўжываць алкаголь нават у меру...

— Калі сярод сваякоў першай ступені сваяцтва, а гэта маці, бацька, родныя браты і сёстры, ёсць людзі, якія пакутуюць ад алкагольнай залежнасці, то рызыка развіцця алкагольнай залежнасці ўзрастае ў 4-5 разоў. Менавіта для такіх людзей не існуе ніякіх бяспечных дозаў, ніякай нормы ўжывання алкаголю, ім проста нельга піць! Сярод сотні звычайных людзей, якія ўжываюць алкаголь, на алкагалізм захварэюць 5 чалавек, а сярод тых, у каго пілі сваякі, — 20-25 працэнтаў. Таму ж, у каго двое ці больш сваякоў мелі праблемы з алкаголем, не варта нават каштаваць алкаголь. Дарэчы, у краінах з добра інфармаваным насельніцтвам ёсць людзі, якія ніколі не каштавалі алкаголь. Яны ўслых называюць сябе біялагічнымі алкаголікамі...

— З пункту гледжання псіхалогіі, залежнасці ад тытуню, алкаголю, азартных гульняў, шопінгу, тэлевізара і г.д. павінны быць вельмі падобнымі...

— Шмат падобнага паміж імі і ў біялагічным сэнсе, ва ўплыве на работу галаўнога мозга. А вось па наступствах залежнасці, безумоўна, адрозніваюцца. Азартная гульня можа прывесці да жабрацтва, але не да гепатыту. Наогул хімічныя залежнасці прыводзяць да цялесных, псіхалагічных і сацыяльных наступстваў, нехімічныя часцей звязаны з наступствамі псіхалагічнага, псіхічнага і сацыяльнага кшталту. Так што пры лячэнні розных залежнасцяў могуць прымяняцца падобныя метады лячэння.

— Што вельмі важна ўсведамляць адносна гэтых наступстваў алкаголікам і іх сваякам?

— Небяспеку. Любы нарколаг на прыёме можа патлумачыць, што калі алкаголь будзе ўжывацца ў такім тэмпе, то праз два гады ў чалавека з'явіцца вось такая праблема, праз пяць — вось такая і г.д. З целам адбудзецца вось гэта і гэта, з псіхікай — вось гэта, у сацыяльным сэнсе будзе страта працы і сям'і.

Неабходна ўсведамляць і як зараджаецца згубная залежнасць. Трэба звяртаць увагу на характар ап'янення: чым больш ён адхіляецца ад стандартнага — суправаджаецца неадэкватнымі паводзінамі, стратай памяці, — тым хутчэй чалавек рызыкуе спіцца. Другі важны момант — хуткае ўзнікненне псіхалагічнай залежнасці. Чалавек пачынае шукаць нагоду выпіць, паколькі яму добра толькі ў стане алкагольнага ап'янення. Трэці момант — хуткае павышэнне дозы для дасягнення пэўнага стану. Нават гэтых прыкмет дастаткова, каб улавіць развіццё залежнасці і пачаць з ёю змагацца. Спыняцца лепш за ўсё тады, калі яшчэ не развілася фізічная залежнасць ад задавальнення, які дае алкаголь.

І яшчэ: ніколі не выпівайце ў стане біялагічнага або біяграфічнага крызісу. У першым выпадку маецца на ўвазе гарманальная перабудова падчас палавога выспявання і ў час згасання палавой функцыі — клімактэрычным перыядзе. Пад біяграфічным крызісам варта разумець любыя рэзкія перамены ў жыцці — шлюб, развод, нараджэнне дзіцяці, прафесійны рост, узбагачэнне ці збяднене... Не важна, станоўчы крызіс ці адмоўны. Чарку можна ўзнімаць толькі тады, калі ўсё ўляглося.

— Што самае важнае ў лячэнні алкагольнай залежнасці?

— Разумець, што міма волі самога чалавека вылечыць яго немагчыма. Па-другое, пачаць лячэнне трэба на этапе, калі залежнасць яшчэ не сфарміравалася. Эфектыўных метадаў лячэння алкагалізму пакуль не існуе. І вельмі небяспечна ствараць ілюзіі наконт таго, што ты, шаноўны, сёння пі, а заўтра мы цябе вылечым. Алкагалізм — хранічная хвароба. Чалавек, які пераступіў мяжу насустрач залежнасці, ніколі не вернецца назад. Алкаголік ніколі не будзе піць як здаровы. Ён заўсёды будзе алкаголікам у рэмісіі.

Калі добра і правільна пралячыць сотню залежных ад алкаголю, то рэмісія ад года і болей будзе дасягнутая толькі ў 20-25 працэнтаў. Шматгадовая рэмісія назіраецца ў лічаных хворых з гэтай сотні. Вельмі многае залежыць ад матывацыі. Пакуль чалавек не страціў сям'ю, дзяцей, працу, яму ёсць за што трымацца. Пазней, калі такіх моцных матывацый няма, спробы становяцца безвыніковымі.

— А можна перайсці ў ранг алкаголікаў у рэмісіі без урачэбнай дапамогі?

— Гэта магчыма. Такая рэмісія ў наркалогіі носіць назву спантаннай. Я ведаю людзей, якія без урачэбнай дапамогі жывуць у рэмісіі і 10, і 20 гадоў.

— Наколькі рэальна прыдумаць такі лекавы прэпарат, які б як і алкаголь выклікаў у чалавека эйфарыю, але не выклікаў шкодных наступстваў?

— Тады народзіцца іншая залежнасць — ад гэтага нібыта бяскшоднага лекавага прэпарата. З іншага боку, мы не ў стане паўплываць на работу галаўнога мозга. Рэцэптары мозга адчувальныя да ўсіх біялагічна актыўных рэчываў, якія цыркулююць у крыві. Сярод іншых у нас ёсць і апіятныя рэцэптары, якія дазваляюць чалавеку перажыць задавальненне, — ад фізічнай работы, ежы і г.д. Той, хто ўжывае псіхаактыўныя рэчывы, у тым ліку алкаголь, штучна стымулюе дзейнасць гэтых рэцэптараў.

— А чаму пітушчым людзям патрэбна перажываць штучнае задавальненне?

— Таму што гэта прасцей. Можна, безумоўна, зарабіць мільён долараў, стаць героем, атрымаць Нобелеўскую прэмію, але для гэтага патрэбна шмат гадоў і сілаў. А тут — шклянка гарэлкі. Іншая рэч, гарэлка стварае ілюзію задавальнення, а гэта хутка знікае.

— Што могуць зрабіць бацькі, калі жадаюць сваім дзецям не мець праблем з алкаголем?

— У любым выпадку спрацуе іх асабісты прыклад. Дарэчы, па гэтай прычыне дзеці пітушчых бацькоў часта ўвогуле пазбягаюць алкаголю. Яны нават перабольшваюць яго значэнне. У ідэале бацькі павінны паводзіць сябе адэкватна і не баяцца абмяркоўваць тэму тытуню, алкаголю і наркотыкаў.

Грамадства павінна дэрамантызаваць гэтыя рэчывы. А нашы СМІ ўсё яшчэ паказваюць ліпавых зорак, якія бравіруюць сваімі колішнімі алкагольнымі і наркатычнымі залежнасцямі. Такіх людзей нельга папулярызаваць. Бо адзін выжыў, а пяць ці дзесяць яго сябровў загінулі. Журналістам трэба шукаць нармальных куміраў — разумных, уладкаваных, якія не п'юць, цудоўна сябе адчуваюць і гатовы расказаць пра гэта.

Вытворцы алкаголю, тытуню заўсёды будуць аказваць ціск на тыя ж СМІ, якія рэкламуюць, рамантызуюць такія псіхаактыўныя рэчывы. Людзі ж павінны разумець, што за кошт іх недасведчанасці нехта атрымлівае велізарны даход. Я не стамлюся змагацца з рэкламай таго ж піва... Хоць пра што мы гаворым, калі ў нас адкрыта рэкламуюцца такія прэпараты, як валакардын і карвалол? Юрыдычна гэта тое ж самае, што сказаць «закуры марыхуану — супакой сэрца». Валакардын і карвалол — гэта фенабарбіталы, якія знаходзяцца ў тым жа шэрагу, што і апіяты...

Добра інфармаваны чалавек адназначна больш абаронены ад развіцця залежнасці. Я пытаюся ў сваіх курсантаў: хто выпіваў за апошні месяц? Лес рук. А хто ўводзіў сабе апіяты ўнутрывенна? Ніхто. А чаму? Набыць жа іх таксама нескладана. А проста курсантам добра вядома, што апіяты — гэта хуткая залежнасць, ВІЧ-інфіцыраванне і крыміналізацыя. Вакол алкаголю ж яшчэ шмат рамантыкі і мала праўдзівай інфармацыі...

Святлана БАРЫСЕНКА.

«Базар»-2010

У ПРАДЧУВАННІ СВЯТА

ПАМЯТАЕЦЦА, музычны «базар» у Віцебску адзін вельмі разумны чалавек назваў дачай, куды заўсёды «зоркам» з Масквы, Кіева, Мінска і гэтак далей прыемна прыязджаць і адпачываць ад мітусні і шуму мегаполісаў.
Калі ўжо так, дык сёлета пастаянныя «базарныя дачнікі» правінцыйны гарадок не пазнаюць. Шмат чаго тут зроблена для гэтага.

Фота БЕЛТА.

КАБ ВАДЗІЦЕЛЬ ВЕДАЎ ДЗВЕ МОВЫ

Вядома, класік пісаў пра дзве бяды: дурняў і дарогі. У Віцебску іх таксама дзве: дзе размясціць прыезджых і як накарміць.

— Гасцініцы? Некаторыя нумары ў гатэлях «Віцебск», «Ветразь» і іншых з двухмесных перарабілі ў «адзіночкі». Гэта шыкоўна. Але адпаведна змяншаецца колькасць усіх месцаў. Журналістаў наогул размяшчаем у інтэрнатах, пансіянатах, — расказвае «Звяздзе» нязменны **кіраўнік дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Радзівон БАС**. — І атрымліваем, вядома, нараканні.

Наконт «зорак». Мы, прызнаюся, прапрацоўвалі пытанне аб запрашэнні на сёлетні «базар» «зорак» першай велічыні. Напрыклад, Элтана Джона, які выступаў нядаўна ў Мінску, або Іглесіяса-старэйшага, чаму б ім не паспяваць у Віцебску?

Але нават размовы не было пра тое, што яны будуць жыць у Віцебску. Было б прыкладна так. Прылятае такая «зорка» на сваім самалёце. Спыняецца ў мінскім гатэлі «Еўропа». Раніцай сняданак, — і на самалёт у Віцебск. Тут толькі ў гатэлі памыць рукі, — і на рэпетыцыю, на канцэрт, потым на самалёт і зноў у Мінск — у гатэль.

Сёння, як і раней, у нас няма апартаментаў, якія б адпавядалі высокім патрабаванням. Мы не можам задаволіць ніводзін бытавы райдэр «зорак» першай велічыні.

Хварастоўскі. Зорка? Так! Імпрэсарыа ў яго лонданскія. Але... Дамовіліся! Начаваць ён будзе ў «Лучосе» (афіцыйна мае чатыры «зоркі», але хто быў за мяжой, ведае: нашы гатэльныя «зоркі» адстаюць па ўзроўні ад еўрапейскіх стандартаў — **А.П.**). Машына яму патрэбная вызначанай даўжыні, кіроўца павінен не курыць. Гэта яшчэ што. Для «зорных» іншаземцаў, для параўнання, неабходны вадзіцель, які ведае дзве мовы.

ЯК ПРЫМАДОННЕ РАБІЛІ... ВАДУ

У Віцебск «зоркі» прыязджаюць не толькі з уласнай аховай — іх суправаджаюць кухары, і не толькі.

Пра харчаванне. Раней было больш за дваццаць месцаў: кавярняў, рэстаранаў, дзе кармілі гасцей базару. Зараз каля сарака. Ну і што? Побач з дырэкцыяй адкрылася іх шмат. Але ўзровень, як ні старайся, правінцыйны.

— Што трэба рабіць? — працягвае кіраўнік дырэкцыі «базару». — Лічу, у Віцебску павінны адчыніцца маленькія тры—чатыры гатэлі. Чалавек на дваццаць пастаяльцаў. З добрай кухняй.

Раней замежныя «зоркі» прыязджалі са сваімі кухарамі, вадой, посудам для гатавання. Іх прадстаўнікі прасілі дзве грымёркі ў Летнім амфітэатры для арганізацыі проста на месцы кухні. На машыне ездзілі за агароднінай, якую самі выбіралі. Не каб схадзіць у сталоўку ветэрынарнай акадэміі *(смяецца)*. А цяпер і масквічы ўсё прывозяць. Ваду канкрэтнай маркі, якой у Віцебску няма, гарэлку.

Памятаецца, Пугачова папрасіла ваду без газу. Тады і не ведалі ў віцебскай рэстарацыі, што гэта такое. Персанал знайшоў выйсце з сітуацыі. Узбоўтвалі звычайную газіраваную ваду і... Пугачова ўсё зразумела...

ГРОШЫ ВУЧАЦЦА ЗАРАБЛЯЦЬ

Апошнія дзесяць гадоў фінансаванне фестывалю, паводле слоў кіраўніка дырэкцыі, не мяняецца. 24,5 мільёна расійскіх рублёў выдаткоўваецца з бюджэту саюзнай дзяржавы. Доля Беларусі, дарэчы, больш за 15 мільёнаў расійскіх рублёў. Выдаткоўваюцца грошы і па спецыяльным распараджэнні фестывалю, з улікам інфляцыі. Сёлета — 2,5 мільярда рублёў. Дапамагае фінансамі і Міністэрства культуры...

Але кошт пражывання ў тых жа гатэлях, харчавання, пераезду расце. Віцебску неабходна шукаць дадатковыя крыніцы. Летась жыццё паказала, што не заўсёды можна выйграць, калі, пагнаўшыся за дадатковымі грашыма, павысіць цэны на білеты. Сёлета, нагадаю, кошт білетаў не павысіўся.

У дырэкцыі вучацца зарабляць: арганізуюцца канцэрты, на якія народ дакладна пойдзе (Тота Кутуньё, Стас Міхайлаў, Юрый Антонаў, Алена Ваенга, Райманд Паўлс). А ёсць «зоркі», якім, верагодна, патрэбна трохі адпачыць, каб зноў потым збіраць поўныя залы (некаторыя сольныя канцэрты мінулых гадоў прайшлі са слабым напаўненнем залы ў амфітэатры, дзе больш за 6 тысяч месцаў — **А.П.**).

У ДЫРЭКЦЫІ — «МЕДЫУМЫ»

Бадай, ужо можна смела канстатаваць — навучыліся ў дырэкцыі «базару» прадказваць будучыню. Яшчэ, напрыклад, мінулае Еўрабачанне было ў самым разгары, а віцебская дырэкцыя ўжо вяла перамовы наконт запрашэння ў Віцебск самых яркіх удзельнікаў гэтага конкурсу — канкурэнта «базару».

Канцэрт «зорак» Еўрабачання адбудзецца на плошчы Перамогі. І асобны — Дзімы Білана. За ўваход на плошчу плата сімвалічная.

«Нам дастаткова 15—20 тысяч гледачоў, каб такія канцэрты былі выгаднымі», — падкрэслівае спадар Бас.

А ШТО Ў ГОРАДЗЕ?

Чыгуначны вакзал выглядае цяпер па-еўрапейску. На прывакзальнай плошчы таксама змены — фантан і добраўпарадкаванне. Вось бы і аэрапорт зрабіць такім жа прывабным! Ён жа можа прымаць нават самыя магутныя барты.

Цалкам знешне адноўлены Свята-Успенскі храм. Рака Віцьба, у гонар якой далі імя фестывальнаму гораду, цяпер, пасля паглыблення рэчышча, шырокая і глыбокая. Тут можна пакатацца на лодках і катамаранах.

Плошча Перамогі стала сучаснай. Асфальт памянялі ў фестывальным цэнтры значна раней, чым звычайна. Масты падсвяцілі, як і фасады дамоў у раёне фестывальных падзей. Малюнак для тэлетрансляцыі будзе, як кажуць прафесіяналы, вельмі «смачны».

У сераду ў Летнім амфітэатры адбыўся самы першы «базарны» канцэрт — сольны Юрыя Антонава. Тады ж вызначылі, у якім парадку выступаць будуць юныя выканаўцы на дзіцячым конкурсе «базару»... Віцебск зноў акунуўся ў «базарнае» жыццё! Будзем сачыць за развіццём падзей разам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.



6 ліпеня на Тыдні высокай моды, што праходзіць у Парыжы, сваю новую калекцыю, якая створана выдатным дызайнерам Карлам Лагерфельдам, паказаў знакаміты парыжскі дом моды Chanel. Тыдзень высокай моды ў Парыжы — адно з самых важкіх модных і свецкіх мерапрыемстваў у свеце і з'яўляецца ўнікальным.

На здымку: паказ калекцыі Chanel.

Фота Сіньхуа— БЕЛТА.

«ДЗЕЦІ НЕ ДАЮЦЬ МНЕ СТАРЭЦЬ ДУШОЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пасля службы на караблях Балтыйскага флоту Аркадзь Новік уладкаваўся ў Полацку электраманцёрам. Але яго творчая душа прагнула іншага жыцця. Таму ў вольны час, пакуль іншыя бегалі па танцульках, ён хадзіў па мастацкіх музеях, займаўся ў студыі выяўленчага мастацтва.

— Мне вельмі хацелася атрымаць прафесійную мастацкую адукацыю, таму не раздумваючы паехаў паступаць у Ленінградскае мастацкае вучылішча. Хлопцы і дзяўчаты, якія займаліся са мной у полацкай студыі, на развітанне казалі: «Ты там, у вучылішчы, хоць прыбіральшчыкам застанься, усё даведаешся, а мы налета прыедзем таксама паступаць». Мяне ўзялі на аддзяленне скульптуры, бо я, паводле слоў прыёмнай камісіі, добра адчуваю аб'ём і прапорцыі. Жанрам жа дробнай пластыкі са шкла авалодаў у Ленінградскім вышэйшым мастацкім вучылішчы імя Мухінай, куды жыццё прымусіла (цяжка было вучыцца, грошай пастаянна не хапала) перавесціся на вячэрняе аддзяленне.

— Як правіла, калі нашы людзі з'язджаюць вучыцца, ў вялікія гарады, то ўсялякімі праўдамі і няпраўдамі стараюцца там застацца. У вас, наколькі ведаю, творчы лёс у горадзе на Няве складваўся няблага. Што прывяло ў 84-м годзе ў Барысаў?

— Я патрыёт, выхаваны на творах Янкі Купалы, Якуба Коласа. Таму нядзіўна, што мяне ўвесь час цягнула на радзіму. Уласна Барысаў прывабіў сваім шкляным заводам, камбінатам прыкладнога мастацтва. Думаў прыеду, пакажу свае работы, і папрашу выдзеліць хоць невялічкае памяшканне, дзе я мог бы вучыць маладых людзей вырабляць сувеніры са шкла.

Мара Аркадзя Патапавіча адносна майстэрні, як кажуць, адышла ў нябыт. Не падтрымалі яго ні ў 84-м, ні ў 90-м, пасля таго, як спадара Новіка прынялі ў Беларускі саюз майстроў. Але гэты чалавек не з тых, хто адчайваецца. Працаваў на кухні сваёй аднапакаёўкі. Вентылятараў не было, таму нават у люты мароз апранаў ватоўку і валёнкі і стваraў шкляныя шэдэўры пры адчыненым акне.

— І няўжо вы сваё ўменне так нікому і не перадалі?

— Перадаў, дзякуй Богу. І па сёння працягваюць маю справу Лёня Гадун і Валера Алейнік з Барысава, перадаў свае ўменні і старэйшаму сыну Дзіму, які жыве з сям'ёй у Санкт-Пецярбургу. Прыходзілі вучыцца многія, але ў большасці запал знікаў на паўдарозе. Адным не хапала цярпення, іншыя ж знайшлі больш «грашовы» занятак. Ведаеце, раней за адзін шкляны цюльпан мне плацілі дзевяць рублёў. На гэтыя грошы ў савецкія часы можна было чатыры кілаграмы доктарскай каўбасы набыць. А зараз здаю ў сталічныя салоны ды галерэі свае работы, а атрымліваю капейкі. Няма сёння недахопу ў сувенірах: нашы майстры робяць, з Захаду прывозяць...

«У маім дзяцінстве былі свае шакаладкі»

— Хто так есць мёд, — абурыўся Аркадзь Патапавіч і густа намазаў «вадкае золата» на лусту хлеба. — З мяне бярыце прыклад. Сто гадоў пражывяце *(падміргнуў)*. Ну што, дзеці, усе ў зборы, тады на выхад.

Па дарозе ў Навасады, дзе месціцца лецішча спадара Новіка, мы толькі і паспявалі з кожным вітацца.

— Мяне тут практычна ўсе дачнікі ведаюць. Яны — аматары майго мёду. Любілі і мы, мясцовыя дзеці, мядок майго дзеда Васіля, які ў свой час быў самым знакамітым бондарам у Калінкавіцкім раёне, — узгадвае Аркадзь Патапавіч. — Штовосень, як зараз памятаю, дзед ладзіў свята для дзяцей вёскі. Для гэтага разам з бабуляй Ганнай выносілі на вуліцу стол, вядро з вадой, наразалі хлеб. У апошнюю чаргу ставілі на стол у тазе абрэзкі сотавага мёду і гліняную міску з вадкім мёдам. Мы стаялі побач і з нецярпеннем чакалі, калі дзед дазволіць пачаць ласавацца. Гэта былі нашы шакаладкі, пра сапраўдны шакалад мы ў той час і паняцця не мелі.

Справу свайго настаўніка дзеда Васіля Аркадзь працягнуў, як толькі з'явілася магчымасць. Пачынаў з двух вулляў. Зараз побач з хатай я налічыла ажно 37 пчаліных дамкоў.

«За сваё жыццё я столькі шкляных букетаў нарабіў. Не толькі валошак, але і цюльпанаў, і настурак, і рамонкаў...»

— Так, як мяне дзед вучыў, я навучаю пчаліной справе і свайго малодшага сына. Цяпер у Дзяніса канікулы, дык мы кожны дзень устаём ні свет ні зара і імчым на электрычцы праведаць нашых карміцелак. Крысціна ж, як прынамсі і маці Ірына, якая, дарэчы, працуе ў Барысаве ткачыхай, на лецішчы бывае рэдка, бо пчол баіцца як агню.

На развітанне па традыцыі я папрасіла Аркадзя Новіка падзяліцца сваім сакрэтам жыццялюбства.

— Вось мой сакрэцік, — прамовіў Аркадзь Патапавіч і абняў Крысціну (Дзяніс у гэты час пайшоў набываць білеты). — Кісанька мая, ластаўка. Зараз яна ходзіць у мастацкую школу. Вы ж бачылі, уся кватэра яе малюнкамі завешана. Я не стаў знакамітым мастаком, дык няхай хоць дачка ажыццявіць даўнюю мару бацькі. Энергію і жыццярадаснасць дарылі і дораць разнастайныя захапленні. А старэць душой не даюць дзеці.

З імі і праводзіць практычна ўвесь свой вольны час, катаецца на лыжах, чытае ўслых цікавыя газетныя артыкулы, расказвае цікавыя гісторыі са свайго насычанага падзеямі жыцця, у тым ліку і пра поўнае прыгод ваеннае і пасляваеннае дзяцінства.

Фота аўтара.

Калі я даведалася, што дзяцінства Аркадзя Новіка было азмрочана вайной, проста не магла не папрасіць падзяліцца з чытачамі «Звязды» ўспамінамі...

● «Дзень абвяшчэння вайны чамусьці сцёрся з памяці. Мне тады было сем гадоў. Памятаю толькі радыёпрыёмнік (рупар) дзядзькі Аляксея ля калодзежа. Усе падыходзілі, слухалі, хваляваліся. Дзядзька хутка пайшоў на фронт. А пад Арлом трапіў у палон да немцаў. Падчас пабегу зачапіўся шынялём за калючы дрот і быў забіты ворагамі».

● «У Вялікіх Літвінавічах жыццё цякло сваім ходам. Старшыня калгаса ездзіў па вёсцы на чорным жарабцы (той, быццам бы адчуваў нешта нядобрае, увесь час станавіўся на заднія ногі) і ўгаворваў жанчын ісці жаць жыта. «А калі прыйдуць немцы, рэжце іх сярпамі», — казаў ён. Аднойчы нас з сястрой Валяй як ніколі рана разбудзіла ўстрывожаная маці. Дзядуля Васіль і бабуля Ганна насілі нешта з хаты ў яму ў двары. Здавалася, уся прастора была ахоплена гулам. Калі мы выбеглі на вуліцу, убачылі, як мноства нямецкіх самалётаў ляцелі ў бок Азарычаў. Там яны пачыналі пікіраваць, і адна за адной аддзяляліся чорныя кропкі. Бомбы дасягалі мэты — у неба ляцелі бярвёны, а праз некаторы час раздаваліся выбухі: гук да нас далятаў пазней. Азарычы палалі. Самалёты ж развярнуліся і ляцелі ў наш бок. Прыкладна за паўтара кіламетра ад вёскі, на дарогу, па якой выганялі на пашу кароў, фашысты скінулі некалькі бомбаў. І зніклі з гарызонту. Я пасля разам з хлапчукамі бегаў глядзець варонкі ад бомбаў, у кожнай з якіх магла змясціцца невялікая хата. А што было б з намі, калі б гэтыя бомбы на вёску?

Вайна ўпершыню аказалася так блізка».

● «Па-сапраўднаму адчуць увесь жах яе давялося падчас акупацыі, калі сталі бежанцамі. Памятаю, мы з мамай па чарзе вялі карову, сястра Валя сядзела на калёсах, заваленых нашым адзеннем. Мама ўсю дарогу плакала. Спыніліся на невялікім востраве, дзе сярод соснаў знаходзіўся лагер. Аднойчы мама разам з Валяй пайшла мяняць нашага каня на прадукты ў суседнюю вёску. Я застаўся ў лагеры. Раптам раздаліся стрэлы і ўсе мужчыны кінуліся ўрассыпную ў лес, мне было за імі не ўгнацца. Раптам бачу, наш мужык на драўлянай назе (у Першую сусветную яго ранілі, сваю давялося ампутаваць) цягне за аброць каня. Я падбег да яго. У гэты час з лесу насустрач нам выбеглі двое немцаў. Мужык падняў рукі і сказаў нешта па-нямецку (калі быў у палоне, вывучыў трохі мову). Пасля кароткай размовы немцы пагналі нас перад сабой у бок нашага лагера. Там яны залезлі ў наш курэнь і пачалі выбіраць і запіхваць за пазуху, у кішэні лепшыя маміны шарсцяныя і шаўковыя рэчы. Часам нешта ляцела з шалаша і трапляла ў вогнішча, вуглі якога яшчэ не патухлі. Я забіраў адзенне і тушыў агонь. Забралі самых тоўстых кароў і пайшлі ў бок Азарычаў. На мяне не звярнулі ўвагі... Я пабег у вёску. Бачу, насустрач на вуліцы бяжыць мама і галосіць. Убачыла мяне, абхапіла рукамі, шаптала: «Сыночак, сыночак, ты жывы, ты жывы...» І цяпер час ад часу чую яе словы».

«Самыя смачныя маліны і чорныя парэчкі растуць у таты на лецішчы.»

БЕЛАРУСКІЯ АРТЫСТЫ ГАТОВЫ СКАЗАЦЬ «НЕ» ПЛЮСАВАЙ ФАНАГРАМЕ

Беларускія артысты гатовы сказаць «не» плюсавай фанаграме (гукавому запісу музычнага твора, які змяшчае запіс голасу выканаўцы). Такую заяву яны зрабілі на калегіі Міністэрства культуры, прысвечанай развіццю музычна-эстраднага мастацтва, адказваючы на пытанне міністра культуры Паўла Латушкі, паведамілі ў Мінкульце.

«Я буду змагацца з фанаграмай гарачым жалезам, буду яе выжываць, нашы музыканты павінны прывучацца спяваць ужывую», — падкрэсліў Павел Латушка, растлумачыўшы пры гэтым, што прыкладна 60-70 працэнтаў твораў выконваюцца беларускімі артыстамі менавіта пад плюсавую фанаграму.

Заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева цалкам згадзілася з кіраўніком Міністэрства культуры, адзначыўшы, што, калі спявак не можа працаваць пад мінусавую фанаграму (гукавы запіс музычнага твора, які не змяшчае запісу голасу выканаўцы), значыць, ён наогул не павінен спяваць. «Для гэтага і існуюць розныя прагоны і рэпетыцыі, якія паказваюць майстэрства артыстаў. А той, хто спявае, павінен спяваць», — сказала Ірына Дарафеева.

Сваю думку наконт набалелага «фанаграмнага» пытання выказаў і народны артыст Міхаіл Фінберг. Маэстра сказаў, што айчынным музыкантам трэба вельмі шмат рэпеціраваць, працаваць над сабой і павышаць майстэрства, бо толькі ў гэтым выпадку беларуская эстрада стане прафесійнай.

З заявай Паўла Латушкі згадзіліся і прысутныя на калегіі кіраўнік ансамбля «Сябры» Анатоль Ярмоленка, прадзюсары Віктар Грышанаў і Уладзімір Кубышкін, кампазітары Яўген Алейнік і Алег Елісеенкаў, артысты эстрады Іна Афанасьева, Іскуі Абалян, Аляксей Хлястоў.

БЕЛТА.

ЛЁН БУДЗЕ ПРАВІЦЬ БАЛЬ

У Віцебску пры падтрымцы гарвыканкама ўпершыню адбудзецца маштабны фестываль лёну.

Лён будзе правіць баль на плошчы Перамогі на Дні Беларусі падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

Летась правялі прэзентацыю льнянога фестывалю. Ён вельмі спадабаўся жыхарам і гасцям горада. І цяпер вырашылі зрабіць яго больш маштабным. Яго мэта — папулярызацыя льняной прадукцыі, дэманстрацыя магчымасцяў дызайнераў і вытворцаў Беларусі, якія ствараюць канкурэнтаздольныя вырабы з непаўторным нацыянальным каларытам.

11 ліпеня на плошчы ўвесь дзень будуць праходзіць самыя розныя льняныя акцыі. Адбудзецца дэманстрацыя льнянога адзення для мужчын, жанчын і дзяцей, кірмаш-продаж ільняных вырабаў. Дарэчы, для публікі будзе арганізаваны конкурс на лепшы льняны ўбор. Удзельнікі акцыі створаць сумесную карціну на тэму лёну. А дзеці змогуць паўдзельнічаць у конкурсе малюнкаў.

Арганізуюць і «Льняное застолье»: паказ ільнянога тэкстылю з прэзентацыяй квасу, чаю і салодкіх вырабаў мясцовых вытворцаў.

Свята завершыцца выступленнем моладзевых музычных і танцавальных гуртоў падчас незвычайнага канцэрта «Льняны джаз».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ФРАНСАБАНК FRANSABANK

«Франсабанк»
Открытое акционерное общество
Республика Беларусь,
г. Минск, ул. Татарская, 3

Тел.: (017) 226 62 98,
факс: (017) 203 06 40
office@fransabank.by
www.fransabank.by

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2010 г.
«ФРАНСАБАНК» ОАО
(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	12 220,0	7 991,3
3	Средства в Национальном банке	1102	3 013,2	2 265,4
4	Ценные бумаги:	1103	39 402,5	2 874,1
	для торговли	11031	-	-
	удерживаемые до погашения	11032	-	-
	в наличии для продажи	11033	39 402,5	2 874,1
5	Кредиты и другие средства в банках	1105	38 004,4	21 686,4
6	Кредиты клиентам	1106	63 369,9	37 798,5
7	Долгосрочные финансовые вложения	1107	0,8	0,8
8	Основные средства и нематериальные активы	1108	3 351,2	2 977,5
9	Прочие активы	1109	1 473,3	1 286,3
10	ИТОГО активы	110	160 835,3	76 880,3
11	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
12	Средства Национального банка	1202	-	-
13	Кредиты и другие средства банков	1205	41 391,0	10 556,1
14	Средства клиентов	1206	29 381,8	21 965,0
15	Ценные бумаги, выпущенные банком	1208	-	-
16	Прочие обязательства	1209	1 609,5	821,8
17	ВСЕГО обязательства	120	72 382,3	33 342,9
18	**КАПИТАЛ**			
19	Уставный фонд	1211	67 785,2	31 197,7
20	Эмиссионный доход	1212	-	-
21	Резервный фонд	1213	3 389,3	2 681,9
22	Накопленная прибыль	1214	15 077,8	7 887,2
23	Фонд переоценки статей баланса	1215	2 200,7	1 770,6
24	ВСЕГО капитал	121	88 453,0	43 537,4
25	ИТОГО обязательства и капитал	12	160 835,3	76 880,3
26	**ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ**			
27	Требования	1301	96 466,2	47 782,1
28	Обязательства	1302	41 241,9	4 705,9

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2010 г.
«ФРАНСАБАНК» ОАО
(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2010	01.07.2009
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	9 786,2	3 897,3
2	Процентные расходы	2012	1 698,2	202,0
3	Чистые процентные доходы	201	8 088,0	3 695,3
4	Комиссионные доходы	2021	2 419,3	2 615,4
5	Комиссионные расходы	2022	247,5	88,1
6	Чистые комиссионные доходы	202	2 171,8	2 527,3
7	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	203	2 848,1	8 213,1
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	-	-
9	Доход в форме дивидендов	205	-	-
10	Чистые отчисления в резервы	206	(-332,1)	(-833,9)
11	Прочие доходы	207	671,7	52,4
12	Операционные расходы	208	6 835,3	5 825,2
13	Прочие расходы	209	1 660,4	244,7
14	Налог на прибыль	210	811,9	2 088,8
15	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	4 804,1	7 163,3

Первый заместитель Председателя Правления **Жилинский А.А.**
Зам. Главного бухгалтера **Русакович А.Н.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБРБ № 15 от 29.12.2008 г., УНП 100755021.

Выстава

НІЦЬ ГІСТОРЫІ ЗВЯЗВАЕ ТРАДЫЦЫЯ

«Помніць зямля беларуская» — так названа выстаўка, прысвечаная 65-годдзю вызвалення Беларусі і Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, на якой прадставілі некалькі дзясяткаў сваіх твораў мастакі групы «Традыцыя». Гераіка ўсенароднай барацьбы ў карцінах адлюстравана паводле ўспамінаў блізкіх, тых, хто прайшоў вайну і застаўся жывым, тых, хто нарадзіўся да вайны і быў маленькім, але запомніў эпізоды ліхалецця.

Члены аб'яднання «Традыцыя» ствараюць сваімі творамі летапіс часу. На гэтай выставе чырвонай ніткай праходзіць тэма ўслаўлення воінаў Вялікай Айчыннай вайны і сённяшні дзень воінаў-абаронцаў Радзімы. Кожны з мастакоў выклаў на палатно, акрамя майстэрства і таленту, сваю душу, пачуцці, настрой, каб гэта перадалося гледачам. Бо, як сказана ў біблейскім слове, і ў чалавечым абліччы, і ў рэчах, створаных чалавекам, жыве ісціна.

Твор Мікалая Апіёка «Кветкі пераможцам».

Праз абагульненне вобразаў, значных, эмацыянальных, гледачы ўбачылі гераіку воінаў-вызваліцеляў у творах Мікалая Апіёка, Барыса Аракчэева, Аляксандра Асядоўскага, Уладзіміра Гардзіенкі, Мая Данцыга, Леаніда Дударэнкі, Мікалая Таранды, Уладзіміра Уродніча, Святаслава Федарэнкі і іншых.

Побач з тэмай вайны на выставе паказана радасць мірнага жыцця, праца на зямлі. Імкненне як мага больш дакладна перадаць фарбы навакольнага свету колеравай экспрэсіяй, тонка адчутым станам прыроды назіраецца ў шмат якіх палотнах мастакоў. Чуллівая і непатрабавальная сціпласць самага звычайнага беларускага пейзажу закладзена, напрыклад, у творах Івана Козела, Міхаіла Меранкова. На карцінах Георгія Паплаўскага, Аксаны Аракчэевай можна адзначыць змены ў грамадстве ці ў вобліку Мінска. Шмат якіх мастакоў цікавіць, як мяняецца сам чалавек. Жаданне сказаць пра чалавека, адказаць яму — адзін з галоўных накірункаў у творах беларускіх мастакоў. Ад пільнага жывапіснага апавядання, ад бераўлівай фіксацыі сучаснасці да паэтычных абагульненняў — такі дыяпазон мастацкай мовы, якую абралі тыя, хто звязаў сябе з рэалізмам.

С. Федарэнка «Подзвіг».

Яны розныя, у іх індывідуальныя манеры не толькі па змесце і форме, але часам складанейшыя вобразы пераплятаюцца адзін з другім і ўплываюць адзін на другога. Творчасць мастакоў групы «Традыцыя» ўспрымаецца як цэлае, хоць у кожнага з іх свой шлях, свой творчы свет, почырк у мастацтве. Але на выставе яны дапаўняюць адзін аднаго. Многія з іх з'яўляюцца сябрамі студыі Ваенных мастакоў, але яшчэ стаяць ля вытокаў мастацкай адукацыі ў Беларусі, працуюць выкладчыкамі, рыхтуюць новае пакаленне беларускіх творцаў.

Галія ФАТЫХАВА,
лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне».

ПАЎНОЧНЫ ВЕКТАР ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

9-10 ліпеня ў Ашмянах адбудуцца рэгіянальная выстава «Паўночны вектар Гродзеншчыны» і Міжнародны эканамічны форум «Новыя магчымасці і перспектывы супрацоўніцтва з улікам будаўніцтва атамнай станцыі».

Са сваім патэнцыялам і прапановамі па развіцці гандлёва-эканамічных сувязяў айчынных і замежных партнёраў на выстаўцы азнаёмяць каля сямідзесяці прадпрыемстваў розных формаў уласнасці з Астравецкага, Ашмянскага і Смаргонскага раёнаў. Будуць прадстаўленыя цікавыя праекты ў сферы турызму, энергетыкі, памежнага супрацоўніцтва. Плануецца падпісаць шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве, у прыватнасці, паміж Ашмянскім раёнам і Укмергскім раёнам Літвы і Шамахінскім раёнам Азербайджана.

Мяркуецца, што рэгіянальная выстава «Паўночны вектар Гродзеншчыны» стане традыцыйнай і будзе праводзіцца штогод, па чарзе ў кожным з трох раёнаў.

МЯСЦОВЫ ДАБРАЧЫННЫ ФОНД «ПАЎНОЧНЫЯ АФІНЫ»

пачаў дзейнічаць з мэтай адраджэння помніка архітэктуры «Ансамбль былога палаца Агінскіх» пачатку XIX стагоддзя ў вёсцы Залессе Смаргонскага раёна і ўмацавання творчых сувязяў прыхільнікаў таленту Міхала Клеафаса Агінскага.

Заснавальнікамі фонду (старшыня праўлення — намеснік старшыні камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, моладзевай і сямейнай палітыцы Пётр Южык) сталі Смаргонскі гісторыка-краязнаўчы музей, грамадскае аб'яднанне «Мінскі сталічны саюз прадпрымальнікаў і працадаўцаў» і дзяржаўнае музычнае вучылішча імя М.К. Агінскага (г. Маладзечна). Ён фарміруецца на народныя сродкі, унёскі мецэнатаў і дабрачынцаў. Заснавальнікі фонду будуць удзячныя ўсім, хто адгукнецца прыняць удзел у ягонай працы дзеля вяртання былога значэння культурнага цэнтра «Паўночным Афінам» — так у часы Міхала Клеафаса Агінскага называлася сядзіба ў Залессі, дзе збіраліся выдатныя дзеячы той эпохі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

100-ГАДОВЫ ЮБІЛЕЙ АДЗНАЧЫЛА ЖЫХАРКА КАСТРЫЧНІЦКАГА РАЁНА ТАЦЦЯНА РЫЛЬКОВА

Жыхарка Кастрычніцкага раёна Таццяна Рылькова адзначыла 100-гадовы юбілей. Яе павіншавалі прадстаўнікі раённай адміністрацыі.

Як расказалі карэспандэнту агенцтва «Мінск—Навіны» дочкі доўгажыхаркі, мама ўсё жыццё есць вельмі шмат салодкага. У маладосці яна кілаграмамі паглынала мёд, потым перайшла на цукар: у шклянку гарбаты кладзе 4 чайныя лыжкі цукру, у талерку варанай капусты або баршчу — 1 сталовую лыжку, шчодра пасыпае цукрам любую салату з агародніны і нават селядзец. Пры гэтым у бабулі няма ні цукровага дыябету, ні халестэрынавых бляшак, ні ўвогуле якіх-небудзь праблем з сасудамі. Праўда, яна ўжо практычна не чуе.

Таццяна Рылькова ходзіць на прагулкі і да гэтай пары сама прыбірае пакой. Працавала Таццяна Фамінічна да 80 гадоў — спачатку ў калгасе, потым у ваенізаванай ахове. Яна так і не навучылася ні чытаць, ні пісаць.

Ніна ЯНОВІЧ, «Мінск—Навіны».

АЛЕЯ СЛАВЫ ГЕРОЯЎ З'ЯВІЛАСЯ Ў КРУПКАХ

Яе адкрылі падчас святкавання Дня Незалежнасці Беларусі.

— Чалавечая памяць — катэгорыя вечная. Яна робіць нас народам, а нашу краіну — Радзімай, — адзначыў старшыня Крупскага райвыканкама М. Амельянчук. — Стварэнне Алеі Славы з'яўляецца данінай памяці і павагі тым, хтоваяваў і аддаваў жыццё дзеля Вялікай Перамогі і нашай будучыні. Алея Славы стане яшчэ адным святым месцам, куды ўдзячныя крупчане змогуць прыйсці, каб пакланіцца вялікаму подзвігу землякоў.

Ідэя стварэння Алеі Славы выходзіла ад супрацоўнікаў раённага гісторыка-краязнаўчага музея, яе падтрымала мясцовае кіраўніцтва. І як вынік — на тэрыторыі музея ўстаноўлены знакі 20 зорным землякам, якія назаўсёды будуць у адным страі з намі, іх нашчадкамі. Сярод славутых нашых сучаснікаў — двойчы Герой Савецкага Саюза, лётчык-касманаўт, Ганаровы грамадзянін Крупскага раёна і Мінскай вобласці Уладзімір Васільевіч Кавалёнак, які да свята даслаў тэлеграму і павіншаваў сваіх землякоў з Днём Рэспублікі.

Ганна КАЛАДЗІНСКАЯ.

ЧЫГУНКА — «СЛАВЯНСКАМУ БАЗАРУ»

У перыяд правядзення «Славянскага базару-2010» у Віцебску ў расклад руху прызначаецца пасажырскі цягнік №110/109 Мінск — Віцебск, які будзе адпраўляцца з Мінска па 16 ліпеня, з Віцебска — па 17 ліпеня ўключна.

Як удакладнілі «Звяздзе» ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгункі, пасажырскі цягнік №110 Мінск — Віцебск 9, 12, 15 ліпеня будзе адпраўляцца са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 13.40 (Орша-Цэнтральная — 15.48-15.49), прыбываць на станцыю Віцебск у 17.10. Гэты ж цягнік 10, 11, 13, 14, 16 ліпеня будзе адпраўляцца са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 12.02 (Орша-Цэнтральная — 14.10-14.11), прыбываць на станцыю Віцебск у 15.32.

У цягніка №109 Віцебск — Мінск з 8 па 17 ліпеня будзе наступны расклад руху: адпраўленне са станцыі Віцебск у 1.10 (Орша-Цэнтральная — 2.27-2.40; Талачын — 3.15-3.17; Барысаў — 4.20-4.22), прыбыццё на станцыю Мінск-Пасажырскі ў 5.32.

Сяргей РАСОЛЬКА.

НЕЛЕГАЛЬНЫЯ СТАНКІ КОШТАМ У 798 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ

былі выяўленыя супрацоўнікамі Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Магілёўскай вобласці ў складскім памяшканні, якое арандуе сумеснае таварыства з абмежаванай адказнасцю ў магілёўскага прыватнага ўнітарнага таварыства.

Паводле звестак начальніка арганізацыйна-інспектарскага аддзела УДФР КДК Беларусі па Магілёўскай вобласці Аляксандра Шаройкіна, знойдзеныя два безгаспадарчыя такарныя станкі швейцарскай вытворчасці, прызначаныя для вытворчасці дэталяў і агрэгатаў для кормаўборачных камбайнаў і велікагрузнай тэхнікі. Абсталяванне знаходзілася ў працоўным стане і, як мяркуецца, яно выкарыстоўвалася для вытворчасці нелегальных запчастак. Пры тым ні арандатар, ні ўласнік склада не паказалі рэвізорам дакументаў, якія б пацвярджалі легальнасць набыцця станкоў і законнасць іх знаходжання на складзе. Такарныя станкі апісаныя, а матэрыялы праверкі накіраваныя ў суд для прынятця рашэння аб прызнанні маёмасці безгаспадарчай і абарачэнні яе ў даход дзяржавы.

Ігар ГРЫШЫН.

СКРАЛІ АЎТО І, ЛІЧЫ, ВЯРНУЛІ!

У Полацку асуджаны два злодзеі, якія скралі «Жыгулі» восьмай мадэлі, што не былі абсталяваныя сігналізацыяй.

Быццам бы звычайны факт пакарання за учыненае злачынства? Але неардынарнасць гісторыі ўгону аўто ў тым, што два 22-гадовыя аматары пакатацца на чужым аўто апынуліся ў нечаканай для іх сітуацыі. У нецвярозым стане доўга каталіся па горадзе, а потым вырашылі разабраць машыну за горадам і прадаць на запчасткі. Паехалі ў вёску Багатырскае, дзе хацелі пакінуць аўто ў гаражы, які належаў аднаму з іх. Ды толькі перасяклі мяжу горада, як машына моцна «засела» ў агародзе. Спрабавалі неяк выехаць, выцягнуць — не атрымлівалася. Ужо потым высветлілася, што агарод гэты належыць бабулі будучага зяця ўласніка «васьмёркі». Насамрэч, які цесны свет!

Як паведаміла «Звяздзе» памочнік пракурора Полацка Дар'я Каваленка, прыгаворам суда адзін з «гоншчыкаў», раней судзімы, асуджаны на тры гады абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, другога накіравалі на папраўчыя работы тэрмінам у год з утрыманнем 15 адсоткаў заробку на карысць дзяржавы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ШЛЯХАМ ВЫМАГАННЯ

Упраўленнем КДБ па Гродзенскай вобласці затрыманыя два супрацоўнікі мясцовай рэгіянальнай мытні. Ім інкрымінуюцца злачынствы, прадугледжаныя арт. 430 ч. 2 Крымінальнага кодэкса Беларусі — атрыманне хабару шляхам вымагання.

Інспектары Гродзенскай рэгіянальнай мытні бралі хабар (долары ЗША і матэрыяльныя каштоўнасці) за спрыяльнае вырашэнне пытанняў, што ўваходзілі ў іх кампетэнцыю. Ажыццяўляючы мытнае афармленне тавараў, якія ўвозяцца з-за мяжы ў Беларусь, яны неаднаразова выкарыстоўвалі свае службовыя паўнамоцтвы з мэтай уласнага абагачэння. Затрыманыя штучна стварылі сітуацыі, калі грамадзян прымушалі плаціць за своечасовае афармленне аўтатранспартных сродкаў з грузам і выдачу дазволу на выпуск тавараў для свабоднага абарачэння.

Ступень вінаватасці мытнікаў будзе вызначана ў ходзе следства ў судзе. Цяпер следчыя ўстанаўліваюць дачыненне іншых службовых асобаў да ўчынення названых карупцыйных злачынстваў, паведамляе прэс-служба УКДБ па Гродзенскай вобласці.

«ЗОЛАТА ПАРТЫІ» Ў ЦЯГНІКУ «НЁМАН»

Праз дзесяць гадоў у фірменны цягнік «Нёман», які курсіруе паміж Гроднам і Масквой, вярнуўся вагон-рэстаран.

Пасля капітальнага рамонту ў Гомелі ён перададзены ў арэнду прыватнай фірме і аформлены ў стылі савецкіх часоў. Адпаведная і назва — «Саюз», дарэчы, актуальная і цяпер для Беларусі і Расіі. На сценах рэстарана першай нацэначай катэгорыі, разлічанага на 42 пасадачныя месцы, лозунгі і фатаграфіі савецкай эпохі, а афіцыянткі будуць насіць чырвоны гальштук і камсамольскі значок. У меню — стравы «Золата партыі», «Заначка Мінфіна», «Мяса па-буржуйску» і, безумоўна, «настальгічная» салата аліўе.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

БЫЦЦАМ І НЕ ЛАВІЎ?

На Светлагорскім водасховішчы дзяржінспектарамі быў затрыманы рыбак прамысловай лоўлі прадпрыемства «Светлагорскае ПМС».

Ён вёў прамысловую здабычу рыбы сеткамі без маркіровачных знакаў, таксама ў тоневым журнале на момант затрымання адсутнічала адзнака аб правядзенні прамысловай лоўлі рыбы. У парушальніка канфіскавана 5 сетак агульнай даўжынёй каля 250 метраў і 25 асобінаў рыбы. Шкода склала больш за 1,6 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Считать недействительным страховой полис серии БМ № 0230321 СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу.

САЛЯМІ... З МЯСА ЛАСЯ І СА ШТУЧНАЙ ЦВІЛЛЮ

САЛЯМІ з мясам казулі ці лася, бясспрэчна, будуць даспадобы спажыўцам. Так палічылі ў РУП «Інстытут мясамалочнай прамысловасці», калі распрацоўвалі дзяржаўны стандарт «Вырабы сыравэнджаныя і сыравяленыя салямі. Агульныя тэхнічныя ўмовы». Акрамя традыцыйнай для каўбас сыравіны — ялавічыны, свініны, каніны, бараніны — у стандарце, які ўступіў у сілу з 1 ліпеня, прадугледжана выкарыстанне мяса прамысловых жывёл.

Для вырабу сыравэнджаных і сыравяленых салямі не дапускаецца выкарыстанне мяса ўсіх відаў жывёлы, тлушча-сырца, шпіка, грудзінкі, замарожаных болей за адзін раз; свініны і шпіка з прыкметамі асальвання ці пажаўцення; мяса і шпіка кныроў; бялкоў расліннага паходжання; штучных араматызатараў, штучных і сінтэтычных фарбавальнікаў, у тым ліку ў саставе харчовых дабавак, і інш.

У залежнасці ад характарыстыкі і суадносінаў мясной сыравіны, якая выкарыстоўваецца, каўбасы і каўбаскі падраздзяляюцца на вышэйшы, першы, другі гатунак і безгатункавыя.

З мэтай пашырэння асартыменту і для надання арыгінальнага знешняга выгляду каўбасным вырабам прадугледжана выкарыстанне сучасных абалонак, нанясенне на паверхню батонаў спецыяльнай, дэкаратыўна-смакавых сумесяў і прыпраў, абсыпак, якія імітуюць штучную цвіль і інш.

Тэрміны прыдатнасці каўбасных вырабаў вызначаюцца з даты вырабу і залежаць ад тэмпературы захоўвання. Так, напрыклад, тэрмін прыдатнасці пры тэмпературы захоўвання ад 12 да 15 градусаў і адноснай вільготнасці 75—78 працэнтаў для сыравэнджаных салямі — не больш за 2 месяцы, а сыравяленых — не больш за 1 месяц. Вырабы, упакаваныя ў плёнку пад вакуумам (у газавым асяроддзі ці ва ўмовах мадыфікаванай атмасферы) пры тэмпературы ад 2 да 6 градусаў могуць захоўвацца не больш за 25 сутак — нарэзаныя на кавалачкі (сервіровачная нарэзка), не больш за 4 месяцы — цэлымі батонамі (батончыкамі).

Пры ўключэнні ў склад прадукту сыравіны, выраблёнай з выкарыстаннем генетычна мадыфікаваных кампанентаў, у маркіроўцы неабходна ўказваць іх наяўнасць.

У стандарце ўлічаныя патрабаванні дакументаў Расіі, Украіны, Літвы на ўказаную прадукцыю, што, як лічаць яго распрацоўшчыкі, павялічвае экспартныя магчымасці айчынных вытворцаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДАЕШ ТЭЛЕФОН НА КОЖНУЮ ДАЧУ! ЗА ПАЛОВУ ЦАНЫ...

Дачны сезон зараз у самым разгары. Хтосьці бавіць на дачы выхадныя дні, хтосьці арганізоўвае сямейныя святы і сустрэчы з сябрамі, але для многіх гараджан дача становіцца на лета пастаянным месцам жыхарства. І хоць мабільныя тэлефоны склалі апошнім часам сур'ёзную канкурэнцыю стацыянарнай тэлефоннай сувязі, аднак па шэрагу прычын стаць паўнавартаснай заменай стацыянарным тэлефонам яны ўсё роўна не могуць. Займець свой стацыянарны тэлефон дачнікаў заклікае «Белтэлекам», тым больш што цяпер гэта не праблема — чэргаў на ўстаноўку тэлефонаў практычна няма. Да таго ж з 1 ліпеня па 30 верасня «Белтэлекам» прапануе ўсім уладальнікам дачных і катэджных забудоў падключэнне тэлефона з 50-працэнтнай скідкай. Як тлумачаць у «Белтэлекаме», на дачны перыяд абаненцкая плата і тарыфы на выходзячую сувязь будуць дзейнічаць звычайныя. Аднак пасля заканчэння акцыі (у перыяд з 1 кастрычніка па 31 сакавіка) абаненту будзе дадзена магчымасць скарыстацца сезоннай прапановай, калі можна будзе заблакіраваць уваходзячыя і сыходзячыя званкі. Але нумар захаваецца за гаспадаром да наступнага дачнага сезону. У перыяд блакіроўкі сувязі ўладальніку стацыянарнага тэлефона трэба будзе аплачваць толькі абаненцкую плату, якая складае 1680 рублёў у месяц. Падрабязнасці акцыі можна даведацца па тэлефоне «130». Усе даведкі — бясплатныя.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

10-гадовы Андрэй ЧАРНЯВОКІ дапамагае дзеду.

У дзень сям'і і вернасці мінчане атрымаюць рамонкі

Букецікі рамонкаў валанцёры будуць уручаць каля галоўных станцый метро. Гэта адна з частак гарадской акцыі «Да шчаслівай сям'і разам з Пятром і Фяўронняй», што пройдзе 8 ліпеня, у Дзень сям'і, кахання і вернасці.

Восьмага ліпеня праваслаўная царква святкуе дзень памяці святых Пятра ды яго жонкі Фяўронні, князёў Мурамскіх, якіх лічаць абаронцамі сямейнага шчасця, узорам шлюбнай вернасці і любові.

Менавіта таму з 12.00 разам з букецікамі рамонкаў (сімвалаў свята) валанцёры будуць уручаць і брашуры з выявамі і жыццяпісам святых. Акрамя гэтага, у Нацыянальным мастацкім музеі пройдзе акцыя «Моцная сям'я — з упэўненасцю ў будучыню». 12 сем'яў з усёй Беларусі атрымаюць медалі любові і вернасці, а таксама кашто ўныя падарункі. Сем'і адбіраліся арганізатарамі акцыі па строгіх крытэрыях. Пры вызначэнні ўлічваўся стаж сямейнага жыцця (павінен быў быць большы за 25 год), колькасць дзяцей, а таксама духоўна-маральны аспект.

Арганізатары акцыі — праваслаўнае брацтва ў гонар святога Архістраціга Міхаіла — лічаць, што яна прыцягне ўвагу да праблемаў беларускай сям'і.

— У жыцці Пятра і Фяўронні, — кажа супрацоўніца аргкамітэта свята Таццяна Тарасевіч, — мы знаходзім тое, чаго, можа, не хапае сучасным жанчынам — жаночую мудрасць, а таксама вартасці характараў Пятра і Фяўронні. Мы тут бачым пастаянныя сітуацыі выбару. Мы бачым, што магчымая адмова ад улады на карысць сям'і. І ўсе высілкі накіраваныя на захаванне сям'і. Разам з тым тут вельмі яркі прыклад адзінства сям'і і дзяржавы і значэнне сям'і для дзяржавы, таму што калі святых князёў выганяюць з Мурама, калі сям'я сыходзіць з дзяржавы, то там пачынаюцца міжусобіцы. Царства, што раздзялілася само ў сабе, як вядома, не ўстаіць. Таму, з майго пункту гледжання, свята мае каласальнае духоўна-маральнае і адукацыйнае значэнне. Хацелася б, каб яно ўвайшло ў традыцыю і стала агульнадзяржаўным.

Па словах арганізатараў, усталяванне такога дня ў Беларусі выцякае з дэмаграфічнай і сацыяльнай сітуацыі. На сёння наша краіна займае адно з першых месцаў у свеце (у залежнасці ад методык падліку) па колькасці разводаў. Толькі два працэнты сем'яў маюць траіх дзяцей, 11 працэнтаў — дваіх. І кожнае пятае дзіця нараджаецца па-за шлюбам. На 100 родаў у нашай краіне прыпадае 38 абортаў (гэта трэцяе месца ў свеце).

Настасся ЗАНЬКО.

Эксклюзіў «Звязды»

ВЕЦЕР ПЕРАМЕН

Ён стаў сімвалам знікнення адной краіны і з'яўлення замест яе шмат якіх новых.

Сярод іх была і Беларусь. Аднак для яе вецер, які прынёс такія кардынальныя перамены, меў палынавы пах. Бо менавіта пасля Чарнобыля стала зразумела, што немагчыма без зменаў, без новага мыслення, галоснасці — адкрытасць дазваляла б людзям не толькі своечасова засцерагчы сябе, але і задумацца пра тое, як ім цяпер жыць на сваёй роднай зямлі, чаго чакаць ад яе?

Героі новага рамана «Палыновы вецер» Леаніда Левановіча жывуць у чарнобыльскай зоне. Жывуць так, як жылі б тут і да аварыі — працуюць, кахаюць. І сочаць за падзеямі, якія на мяжы 80-х і 90-х гадоў ім падаюцца больш значнымі, чым нават тая катастрофа.

Яна нібыта наўпрост і не прысутнічае ў іх свядомасці — радыяцыі ж не бачна. Аднак вёска, дзе пасяліўся герой Уладзімір Бравусаў пасля выхаду на пенсію, мае назву Хатынічы... Так, вёска пакуль існуе. І жывуць тут людзі. І думаюць пра шчасце, бо ствараюць сем'і, вяртаючыся напрыканцы жыцця да тых, хто быў іх даўнім каханнем, як Марына ў Бравусава. Аднак аварыя прарываецца скрозь іх штодзённыя думкі марай пра «экалогію, якая выходзіць на першы план». Пра экалогію душы, якая вызначае тое, што адбываецца ў прыродзе і чалавечым свеце. Пра яе гаворацъ за навагоднім сталом напярэдадні 1992 года.

Бо надта неспакойным быў год 1991. Яго падзеі і сталі галоўнымі для герояў рамана, як і для шмат якіх жыхароў Беларусі. «Хіба мала Чарнобыля на нашу галаву, дык яшчэ і ГКЧП!» — усклікае Марына, пачуўшы афіцыйнае паведамленне. Пра тое, чым гэта пагражае і што з гэтага атрымаецца, разважаюць людзі, як гэта і сапраўды было калісьці. Пра Гарбачова і тое, чаго ён дамогся, пра Ельцына, які можа выйсці на палітычную арэну. І пра тое, як падзеі, што адбываюцца ў Маскве, адгукнуцца ў Беларусі, якім чынам паўплываюць на лёсы канкрэтных людзей.

Тыя жыхары нашай краіны, на вачах якіх усё адбывалася, магчыма, знойдуць у рамане сугучнасць уласным думкам, перажыванням. Мо і дагэтуль успаміны пра той час даганяюць кожнага, хто задумваецца пра тое, у якой краіне жыве.

Ларыса ЦІМОШЫК.

З канфіскацыяй лодкі і стрэльбы...

Суд Светлагорскага раёна аштрафаваў браканьера на 1,8 мільёна рублёў, а таксама канфіскаваў металічную лодку. Яшчэ парушальнік мусіць пакрыць суму шкоды ў памеры 350 тысяч рублёў (частка была ўнесена добраахвотна да суда). А ўсё за што? За незаконную здабычу рыбы забароненымі прыладамі лоўлі ў перыяд забароны на яе здабычу.

Па рашэнні Івацэвіцкага суда парушальнік пазбавіўся паляўнічай стрэльбы, а таксама атрымаў штраф у памеры 1,7 мільёна рублёў. Нанесены ўрон у суме 2,1 мільёна рублёў браканьер аплаціў да суда добраахвотна. Пакаранне было прызначана за незаконную здабычу дзіка і нанясенне шкоды ў буйным памеры.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

МАЛЫ ЗАЛАТНІК, ДЫ ДАРАГІ

Наш масавы конкурс для шашыстаў усіх рангаў «Пагода ў доме»-7 працягваем міні-праблемай. У ёй усяго па чатыры шашкі з двух бакоў, але, як гаворыцца, малы залатнік, ды дарагі, асабліва ходам 3. fe3! Гэтую ўнікальную ідэю ўжо выкарысталі ў сваіх творах нашы чытачы Пётр Шклудаў (Наваполацк), Віктар Шульга (Мінск) і інш. Пашукайце кампазіцыйны выйгрыш за белых:



№ 10. **Белыя**: a7, b6, f2, f6 (4). **Чорныя**: d4, d8, e7, f4 (4).

ПРАФЕСІЙНА І ЯКАСНА

Менавіта так складае свае эюды майстар кампазіцыі П. Шклудаў. У яго аўтарскім конкурсе-12 заданні некалькі складаныя, бо конкурс разлічаны больш на першакласных рашальнікаў. Аднак калі знайсці першы правільны ход белых, дык і яны не так ужо цяжка развязваюцца. Перад вамі яго чарговая задумка:



№ 3. **Белыя**: d2, g3, дамка e1 (3). **Чорныя**: b6, c5, c7, d6, e7 (5). Перамога белых.

МОЦНЫ ПАДМУРАК

Яго заўсёды маюць камбінацыі Генадзя Андрэева (Латвія). У якасці бліца-55/2 ён перадаў па электронай пошце наступную з іх:

Белыя: 17, 18, 23, 32, 41, 42, 43 (7). **Чорныя**: 5, 8, 14, 24, 29, 33, 34, 36 (8). Атака белых.

* * *

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: **220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».**

РАШЭННІ

Калі ласка, праверце свае рашэнні ранейшых заданняў.

«Пагода ў доме»-7 (М. Грушэўскі): **№ 5.** G5, f6, e3! (d4) c7.e3x. Майстар Аляксандр Ляхоўскі (Жодзіна), кандыдат у майстры спорту Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў) і інш. убачылі 1. g3x, **№ 6.** d8, hg7, a5, g1x, **№ 7.** f8, b6, c7, b4, a5x і **№ 8.** f8, fe7, b8, b8:g3:g7/h8 (d2A) c3, g7x. a(b2, d2) c3, a3x.

Аўтарскі-11 (У. Матус): **№1.** 43, 29:38, 3, 7, 44, 1, 45, 48 (40) 39x і **№ 2.** 41, 11 (25A) 2, 3, 20, 6x. A(20) 2, 25, 29, 40, 17/11/6x.

Аўтарскі-12/1 (П. Шклудаў): a3, g5, f6, e3! (d4) b6, e3x.

Бліцы: 54/5 (А. Шурпін) — 40-34 (25A) 26, 20, 12, 18, 16#. A(23) 19, 24, 14, 1, 40, 35, 30, 28, 35, 40, 50# і **54/6** (Л. Вітошкін) — 35 (41AB) 29, 47x. A(39) 26, 37, 24 (37) 47x. B(37) 29, 46x.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ, НАХОДЯЩИХСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ, И НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ОБСЛУЖИВАНИЯ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится **12 августа 2010 г. в 12.10** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 106.

Организатор аукциона: фонд «Могилевоблимущество», г. Могилев, ул. Первомайская, 62, тел. 8 (0222) 229022, 311185, 223375.

Продавцы недвижимого имущества: по лоту № 1 – Министерство промышленности Республики Беларусь, тел. 8 (0225) 43 40 20; по лоту № 2 – концерн «Белнефтехим», тел. 8 (0222) 22 21 98, 39 18 26.

Заявления на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 62, к. 104. Последний день приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами **10 августа 2010 г. до 17.00.** Заключительная регистрация участников аукциона **12 августа 2010 г. с 10.00 до 10.50.**

№ лота	Сведения о предметах аукциона							
	Информация о недвижимом имуществе			Информация о земельных участках			Начальная цена предмета аукциона, тыс. руб.	Сумма задатка, тыс. руб.
	Наименование и краткая характеристика	Место нахождения	Начальная цена недвижимого имущества, тыс. руб.	Площадь, га	Срок аренды, лет	Начальная цена права заключения договора аренды земельных участков, тыс. руб.		
1	Находящиеся по договору безвозмездного пользования у ОАО «Бобруйскагромаш» клуб-столовая двухэтажная, кирпичная 2331 кв.м; два спальных корпуса двухэтажных, кирпичных 1255 и 1254 кв.м; павильон летний душевой двухэтажный кирпичный 73,1 кв.м; павильон встреч с террасой одноэтажный кирпичный 85 кв.м; дом для персонала с террасой двухэтажный, кирпичный 124,3 кв.м; асфальтобетонное покрытие 5665 кв.м; туалет кирпичный 17 кв.м; подземная емкость пожаротушения бетонная 34 куб.м, обвалована землей	Могилевская обл. Глусский р-н, в районе дер. Городок	1 074 568,763	10,8783	60	1 001,038	1 075 569,801	50 000,0
2	Здания и сооружения базы отдыха «Надежда», находящиеся по договору безвозмездного пользования у ОАО «Могилевский «ЗИВ»	Могилевская обл., Могилевский р-н, район дер. Межисетки	794 113,628	5,2617 и 0,3600	50	1 167,600	795 281,228	50 000,0

Начальная цена недвижимого имущества, входящего в состав лотов, понижена: по лоту № 1 – клуба-столовой и двух спальных корпусов – на 50 процентов, остального недвижимого имущества – на 20 процентов; по лоту № 2 – на 50 процентов.

Условия для победителей аукциона в отношении земельных участков, право заключения договора аренды которых входит в состав:

лота № 1:

- в случае изменения целевого назначения объектов недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Глусского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет;

- приступить к занятию земельного участка в течение шести месяцев со дня получения документов, удостоверяющих государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения права на него, а в случае изменения целевого назначения объектов недвижимого имущества – в течение шести месяцев со дня разработки и утверждения строительного проекта на строительство (реконструкцию) объекта;

- при перепрофилировании объекта по функциональному назначению получить в установленном порядке согласование Глусского РОЧС;

лота № 2:

- приступить к занятию земельных участков в течение шести месяцев со дня получения документов, удостоверяющих государственную регистрацию создания земельных участков и возникновения прав на них;

- в случае изменения целевого назначения объекта недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Могилевского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство (реконструкцию) объекта в срок, не превышающий двух лет.

Земельные участки, право заключения договора аренды которых входит в состав лота № 2, расположены в водоохранной зоне реки Лахва, в которой устанавливается специальный режим хозяйственной деятельности, которая должна осуществляться с соблюдением мероприятий, предотвращающих загрязнение, засорение и истощение вод. С перечнем ограничений в использовании указанных земельных участков можно ознакомиться у организатора аукциона.

Полная информация о недвижимом имуществе, входящем в состав лота № 2, ранее была опубликована в газете «Звязда» 15 мая 2010 г.

Задатки перечисляются на расчетный счет фонда «Могилевоблимущество» № 3642900001315 в филиале № 700 – Могилевское областное управление ОАО «СБ «Беларусбанк», код 536, УНП 700052050.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в фонд «Могилевоблимущество» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а представитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в настоящем извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, перечисленные выше, подавшие организатору аукциона в названный в настоящем извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в настоящем извещении расчетный счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

Срок заключения (государственной регистрации) договора купли-продажи и договора аренды земельного участка – не позднее 2 рабочих дней со дня возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка.

Оплата за предмет аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету без предоставления рассрочки. Оплата за объекты недвижимости производится в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи имущества.

Победитель аукциона в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка победителю аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков.

ЕЎРАПЕЙСКАЯ АФРЫКА

ЧЭМПІЁНАМ свету па футболе стане еўрапейская каманда. Гэта стала вядома пасля таго, як у аўторак увечары зборная Нідэрландаў у напружанай барацьбе выбіла з турніру апошняга заакіянскага канкурэнта.

Фота Сіньхуа-БЕЛТА.

Шматлікія эксперты казалі пра тое, што пасля звышэмацыйных чвэрцьфіналаў каманды проста не паспеюць узнавіцца і наўрад ці пакажуць яскравую гульню. Але і эксперты памыляюцца. Супрацьстаянне прынесла перавагу галандцаў — 3:2.

Ці магло стацца па-іншаму? Так, безумоўна. Такі ўдар, якім ван Бронхарст адкрыў лік, атрымліваецца адзін на сотню. І толькі гол Рабена спалучае ў сабе майстэрства выканаўцы і памылку абаронцаў. Маглі перамагчы ўругвайцы, але ці было б гэта справядліва?

Як бы хто ні ставіўся да абодвух супернікаў першага паўфіналу, трэба шчыра прызнацца — Нідэрланды перамогу заслужылі. «Аранжавыя» часцей гулялі «першым нумарам». Ругвай адстрэльваўся з акопаў і спадзяваўся на Фарлана, які адзінокім ваяром маячыў на перадавой. Ішла 18-я хвіліна, калі ван Бронхарст з левага вугла штрафной зарадзіў сваю «гармату». Лік 1:0 не выглядаў для паўднёваамерыканцаў прысудам, але прымусіў апусціць плечы на добры дзясятак хвілін. Прыйсці ў сябе ўругвайцам дапамагло... каратэ. Дакладней, прыём з гэтага азіяцкага віду барацьбы: нападаючы паўднёваамерыканцаў Марцін Касэрас спрабаваў прабіць у падзенні праз сябе, але трапіў нагой не па мячу, а па галаве ні ў чым не павіннага абаронцы еўрапейцаў Дэ Зеўва. Што цікава, дадатковыя сілы паля такога прыёмчыка з'явіліся не ў пакрыўджаных галандцаў, а ў зборнай Уругвая! «Бела-блакітныя» забегалі і галандцы пачалі прагінацца. Секундная стрэлцы заставалася зрабіць толькі чатыры абароты ў першым тайме, як Дыега Фарлан нагадаў усім, за што яго апошнім часам клічуць «другім Дыега» (пасля Марадоны, безумоўна). Дзясяты нумар уругвайцаў прабіў так, што мяч па дузе праляцеў над рукамі галкіпера.

А потым быў другі тайм, быў афсайд (ці не афсайд) ван Персі, быў гол галавой адносна маленькага Рабена, быў навал уругвайцаў напрыканцы... І галоўны вынік — у фінал прайшлі Нідэрланды. Хто будзе іх супернікам, вы ўжо ведаеце. Але ў любым выпадку, ці будзе фінал Нідэрланды—Германія, ці Нідэрланды—Іспанія, можна смела казаць пра парушэнне даўняй традыцыі. Яшчэ ніколі еўрапейская каманда не перамагала на чэмпіянаце свету, калі ён праводзіўся за межамі старога кантынента.

Нядзеля, 11 ліпеня 2010 года, 21:30. Фінал чэмпіянату свету па футболе. Такая падзея адбываецца раз у чатыры гады. Не прапусціце!

Яўген ВАРАКСА.

Тэлесеткі

«БІТВА ТЫТАНАЎ»: МАРЫЯ ЕСЬМАН, АЛЯКСЕЙ ГРЫШЫН, ДОКТАР САЙКОЎ...

ПАДРЫХТОЎКУ да ўдзелу ў новым сезоне міжнароднага праекта «Бітва тытанаў» распачаў днямі тэлеканал АНТ. Гэтым разам з камандамі Кітая, Францыі і Расіі будуць спаборнічаць ужо чатыры беларускія каманды.

Удзельнікаў падзялілі на адмысловыя групы: спартыўная, «каманда медыяперсонаў», «музычная каманда» і каманда пераможцаў разнастайнага праектаў АНТ.

Склад апошняй даволі цікавы — першая віцэ-міс конкурсу «Міс Інтэркантынэнталь-2009» Марыя Есьман, фіналіст праекта «Новыя галасы Беларусі» і саліст гурта «3+2» Егіязар Фарашан, «Міс Беларусь-2010» Людміла Якімовіч і пераможца праекта «Пасаг для нявесты» Валерыя Рудакоўская.

«Спартыўную» каманду ў складзе алімпійскага чэмпіёна Аляксея Грышына і уладальніцы тытула «Міс спорт-2010» Крысціны Андрэевай узначаліць фітнэс-лэдзі Наталля Наважылава.

Камандай, «якая спявае», будзе кіраваць дырыжор Прэзідэнцкага аркестра Віктар Бабарыкін. Свой удзел у ёй ужо пацвердзілі Іна Афанасьева, Гюнеш, Іван Вабішчэвіч, Кірыл Клішэвіч і іншыя.

Медыяперсоны Беларусі — Алесь Мухін, Валерыя Курыльская, Алег Гарбуз, Кацярына Сычэўская, Дзмітрый Урангель, Дзмітрый Пустыльнік і Ігар Старавойтаў будуць спаборнічаць пад кіраўніцтвам доктара Сайкова і яго жонкі.

Самае цікавае, што запрасіць вядучых персонаў Беларусі было зусім нескладана. Як расказала «Звяздзе» **прэс-сакратар тэлеканала АНТ Таццяна КУРБАТ**, спевакі і вядучыя давалі згоду «лёгка і з задавальненнем»:

— Праблем са згодай у нашых удзельнікаў не ўзнікала. Наадварот, яны амаль адразу пагаджаліся — праект жа цікавы. Цудоўная магчымасць пазнаёміцца з новымі людзьмі, а таксама паглядзець на прыгажосць Францыі.

Здымкі тэлепраекта пройдуць у 10-ці кіламетрах ад Парыжа. Убачыць спаборніцтвы на тэлеканале АНТ можна будзе ўжо ў верасні. У тэлеэфіры гледачы ўбачаць 15 выпускаў — тэлеверсія праекта будзе ісці да канца снежня.

Ілья ЛАПАТО.

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Сканворд + судоку (2 ліпеня).

Па гарызанталі: Ягель. Абеліск. Ціск. Ляда. Азу. Гіпс. Банк. Рабле. Сыракваша, Ват. Полк. Злата. Хаус. Дым. Гарнітура. Ачаг. Арыя. Арча. Аян. Офіс. Кавалер. **Па вертыкалі:** Спадарожнік. Гаіці. Пірасмані. Лукас. Квага. Клуб. Ватага. Аматар. Рыхтэр. Будан. Ноч. Крап. Охта. Лаура. Курыя. Кавалер. Саян. Судоку: адказы гл. у табліцы.

6	4	3	5	1	8	9	2	7
5	1	2	9	4	7	6	8	3
9	8	7	6	3	2	5	4	1
3	9	5	4	8	6	1	7	2
2	7	1	3	9	5	8	6	4
8	6	4	2	7	1	3	5	9
7	3	6	1	5	4	2	9	8
4	2	9	8	6	3	7	1	5
1	5	8	7	2	9	4	3	6

Крыжаванка (6 ліпеня).

Па гарызанталі:1. Звон. 4. Вада. 8. Поўнач. 9. Ладдзя. 10. Купалле. 15. Араты. 16. Здань. 17. Трава. 20. Дзіця. 21. Вырай. 22. Янтар. 23. Танец. 24. Вецер. 25. Арляк. 28. Наказ. 33. Ведзьма. 35. Бяроза. 36. Дзядок. 37. Чары. 38. Каяк. **Па вертыкалі:** 2. Віно. 3. Ночка. 4. Вялес. 5. Дуда. 6. Спёка. 7. Вясна. 11. Под. 12. Лён. 13. Вадзяніцы. 14. Галавешка. 18. Пятро. 19. Свята. 24. Вярба. 26. Род. 27. Ясь. 29. Зёлкі. 30. Сваты. 31. Садок. 32. Мова. 34. Ляля.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 11 ліпеня.
Месяц у сузор'і Блізнятаў.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.48	21.40	16.52
Віцебск —	4.30	21.38	17.08
Магілёў —	4.38	21.31	16.53
Гомель —	4.44	21.18	16.34
Гродна —	5.05	21.54	16.49
Брэст —	5.15	21.46	16.31

Імяніны

Пр. *Ефрасінні, Давыда, Мікалая, Пятра.*

К. *Альжбеты, Пракопа, Рыгора, Яўгена.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +26..+28°C	КІЕЎ +25..+27°C	РЫГА +26..+28°C
ВІЛЬНЮС +14..+16°C	МАСКВА +27..+29°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ +29..+31°C

Дзве даты

8 ліпеня

1812 год — французскія войскі занялі Мінск. За час акупацыі колькасць насельніцтва горада скарацілася з 12 да 4 тысяч чалавек.

1709 год — адбылася Палтаўская бітва, галоўная падзея Паўночнай вайны 1700—1721 гадоў. Руская армія пад камандаваннем Пятра I разграміла шведскае войска Карла XII.

Цытата дня:

«Дастаткова апынуцца з кім-небудзь у ліфце, каб пераканацца, як мала людзі могуць сказаць адзін аднаму».

Славамір Урублеўскі.

ВЫБАР СВАТОЎ

Этапам найскладанейшага абрадавага пераходу з аднаго стану маладых у іншы кіравалі сваты. Унікальнасць іх ролі зводзілася да цэлага шэрагу патрабаванняў: яны павінны былі ведаць гісторыю жыцця маладых, іх сем'яў і сваякоў. У такім разе сват — злучная нітка паміж мінулым і будучым. Але перш чым даць ім права злучаць лёсы прадстаўнікоў розных пакаленняў і родаў, неабходна было суаднесціся з традыцыйным сялянскім кодэксам гонару.

● Відаць, зусім не выпадкова першымі прэтэндэнтамі на гэту ролю аказваліся хросныя бацькі жаніха ці нявесты. Менавіта хросны бацька ці маці былі асноўнымі ў дружыне, якая адпраўлялася ў сваты. Калі ж шэраг прычын (удаўство, смерць дзяцей, развод, другі шлюб) не дазвалялі хросным стаць сватам і свацця на вяселлі сваіх хрэснікаў, тады сватоў выбіралі «збоку».

● Сватамі запрашалі людзей, не маладзейшых за 40 гадоў, якія жывуць у шлюбе і маюць дваіх і больш дзяцей. Ніякіх сітуацый «недасканаласці» ў дачыненні да іх не дапускалася. У адпаведнасці з асноўнымі правіламі народнай культуры, пары сватаў выбіралі з ліку сяброў, суседзяў, сваякоў, якія добра ведалі мясцовыя традыцыі, прыказкі, прымаўкі, цікавыя гісторыі, словам, умелыя гагаварыць і павесяліць. У в. Шпакоўшчына Полацкага раёна казалі, што ў сваты «ішоў той, у каго добра быў падвешаны язык». Нярэдка сватоў ацэньвалі па колькасці праведзеных імі вяселляў. Такім чынам, кандыдатура свата павінна была адказваць двум асноўным крытэрам. З аднаго боку, чалавек абавязаны быў добра ведаць мясцовую традыцыю ва ўсіх яе хітраспляценнях і недагаворанасцях; з іншага — ён павінен валодаць прыродным артыстызмам, кемлівасцю, пачуццём такту і велізарным багажом разнастайных прымавак.

● Сёння ролю свата на вяселлі выконвае вядучы ці тамада. Ад іх прафесіяналізму шмат у чым залежыць, у якім рэчышчы пройдзе вяселле — традыцыйны абрад злучэння двух родаў: з захаваннем традыцыйных духоўных каштоўнасцяў і высокай культуры зносінаў ці з пераўтварэннем у банальнае застолле, якое суправаджаецца пахабнымі анекдотамі і забаўкамі «ніжэй за плінтус». Адсутнасць прафесійных ведаў кампенсуецца, на жаль, прымітыўнымі гульнямі, сутнасць якіх — пагуляць на нашых нізінных пачуццях.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся!

СЯМЕЙНЫ ФУТБОЛ

Амбіцыі — гэта калі, ідучы на экзамен, думаеш, што ведаеш на 2, а калі ставяць 4, дзівішся, чаму не 5.

☺

Учора з сябрамі рашалі прыклад: 2х0,7:3. Вынік не памятаю!

☺

— Я ў Парыжы была!
— Ну і як?
— Класна! Купалася ў Сене.
— Дурніца, у сене сэксам займаюцца, а не купаюцца.

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 23 (355)

Таматы мяняюць колер?

Па меры выспявання колькасць зялёнага пігменту (хларафілу) у таматах змяншаецца, а ўзровень караціноідаў расце, і колер пладоў мяняецца ад зялёнага да характэрнага для кожнага гатунку. Пры гэтым расце і ўтрыманне цукраў, арганічных кіслот, вітамінаў і мінеральных соляў. Гатункі розных колераў накопліваюць, у параўнанні з чырвонымі, у 1,5 раза больш караціноідаў і на 1/3 — цукраў. Таму рознакаляровыя таматы вельмі салодкія і больш карысныя, чым чырвоныя. Вучоныя ўстанавілі, што руковыя, аранжавыя і малінавыя таматы не выклікаюць алергіі нават у тых, хто зусім не пераносіць чырвоныя таматы. Акрамя таго, яны ўтрымліваюць шмат калію, што карысна людзям з парушэннем абмену рэчываў, сардэчна-сасудзістай недастатковасцю, гіпертаніяй.

Агуркі на піку росту

ПРА тое, што агуркам не хапае вільгаці, пакуль сказаць нельга, бо прырода дасюль адорвала дажджамі ледзь не кожны дзень, але напарадзе самы гарачы месяц і невядома, куды паверне. Таму пастарайцеся трымаць «планку вільгаці», узятую на старце, бо для агуркоў адсутнасць яе ў глебе — справа вельмі непрыемная. Трапіўшы на «сухі паёк», яны проста перастануць пладаносіць, а ў засуху скідваюць кветкі і завязь.

Агароднікі-пачаткоўцы часта робяць грубую памылку, абрываючы «пустацвет», мужчынскія кветкі, якія патрэбны для апылення. Ураджай залежыць і ад колькасці жаночых кветак. Іх будзе больш, калі агурочныя плеці прышчыкнуць над пятым ці шостым лістом. На бакавых плецях з'явіцца мноства кветак.

Агурочкі трэба збіраць раніцай, зрываючы асцярожна, стараючыся не пашкодзіць агурочную ліяну. Кароткаплодныя гатункі (карнішоны) трэба зрываць кожны дзень, большыя — праз дзень. І ні ў якім разе не пакідаць пераросłых — яны перашкаджаюць новай завязі.

Чаму агурок бывае горкі? Пры недахопе вільгаці ў глебе назапашваецца такое рэчыва, як кукурбітацын, а таксама пры дрэнным кармленні, пры высокіх і нізкіх тэмпературах. Асабліва горкімі вырастаюць агуркі ў гарачае надвор'е.

Калі трэба будзе паліваць агуркі, то вада для паліву павінна быць сталяй, добра прагрэтай. Добра будзе, калі гэта вада з сажалкі, возера і, вядома ж, дажджавая. Ад халоднай крынічнай вады карэньчыкі хутка адміраюць. Гэта таксама можа адбывацца і ад дэфіцыту кіслароду ў глебе, таму рыхленне — важны клопат агародніка.

Не забудзьцеся своесачова падкарміць расліны. Для кожнага віду — свае тэрміны кармлення.

Карысныя парады:

● У засушлівае надвор'е для павышэння вільготнасці на агурках паліваюць усю градку і дарожкі, у парніках і цяпліцах ставяць ёмістасці з вадой.

● Каб пчолы ляцелі ў цяпліцу, трэба паставіць ля ўвахода букецікі з мацярдушкай і іншымі раслінамі, якія маюць прыемны пах, можна апырснуць расліны слабым растворам цукру або мёду (чайная лыжка на 1 літр вады).

● Раз у 7—10 дзён агуркі падкормліваюць, чаргуючы арганічныя ўгнаенні з фосфарнымі і калійнымі. Калі стаіць гарачыня, то пасля абеду робяць «асвяжальны душ». Раніцай такую працэдуру рабіць не трэба, бо пры апыленні пчоламі лісты і кветкі павінны быць сухія.

● Па знешнім выглядзе агуркоў можна меркаваць аб тым, ці хапае раслінам асноўных элементаў харчавання. Жоўтыя лісты паказваюць на дэфіцыт у глебе магнію. Калі плеці тонкія, лісты дробныя, самі плады больш светлыя, чым звычайна, а верхавінкі іх звужаныя і завостраныя, падкарміце азотнымі ўгнаеннямі. Развядзіце пачак для запалак аміячнай салетры на вядро вады (расходаваць па паўлітра на адну расліну). Калі лісты і плеці цёмна-зялёныя і буйна растуць, не давайце азотнай падкормкі, інакш доўга не дачакаецеся ўраджаю. Калі агуркі, незалежна ад гатунку, ля пладаножкі рэзка звужаюцца, утварачы «хвасты», раслінам не хапае калію: падкарміце іх настоем драўніннага попелу (шклянка попелу на вядро вады, расходаваць па паўлітра на адну расліну).

● Пад корань кожнай расліны вельмі карысна ў ліпені падсыпаць перагной або кампосную зямлю. Гэта дасць ім дадатковае харчаванне.

ХМЕЛЬ — ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ ПІВА

Хмель на Русі вырошчвалі ўсюды і шмат. Дадавалі яго ў напоі і ў закваску для хлеба, які здзіўляў іншаземных гасцей тым, што доўга не чарсцвеў. З хмелю пачыналася сямейнае жыццё — старадаўні вясельны звычай асыпаць маладых у дзвярах дома хмелем.

Хмель французы называюць паўночным вінаградам. Славяне «травой Ярылы» ў гонар славянскага бога ўрадлівасці. Расце хмель як на дражджах: у гарачую пагоду прыбаўляе па 30 см за дзень, дасягаючы да восені, у залежнасці ад гатунку, 4—10 м.

Хмель звычайны — гэта шматгадовая ліяна. Цвіце ў ліпені-жніўні. На адным месцы можа расці да трыццаці гадоў. Рост ліян у пачатку лета настолькі імклівы, што яны аднымі з першых аплятаюць апоры, намнога апярэджваючы іншыя дэкаратыўныя ліяны, такія як дзявочы вінаград, лімоннік, фасоля. Праўда, у канцы лета паўстае невялікая праблема. Ніжнія лісты хмелю жаўцеюць і ападаюць. Каб задэкарыраваць голыя сцёблы, перад хмелем высаджваюць астыльбу, папаратнікі і іншыя расліны, у якіх лісце радуе вока на працягу ўсяго лета. Сама ж ліяна, увешаная зеленавата-жоўтымі гронкамі шышак, да восені набывае асаблівую дэкаратыўнасць. Галінкі з зялёнымі кветкамі-шышкамі можна засушыць, яны служаць цудоўным упрыгажэннем зімніх букетаў.

Хмель хутка размнажаецца. Карані даюць шматлікія атожылкі, іх можна адсаджваць хоць вясной, хоць летам, хоць увосень. Дагледаць расліну нескладана: вясной, калі яна дасягне вышыні 50 см, трэба зрабіць апору. Сцёблы лёгка абвіваюць і металічныя трубы, і тонкія капронавыя вяроўкі. У пачатку росту яго неабходна моцна паліваць і падкарміць комплекснымі мінеральнымі ўгнаеннямі. У вертыкальным становішчы хмель хутка ўзбіраецца па апорах, у гарызантальным тэмп росту зніжаецца. Каб атрымаць суцэльную зялёную сцяну, расліны саджаюць праз 1,5—2 м.

Старадаўні рэцэпт «хмелевага» хлеба

Вядома, што звычайныя дрожджы шкодныя для кішэчніка, а хмелевы хлеб не толькі прыемны на смак, але і лекавы.

Шышкі дзікага хмелю сабраць у дні «бабінага лета», да дажджоў. У 0,5-літровы слоік насыпаць хмель, утрамбаваць, заліць халоднай гатаванай вадой, давесці да кіпення на невялікім агні, кіпяціць 10 хвілін. Калі астыне, зліць адвар, замясіць на ім вельмі крутое цеста, раздзяліць на 20 частак, скатаць шарыкі, высушыць іх. Атрымліваюцца хмелевыя дрожджы.

Першы раз расчыніць хлеб з палавіннай ад звычайнай дозы дражджэй і дадаць шарык. У далейшым цеста ставіцца на пакінутай ад першага замесу рошчыне плюс шарык хмелевых дражджэй. Цеста замешваецца крута, пячэцца хлеб у рускай печы.

Смажаныя парасткі хмелю

Прамытыя нарэзаныя кавалачкі (2-3 см) парасткаў хмелю звараць у падсоленай вадзе да гатоўнасці, адкінуць на друшляк, злёгку абсушыць сурвэткай, абсыпаць сухарамі і падсмажыць на алеі. Затым дадаць спасераваную цыбулю і смажыць яшчэ 3—5 хвілін. Перад падачай на стол заправіць смятанай.

Для добрага сну

Шышкі хмелю выкарыстоўваюць для ваннаў, яны таксама ўваходзяць у склад заспакаяльнай гарбаты. Сон будзе глыбокім, калі на ноч выпіць цёплы настой хмелю (2 ч. лыжкі здробненых шышак на 1 шклянку кіпеню). Сухія шышкі здаўна прымянялі як сродак, які паляпшае страваванне, а таксама для ўмацавання сардэчна-сасудзістай сістэмы, таму хмелевы алей уваходзіць у склад валакардына. Змяшчае хмель і цэлы набор біялагічна актыўных рэчываў, якія забіваюць альбо затрымліваюць развіццё многіх хваробатворных арганізмаў.

Нармалізаваць крывяны ціск і папярэдзіць развіццё гіпертаніі дапаможа настойка шышак хмелю: 50 г сыравіны на 1 шклянку 70-працэнтнага спірту, настойваць 7 дзён, працадзіць. Прымаць перад абедам і вячэрай па 1 ч. л., разбавіўшы вадой.

Агароднік, не зявай!

Настала пара, калі на градках буйна растуць агародныя расліны, спее ўраджай. Але радасць можа быць нядоўгай, калі насякомыя, якія лятаюць і поўзаюць, усур'ёз пачнуць замахвацца на плён вашай працы. Вось і прыходзіцца агароднікам весці барацьбу са шкоднікамі.

Капусная муха *(на фота)* пашкоджвае карані раслін. У сухое і гарачае надвор'е насякомае прыносіць найбольшую шкоду, таму што расліны з пашкоджанымі каранямі зведваюць недахоп вільгаці і часта гінуць. У дажджлівае надвор'е альбо пры моцным паліве на капусце ўтвараюцца дадатковыя карані, і ў раслін ёсць магчымасць перамагчы.

Капусная моль пашкоджвае капусту, рэпу, бручку, радыску. Асабліва многа капуснай молі бывае ў ліпені. Матылькі лятаюць у перадвячэрні час і адкладваюць па 3-4 яйкі на ніжні бок лістоў. Праз некалькі дзён ужо вусені выгрызаюць у лістах аконцы, пакрытыя тонкай скуркай, якая потым засыхае. Часта вусені капуснай молі забіраюцца ў асяродак расліны, дзе выядаюць згорнутыя ў качан лісты і верхавінкавую пупышку. У выніку чаго расліна або не завязвае качаноў, або яны атрымліваюцца няякасныя і дробныя.

Капусная соўка вельмі распаўсюджаны шкоднік. Акрамя капусты пашкоджвае розныя агародныя расліны, напрыклад, буракі, цыбулю рэпчатую і іншыя. У сярэдзіне ліпеня, калі качаны пачынаюць завівацца, пачынаецца і масавае адкладванне яек, якое працягваецца да жніўня. Вусені адраджаюцца з інтэрвалам 10—15 дзён, угрызаюцца ў качаны капусты, робячы хады. У лістах іншых агародных культур вусені выядаюць вялікія прадаўгаватыя дзіркі. Колькасць капуснай соўкі ў многім залежыць ад вільготнасці паветра і глебы: калі яна невысокая, вусені загінуць.

Калі **белакрылка** пасялілася ў цяпліцы — чакай бяды, а не ўраджаю. Меры барацьбы: устанавіць шчыты з пластыка, пафарбаваць іх у жоўты колер і нанесці энтамалагічны клей. Сейце ў цяпліцы настурцыю, пах якой белакрылка не выносіць. Самы эфектыўны спосаб барацьбы — у час лёту матылькоў накрываць пасадкі нятканым матэрыялам. Калі ж вусені атакавалі вашу градку, прыйдзецца паднімать лісты, збіраць і знішчаць шкоднікаў уручную. Пры высокай колькасці капуснай мухі, капуснай молі, капуснай бялянкі, капуснай соўкі ў перыяд вегетацыі раслін неабходна апырскваць дэцісам (2 г на 10 л вады). Сістэматычна рыхліце паміж радкамі, знішчаючы пустазелле.

Летам, напрыклад, на капусту нападае **тля**, і калі гэтага шкодніка многа, расліна можа загінуць. Вялікага эфекту можна дабіцца, калі пачаць барацьбу ў момант з'яўлення тлі. Для гэтага старанна апыляйце капусныя лісты попелам (асабліва ніжні бок ліста). Праз 20 хвілін пасля апылення прарыхліце глебу вакол раслін. Для таго, каб у агарод прыляталі драпежныя насякомыя, якія будуць знішчаць разнастайных шкоднікаў, у прыватнасці, тлю, побач з пасевамі сталовых буракоў, якія асабліва пакутуюць ад гэтага шкодніка, пасейце кроп.

Мучністая раса. Асабліва вялікая верагоднасць з'яўлення цвілі ў дажджлівае, сырое надвор'е. Схавайце капусту «дахам», нацягнуўшы на дугі плёнку, але не да самай зямлі. Павінна быць абавязковае праветрыванне. Лісты, пашкоджаныя цвіллю, бязлітасна абрывайце.

Кіла крыжакветных. Гэта самае сур'ёзнае захворванне. Першая прыкмета — расліны засыхаюць пры цёплым надвор'і. Пашкоджаныя расліны марнеюць, а калі іх выкапаць, вы ўбачыце, што карані дэфармаваныя.

Каб весці барацьбу з гэтым захворваннем раслін, трэба:

● праводзіць вапнаванне глебы раз у 3-4 гады павышанымі дозамі: гашанай вапнай — увосень, даламітавай мукой — вясной;

● знішчаць хворыя расліны (спальваннем), мяняць глебу;

● не садзіць капусту на месцы градаў радыскі, рэдзькі, пекінскай капусты на працягу 3-4 гадоў;

● правяраць расаду пры куплі, каб на карэньчыках не было ўздуццяў.

Суніцы садовыя адпладаносілі

Пасля збору ўраджаю правядзіце глыбокую апрацоўку глебы каля кустоў, унясіце фосфарна-калійныя ўгнаенні (10—12 г на 1 кв. м), абрэжце вусы і акучце расліны. Пры моцным паражэнні хваробамі, але не больш як два разы за час існавання плантацыі можна скасіць наземную частку суніц садовых, пакінуўшы верхавінкавыя пупышкі. Гэтае мерапрыемства садзейнічае аздараўленню градкі ад шэрай гнілі, белай і бурай плямістасцяў, сунічнага клешча, а таксама гэта амалоджвае расліны. У сухое надвор'е пасля скошвання трэба паліць градку, расходуючы на куст ад 0,5 да 1 л вады на кусцік. Паліваць расліны трэба цёплай вадой, не ніжэй за 15 градусаў. Для лепшага абнаўлення лістоў і закладкі кветкавых пупышак пасля плоданашэння мэтазгодна апрацаваць расліны 0,3-працэнтным растворам мачавіны (30 г на 10 л вады). Пры слабым развіцці суніц садовых для падкормкі можна выкарыстаць растворы каравяку і птушынага памёту (1:10).

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 3285. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12